Рэспубліканскае праваабарончае грамадскае аб’яднанне
«Беларускі Хельсінкскі камітэт»

# ВЫБАРЫ

## дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання (28 верасня 2008 года)

ВЫНІКІ МАНІТОРЫНГУ

**Масква**
**2009**

**Выбары** дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 4-га склікання (28 верасня 2008 года): вынікі маніторынгу / РПГА «Беларускі Хельсінкскі камітэт»; пад аг. рэд. А. Гулака. – М., 2009. – 80 с.

Выдадзена Маскоўскай Хельсінкскай групай,
107045, Расія, г. Масква, Вялікі Галавін зав., д. 22. буд. 1.

Надрукавана ў тыпаграфіі «Мікрапрынт»,
117036, Расія, г. Масква, вул. Кедрава, д. 15, оф. 10.
Наклад 1500 асобнікаў. Распаўсюджваецца бясплатна.

© РПГА «Беларускі Хельсінкскі камітэт», 2009
© Маскоўская Хельсінкская група, 2009

# ЗМЕСТ


УВОДЗІНЫ ........ 5

I. ФАРМІРАВАННЕ АКРУГОВЫХ ВЫБАРЧЫХ КАМІСІЙ (АВК) ........ 8
Вылучэнне ў склад выбарчых камісій прэтэндэнтаў ад палітычных партый і грамадскіх аб’яднанняў ........ 9
Зацвярджэнне камісій ........ 10
Вылучэнне прэтэндэнтаў ад працоўных калектываў ........ 13
Вылучэнне прэтэндэнтаў ад грамадзян шляхам збору подпісаў ........ 14

II. ВЫЛУЧЭННЕ І РЭГІСТРАЦЫЯ КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ ........ 19
Вылучэнне шляхам збору подпісаў выбаршчыкаў ........ 20
Выкарыстанне адміністрацыйнага рэсурсу пры зборы подпісаў ........ 22
Ціск на членаў ініцыятыўных груп і падпісантаў ........ 23
Вылучэнне ад працоўных калектываў ........ 25
Рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты і абскарджанне адмовы ў рэгістрацыі ........ 25
Датэрміновая агітацыя ........ 28

III. ФАРМІРАВАННЕ ЎЧАСТКОВЫХ ВЫБАРЧЫХ КАМІСІЙ (УВК) ........ 30
Вылучэнне ў склад УВК ........ 31
Вынікі фарміравання УВК ........ 32

IV. АГІТАЦЫЯ ........ 38
Вызначэнне памяшканняў для сустрэч кандыдатаў з выбаршчыкамі ........ 39
Схаваная агітацыя праз дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі ........ 40
Агітацыя праз дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі ........ 43
Перашкоды пры вырабе агітацыйнай прадукцыі ........ 46
Ціск на кандыдатаў і іх каманды ........ 47
Агітацыя шляхам правядзення сустрэч з выбаршчыкамі ........ 51
Выкарыстанне адміністрацыйнага рэсурсу ........ 54
Абскарджанне ........ 56

V. ГАЛАСАВАННЕ ........ 57
Датэрміновае галасаванне ........ 57
Галасаванне і падлік ........ 62

ВЫСНОВЫ ........ 65

РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА ДЭМАКРАТЫЗАЦЫІ ВЫБАРЧАГА ПРАЦЭСУ Ў БЕЛАРУСІ ........ 69

# СПІС СКАРАЧЭННЯЎ

| | |
|---|---|
| ААТ | адкрытае акцыянернае таварыства |
| АБСЕ | Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе |
| АВК | акружныя выбарчыя камісіі |
| АГП | Аб'яднаная грамадзянская партыя |
| АДС | Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы |
| АПК | аграпрамысловы комплекс |
| БелТА | Беларускае тэлеграфнае агенцтва |
| БелТІЗ | Беларускае таварыства інвалідаў па зроку |
| БДІПЧ | Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека |
| БРСМ | Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі |
| БСДП (Г) | Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада) |
| БСДП (НГ) | Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Народная Грамада) |
| БХК | Рэспубліканскае праваабарончае грамадскае аб'яднанне «Беларускі Хельсінкскі Камітэт» |
| ВА «БелАЗ» | Вытворчае аб'яднанне «Беларускі аўтамабільны завод» |
| ВК | Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь |
| ВК | выбарчыя камісіі |
| ВНУ | вышэйшая навучальная ўстанова |
| ГА | грамадскае аб'яднанне |
| ГАУС | гарадскі аддзел унутраных спраў |
| ГДК | Гарадскі дом культуры |
| ДА | дзяржаўнае аб'яднанне |
| ДАІ | Дзяржаўная аўтаінспекцыя |
| ДВУП | дзяржаўнае вытворчае ўнітарнае прадпрыемства |
| ДК | Дом культуры |
| ДРБУ | дарожна-рамонтнае будаўнічае ўпраўленне |
| ДТСААФ | Добраахвотнае таварыства садзейнічання арміі, авіяцыі і флоту |
| ДУВП | дзяржаўнае ўнітарнае вытворчае прадпрыемства |
| ЖКГ | жыллёва-камунальная гаспадарка |
| ЖЭС | жыллёва-эксплуатацыйная служба |
| ЖЭУ | жыллёва-эксплуатацыйнае ўпраўленне |
| ІП | індывідуальны прадпрымальнік |
| КУШВП | камунальнае ўнітарнае шматгаліновае вытворчае прадпрыемства |
| КДБ | Камітэт дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь |
| КПБ | Камуністычная партыя Беларусі |
| ЛДПБ | Ліберальна-дэмакратычная партыя Беларусі |
| МНС | Міністэрства надзвычайных сітуацый |
| МУС | Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь |
| НІСЭПД | Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў |
| ПУП | прыватнае ўнітарнае прадпрыемства |
| РАУС | раённае аддзяленне ўнутраных спраў |
| РБ | Рэспубліка Беларусь |
| РГА «Белая Русь» | Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Белая Русь» |
| РПГА | рэспубліканскае праваабарончае грамадскае аб'яднанне |
| РППС | Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці |
| РСУП | рэспубліканскае сельскагаспадарчае ўнітарнае прадпрыемства |
| РУП | рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства |
| САШ | сярэдняя агульнаадукацыйная школа |
| «СБ» | «Советская Белоруссия» |
| СМІ | сродкі масавай інфармацыі |
| СНД | Садружнасць Незалежных Дзяржаў |
| СШ | сярэдняя школа |
| ТАА | таварыства з абмежаванай адказнасцю |
| УА | установа адукацыі |
| УАЗ | установа аховы здароўя |
| УВК | участковыя выбарчыя камісіі |
| УУС | упраўленне ўнутраных спраў |
| ЦК | Цэнтральная камісія Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў |
| ЦК БРСМ | Цэнтральны камітэт Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі |
| ЦЭЦ | цеплаэлектрацэнтраль |
| ЮНЭСКА | Арганізацыя Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры |

# УВОДЗІНЫ

Рэспубліканскае праваабарончае грамадскае аб'яднанне «Беларускі Хельсінкскі Камітэт» (БХК) у адпаведнасці са Статутам і на падставе дзеючага заканадаўства правеў маніторынг кампаніі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 4-га склікання, якія адбыліся 28 верасня 2008 года. Маніторынг праводзіўся ў супрацоўніцтве з іншымі праваабаронцамі, якія далучыліся да гэтай працы. Перш за ўсе, гэта былыя сябры ліквідаванага ўладамі ў 2003 годзе праваабарончага цэнтра «Вясна». Таму назіранне праводзілася пад эгідай кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары».

У назіранні ўдзельнічалі 287 доўгатэрміновых назіральнікаў, якія адсочвалі правядзенне ўсіх выбарчых працэдур з моманту абвяшчэння выбараў, і таксама больш двухсот кароткатэрміновых назіральнікаў, якія маніторылі працэдуры галасавання і падліку галасоў. Вылучэнне назіральнікаў адбывалася ў розных формах, прадугледжаных заканадаўствам.

Маніторынг вёўся ва ўсіх буйнейшых гарадах Беларусі: Мінску, Брэсце, Гродна, Віцебску, Магілёве, Гомелі, Баранавічах, Маладзечне, Глыбокам, Полацку, Наваполацку, Оршы, Барысаве, Жодзіна, Бабруйску, Мазыры, Светлагорску, Пінску і прылеглых да іх тэрыторыях. Доўгатэрміновае назіранне ахапіла 86 выбарчых акруг са 110.

У параўнанні з мінулымі выбарчымі кампаніямі некалькі палепшыліся магчымасці для вылучэння нацыянальных назіральнікаў, паколькі цэнтральныя кіруючыя органы палітычных партый і рэспубліканскіх грамадскіх аб'яднанняў адпаведна з пастановай Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў (ЦК) атрымалі права накіроўваць назіральнікаў на пасяджэнні любых выбарчых камісій. Аднак магчымасці назірання, як і раней, былі вельмі абмежаваныя непразрыстасцю ўсіх выбарчых працэдур, і асабліва працэдуры падліку галасоў. ЦК, вышэйшыя дзяржаўныя асобы на працягу выбарчай кампаніі рабілі публічныя заявы аб тым, што выбары будуць максімальна празрыстыя, аднак на практыцы заўважных змен не адбылося.

На пачатку чэрвеня 2008 года назіральнікі сутыкнуліся са шматлікімі перашкодамі ў іх дзейнасці, а тасама акцыямі пераследу і запалохвання. Узмацніўся кантроль пры перасячэнні дзяржаўнай мяжы, пачаліся падатковыя праверкі назіральнікаў і іх сем'яў. Падатковая інспекцыя Маскоўскага раёна г. Мінска пачала пазапланавую

комплексную праверку БХК. Аднак пасля публічных заяў аб перашкодах у правядзенні назірання за выбарамі ціск быў спынены і далейшая праца праводзілася без відавочных перашкод.

Назіранне грунтавалася на методыках, распрацаваных БДІПЧ/АБСЕ, галоўная ўвага надавалася выкананню беларускага заканадаўства і базавых прынцыпаў свбодных і справядлівых выбараў, зафіксаваных Капенгагенскім дакументам АБСЕ.

Палітычныя партыі падчас выбараў не арганізавалі шырокай кампаніі па назіранні, інфармацыя ініцыятывы «Праваабаронцы за свабодныя выбары» была важнай крыніцай для недзяржаўных СМІ, якія асвятлялі ход выбараў. У выніку амаль 13 % беларусаў, паводле НІСЭПД, ведалі аб назіранні, арганізаваным праваабаронцамі, што ва ўмовах закрытай інфармацыйнай прасторы можна лічыць даволі высокім паказчыкам.

Неабходна адзначыць, што, паводле НІСЭПД, незалежнае нацыянальнае назіранне, нават у параўнанні з назіраннем АБСЕ і СНД, у жыхароў Беларусі карыстаецца найбольшым даверам.

Выбары праводзіліся на падставе Выбарчага кодэксу, які шмат разоў крытыкаваўся нацыянальнымі і міжнароднымі назіральнікамі, а таксама атрымаў адмоўныя ацэнкі ў юрыдычных заключэннях БДІПЧ/АБСЕ і Венецыянскай камісіі Савета Еўропы.

Грамадска-палітычная атмасфера, на фоне якой пачалася выбарчая кампанія, таксама не стварала неабходных умоў для правядзення сапраўды свабодных і справядлівых выбараў.

Асаблівасцю гэтых выбараў стала тое, што яны праходзілі на фоне падзей, звязаных з выбухам у Мінску 3 ліпеня 2008 г. падчас афіцыйнага святкавання Дня незалежнасці. Нястрыманая пазіцыя шэрагу дзяржаўных друкаваных і электронных СМІ, якія фактычна абвінавацілі апазіцыю ў падрыхтоўцы і здзяйсненні тэрарыстычнага акту, не спрыяла правядзенню выбарчай кампаніі ў спакойнай атмасферы. У сувязі з правядзеннем следчых мерапрыемстваў па дадзеным факце мелі месца шматлікія выклікі ў МУС і КДБ удзельнікаў выбарчага працэсу, іх допыты, зняцце адбіткаў пальцаў і г. д. Трэба сказаць, што вельмі часта гэтыя факты ўспрымаліся ўдзельнікамі выбарчага працэсу як палітычна матываваны ціск. Наяўнасць у краіне палітзняволеных, пераслед палітычных і грамадскіх актывістаў, запалохванне з боку КДБ, выцясненне палітычных і грамадскіх структур дэмакратычнага кшталту з прававога поля адмоўна адбівалася на магчымасцях правядзення рэальнага палітычнага спаборніцтва.

Дзяржаўныя СМІ не давалі поўнай і даст207ернай інфармацыі, неабходнай для фарміравання ў выбаршчыкаў асэнсаванага выбару, друкаванне і распаўсюджванне недзяржаўных СМІ практычна блакіраваліся дзяржаўнымі манаполіямі.

Сістэмныя парушэнні грамадзянскіх і палітычных правоў, празмерны кантроль дзяржавы над грамадствам, у тым ліку праз выкарыстанне кантрактнай сістэмы найму на працу, не дазвалялі грамадству адчуць нават мінімальна неабходны ўзровень свабоды.

Істотным адрозненнем гэтай палітычнай кампаніі ад мінулых стала тое, што ўжо ў яе пачатку вышэйшыя службовыя асобы, у тым ліку Прэзідэнт краіны і старшыня ЦК, пачалі публічна заяўляць аб намеры правесці насамрэч свабодныя і справядлівыя выбары, дзяржаўная прапаганда адмовілася ад антыеўрапейскай рыторыкі і агучыла курс на збліжэнне з еўрапейскімі краінамі.

Важным крокам беларускіх улад для змякчэння атмасферы страху ў краіне стала датэрміновае вызваленне 16.08.2008 апошняга палітзняволеннага, экс-кандыдата ў Прэзідэнты Аляксандря Казуліна, зробленае пад націскам міжнароднай супольнасці.

На жаль, гэтыя змены насілі толькі касметычны характар і не прывялі да рэальнага паляпшэння выбарчых працэдур, што магло б павысіць давер да вынікаў выбараў. Тым не менш варта адзначыць, што адбылося пэўнае змякчэнне ў адносінах да правядзення палітычнай кампаніі. Гэта праявілася ў некаторым памяншэнні перашкод, якія ўлады стваралі пры правядзенні агітацыіі палітычнымі партыямі і незалежнымі кандыдатамі.

# I. ФАРМІРАВАННЕ АКРУГОВЫХ ВЫБАРЧЫХ КАМІСІЙ (АВК)

Арганізацыйныя мерапрыемствы па забеспячэнні перамогі на выбарах кандыдатаў ад улады распачаліся практычна на этапе стварэння выбарчых акруг.

На этапе фарміравання акруговых выбарчых камісій у адпаведнасці з заканадаўствам палітычныя партыі, грамадскія аб'яднанні, штабы мяркуемых кандыдатаў у дэпутаты праводзілі мерапрыемствы па вылучэнні сваіх членаў у склад АВК. Значная актыўнасць назіралася ў г. Брэсце, дзе абласныя структуры апазіцыйных партый БСДП(Г), АГП, ПКБ і ПБНФ з сакавіка 2008 г. заключылі кааліцыйнае пагадненне на перыяд падрыхтоўкі і правядзення парламенцкіх выбараў. У г. Брэсце 5 чэрвеня адбылася нарада Савета прадпрымальнікаў, на якой абмяркоўваліся праграмныя дакументы для ўручэння кандыдатам у дэпутаты ПП НС; 4–6 чэрвеня прадпрымальнікі распаўсюдзілі больш за 1000 інфармацыйных лістоў на рынках горада.

Рэгіянальная дзяржаўная прэса ў час выбарчай кампаніі прыкметна павысіла актыўнасць, на яе старонках пачалі рэгулярна змяшчацца выразна прапагандысцкія артыкулы, скіраваныя на падтрыманне ў грамадскай свядомасці ўпэўненасці ў стабільнасці і сацыяльнай справядлівасці дзяржавы і перавагах курсу ўлады. «Студэнцкія стыпендыі «пацяжэлі» («Сельская праўда» (г. Жабінка), № 51 ад 02.07.2008); «Не сілай б'е кропля, а частатой падзення» («Народная трыбуна» (г. Брэст), ад 05.07.2008); «З 1 ліпеня павялічыліся памеры сацыяльных пенсій» («Брестская газета», № 27 ад 04.07.2008).

Выяўлены факты публікацыі ў рэгіянальных афіцыйных СМІ матэрыялаў, якія маюць характар дачаснай агітацыі за дзейсных дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў III склікання, якія мелі намер стаць дэпутатамі ПП НС IV склікання. Артыкул «Аптэка, якую чакалі» («Брестский вестник», № 27 ад 02.07.2008) паведамляе пра адкрыццё ў г. Брэсце аптэкі. На здымку – дэпутат ПП НС па Брэсцкай-Заходняй акрузе Алег Вялічка і кіраўнік адміністрацыі Ленінскага раёна г. Брэста Міхаіл Яўтух. Дэпутат Яўген Казімірчык па Бярозаўскай акрузе праз газету «Маяк» віншуе з Днём незалежнасці сваіх выбаршчыкаў («Маяк», № 52 ад 02.07.2008); артыкул «Наваселле аптэкі» («Маяк», № 53 ад 05.07.2008) распавядае аб працы дэпутата «над удасканаленнем заканадаўчай базы, у тым ліку над Законам «Аб ахове здароўя». Дэпутат па Мухавецкай выбарчай акрузе Ніна Федарук праз газеты «Голас Часу» (г. Маларыта,02.07.2008), «Заря над Бугом» (г. Брэст, № 51–52

ад 04.07.2008) віншуе жыхароў Маларыччыны з дзяржаўным святам, газета «Сельская праўда» (г. Жабінка,05.07.2008) распавядае пра яе ўдзел ва ўрачыстым мітынгу і друкуе віншаванні.

Афіцыйныя рэгіянальныя СМІ практычна не друкавалі матэрыялаў аб распачатай у краіне кампаніі, за выключэннем публікацыі нарматыўна-прававых актаў аб выбарах. Журналісты друкаванага органа Брэсцкага гарвыканкама газеты «Брестский вестник» 10 ліпеня паведамілі назіральнікам аб тым, што ніхто з карэспандэнтаў не атрымліваў рэдакцыйных заданняў на падрыхтоўку спецыяльных матэрыялаў аб выбарчай кампаніі. Афіцыйная інфармацыя па арганізацыі выбарчага працэсу ў рэдакцыю не накіроўвалася.

Рэгіянальныя афіцыйныя СМІ змяшчалі інфармацыю БелТА і перадрукоўвалі матэрыялы цэнтральных газет, накіраваныя на дыскрэдытацыю будучых дэмакратычных кандыдатаў і прадстаўнікоў апазіцыі наогул. Рэпартаж з нарады ў Прэзідэнта па пытаннях арганізацыі і правядзення выбараў («Заря» (абласная газета Брэсцкай вобласці), № 76 ад 12.07.2008): «Наши «свядомыя» т. н. оппозиционеры, которые рвутся во власть, нигде не работают, а живут лучше всех в республике». Перадрукаваны з «СБ» артыкул «Хто хацеў узарваць свята?» («Заря»,08.07.2008; «Ляхавіцкі веснік» № 52 ад 09.07.2008) даводзіць чытачу, што ў выбуху ў беларускайскай сталіцы вінаватыя «оголтелые политики».

Незалежная рэгіянальная прэса неактыўна асвятляла пачатак выбарчай кампаніі. Артыкул «Працэс пайшоў, ці Старт выбарчага працэсу» («Брестский курьер», № 27 ад 03.07.2008) прысвечаны аналізу падрыхтоўкі да выбараў праўладных грамадскіх аб'яднанняў. У прыватнасці, у ім паведамлялася пра пашыранае пасяджэнне Рэспубліканскага савета РГА «Белая Русь», якое адбылося 25 чэрвеня і на якім лідэр арганізацыі Аляксандр Радзькоў паабяцаў аказаць актыўную падтрымку тым членам, якія планавалі балатавацца ў парламент. Прыводзіліся дадзеныя падрыхоўкі да выбараў ГА «БРСМ», цытаваліся выказванні старшыні ЦК БРСМ, члена Савета Рэспублікі Аляксандра Далжэўскага.

## Вылучэнне ў склад выбарчых камісій прэтэндэнтаў ад палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў

Палітычныя партыі, якія ўваходзяць у кааліцыю Аб'яднаных дэмакратычных сіл (АДС), склалі адзіны спіс кандыдатаў на вылучэнне ў склад АВК, які быў зацверджаны Палітрадай АДС 8 чэрвеня 2008 г. Спіс

фарміраваўся па наступных крытэрыях: наяўнасць досведу працы ў дзяржаўных структурах, грамадска-палітычны статус, месца працы, адукацыя. У спіс АДС увайшлі 110 чалавек (па колькасці выбарчых акруг), сярод якіх такія грамадска-палітычныя дзеячы, як Станіслаў Шушкевіч, Мечыслаў Грыб, Аляксандр Сасноў, Павел Казлоўскі, Леў Марголін і інш.

Пры гэтым Палітрада АДС заявіла, што пытанне ўключэння ці неўключэння кандыдатур са спіса АДС стане адной з умоў прызнання ці непрызнання парламенцкіх выбараў міжнароднай супольнасцю. Лідэр Аб'яднанай Грамадзянскай партыі (АГП) Анатоль Лябедзька выказаў меркаванне аб тым, што ў выпадку неўключэння ў склад АВК членаў партый, якія ўваходзяць у АДС, будзе разгледжаны варыянт зняцця кандыдатаў і правядзення кампаніі байкоту выбараў.

У сваю чаргу, старшыня Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія Ярмошына заявіла, што пажаданні АДС аб уключэнні іх прадстаўнікоў у склад акруговых выбарчых камісій, магчыма, будуць улічвацца. Па яе словах, Прэзідэнт Лукашэнка станоўча выказаўся адносна ўключэння членаў палітычных партый у склад АВК, але з улікам досведу працы і «іншых пераваг», у тым ліку «палітычнай спеласці».

Аб вылучэнні сваіх прадстаўнікоў у склад акруговых выбарчых камісій афіцыйна заявіла і кіраўніцтва зарэгістраванага ў снежні 2007 г. РГА «Белая Русь». Паводле інфармацыі намесніка старшыні РГА «Белая Русь» Аляксандра Шадзько, у акруговыя камісіі ад РГА «Белая Русь» былі вылучаны 110 чалавек (г. зн. у кожную АВК).

## Зацвярджэнне камісій

Сумесныя пасяджэнні Прэзідыумаў абласных Саветаў дэпутатаў і абласных выканаўчых камітэтаў, Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта і Мінскага Савета дэпутатаў адбыліся 14 ліпеня 2008 г. На пасяджэннях разглядаліся пытанні аб фарміраванні АВК. Рашэннямі органаў мясцовага кіравання былі створаны 110 акруговых выбарчых камісій. Усяго суб'ектамі, якія валодаюць правам вылучаць прадстаўнікоў у АВК (грамадзянамі, працоўнымі калектывамі, грамадскімі аб'яднаннямі і палітычнымі партыямі), былі вылучаны 1853 прэтэндэнты, пры максімальнай колькасці членаў акруговых камісій 1430 чалавек. Па словах сакратара ЦК Мікалая Лазавіка, з 1853 прэтэндэнтаў найбольш прадстаўнікоў грамадзян – 39,8 %, на другім месцы – прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў (25,5 %), на трэцім месцы – палітычных

партый (20 %) і працоўных калектываў (14,7 %). М. Лазавік адзначыў, што палітычныя партыі, якія «пазіцыянуюцца як апазіцыйныя», вылучылі ў склад АВК 118 чалавек (31,9 % ад усіх прадстаўнікоў, вылучаных палітычнымі партыямі); 18 чалавек вылучана ад ГА БНФ «Адраджэньне», што складае 3,8 % прадстаўнікоў, вылучаных грамадскімі аб'яднаннямі. Такім чынам, разам АДС вылучылі 136 чалавек.

Сярод палітычных партый, якія вылучылі сваіх прадстаўнікоў у АВК, найбольшую актыўнасць праявілі Партыя камуністаў Беларуская (ПКБ) – 91 чалавек (24,5 % ад усіх партыйных вылучэнцаў), Беларуская аграрная партыя – 62 (16,7 %), АГП – 50 (13,5 %), Партыя БНФ – 34 (9,2 %).

Грамадскія аб'яднанні: ГА «БРСМ» – 109 чалавек (23,2 % вылучэнцаў ад грамадскіх аб'яднанняў), РГА «Белая Русь» – 94 чалавекі (19,4 %), Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў – 71 чалавек (15,2 %).

ЦК сцвярджала, што выбарчыя камісіі будуць сфарміраваныя на аснове конкурсу, спаборніцтва. Неабходна адзначыць, што і ў час папярэдніх выбарчых кампаній, і ў кампаніі 2008 г. на сумесныя пасяджэнні прэзідыўмаў абласных Саветаў дэпутатаў і абласных выканаўчых камітэтаў не запрашаліся прэтэндэнты, вылучаныя ў склад камісій, ім не паведамлялася аб выніках разгляду іх заяў аб вылучэнні. На пасяджэннях адбывалася толькі фармальнае зацвярджэнне складаў АВК, без абмеркавання кандыдатур. На думку назіральнікаў, гэта сведчыць аб тым, што спісы акруговых камісій былі сфарміраваныя загадзя. Ніякага «конкурсу», альбо «спаборніцтва» паміж вылучанымі прэтэндэнтамі ў склад камісій, пра якія заяўляў сакратар ЦК, не назіралася. Як і падчас папярэдніх выбарчых кампаній, незразумелымі засталіся крытэрыі, якімі кіраваліся аблвыканкамы і аблсаветы пры фарміраванні АВК.

Як правіла, прадстаўнікам грамадскасці і СМІ адмаўлялася ў прысутнасці на пасяджэннях абласных выканкамаў і абласных Саветаў. Напрыклад, было адмоўлена ў прысутнасці на сумесным пасяджэнні Мінскага аблвыканкама і абласнога Савета прадстаўніку РПГА «Беларускі Хельсінкскі камітэт» Леаніду Мархотку. Таксама не быў дапушчаны на пасяджэнне Мінгарвыканкама і Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў прадстаўнік БХК Уладзімір Осіпчык. Аналагічная сітуацыя склалася і ў Віцебскай вобласці, дзе прадстаўнікоў БХК Васіля Бераснева і Вадзіма Баршчэўскага не дапусцілі на сумеснае пасяджэнне абласнога і выканаўчага камітэта Віцебскай вобласці, права прысутнічаць на гэтым пасяджэнні былі пазбаўлены і прадстаўнікі незалежных СМІ.

Было адмоўлена ў прадстаўленні інфармацыі аб фарміраванні акруговых камісій членам палітычных партый – АГП, БНФ, ПКБ, – якія

вылучалі сваіх прадстаўнікоў у склад АВК г. Мінска і Мінскай вобласці. Было адмоўлена ў прадастаўленні інфармацыі аб выніках фарміравання акруговых камісій прадстаўнікам БХК і іншым суб'ектам у Гродзенскай вобласці.

Аднак у асобных рэгіёнах прадстаўнікі грамадскасці і СМІ на пасяджэнні дапускаліся. Назіральнікі і журналісты прысутнічалі на пасяджэнні Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў і абласнога выканаўчага камітэта. Яны выказалі меркаванне, што рашэнні аб складзе камісій былі прынятыя яшчэ да пасяджэння, якое такім чынам атрымала фармальны характар і доўжылася не болей за 25 хвілін. На пасяджэнні была паведамлена агульная інфармацыя, у тым ліку, што «конкурс» у камісію Брэсцкай-Цэнтральнай акругі № 2 складаў 1,7 чалавека, у камісію Мухавецкай акругі № 4 – 1,5. Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін Сумар адзначыў, што кожная камісія складалася ў максімальнай колькасці членаў – 13 чалавек. «Намі прынята рашэнне вылучыць у склад камісій прадстаўнікоў ад усіх без выключэння грамадскіх арганізацый і палітычных партый» – сказаў К. Сумар. Галасаванне было адзінагалоснае. На пытанне аб крытэрыях адбору прадстаўнікоў у склад камісій, якое прагучала ад С. Вакуленкі, які вылучаўся шляхам збору подпісаў грамадзян, прагучаў адказ, што гэта «крытэрыі найбольшай адпаведнасці». Пры гэтым падкрэслівалася абмежаванасць колькасці месц у камісіях. Якім чынам ішло абмеркаванне кадыдатур і складанне канчатковых спісаў, ніхто з запрошаных на пасяджэнне не мог даведацца: на ўсе пытанні гучалі адказы: «не хапіла месца», «гэты першы падаў», «гэтыя больш дасвечаныя» ці «каб камісія магла працаваць». Інфармацыя давалася ў вельмі хуткім тэмпе. На просьбы ўдакладніць звесткі аб зацверджаных членах камісій, адказвалі – «прачытаеце ў газетах». Між тым, стала вядома, што, напрыклад, у акруговай камісіі Брэсцкай-Усходняй выбарчай акругі № 3 пяць членаў працуюць нязменна з 2004 г.: Іна Акімава (галоўны спецыяліст аддзела адукацыі адміністрацыі Маскоўскага раёна г. Брэста); Валянціна Бабічава (дырэктар пачатковай школы № 36 г. Брэста); Надзея Зайцава (кіраўнік справамі Адміністрацыі Маскоўскага раёна г. Брэста); Зінаіда Медзічэнка (пенсіянерка, член КПБ); Галіна Янголенка (загадчык ясляў-сада № 69 г. Брэста).

У Гродзенскай вобласці пры прыняцці дакументаў органамі, якія ўтвараюць камісіі, ад прэтэндантаў, вылучаных АДС, незалежна ад дня падачы дакументаў, практычна ўсім прэтэндэнтам прысвойваўся адзін і той жа рэгістрацыйны нумар – 17. Гэты факт сведчыць аб тэндэнцыйным падыходзе ўладных структур да прадстаўнікоў АДС.

Асобы, адказныя за фарміраванне акруговых камісій, у прыватнасці, Леанід Ермантовіч, начальнік Упраўлення арганізацыйна-кадравай работы Гродзенскага аблвыканкама, адмаўляліся прадастаўляць любую інфармацыю аб фарміраванні камісій лідэрам палітычных партый, праваабаронцам і журналістам. Чыноўнікі раілі «чытаць мясцовую прэсу». Неабходна адзначыць, што пасяджэнне адбывалася 14 ліпеня, а чарговы нумар «Гродзенскай праўды» выйшаў толькі 16 ліпеня 2008 г.

## Вылучэнне прэтэндэнтаў ад працоўных калектываў

Вылучэнне прэтэндэнтаў ад працоўных калектываў у склад акруговых выбарчых камісій праводзілася непразрыста, пра яго характар можна меркаваць толькі па асобных звестках, атрыманых назіральнікамі ўскосна, а не непасрэдна. У Магілёўскай вобласці ніводнаму з удзельнікаў маніторынга не ўдалося патрапіць на пасяджэнні працоўных калектываў па вылучэнні прэтэндэнтаў у склад АВК. Атрымаць інфармацыю па гэтым пытанні ад службовых асоб аблвыканкама было немагчыма.

Назіральнікі БХК паставілі пад сумнеў законнасць вылучэння ад працоўнага калектыву ААТ «Беларускабель» (г. Мазыр) і зацвярджэнне ў складзе камісіі Мазырскай выбарчай акругі № 42 Івана Навіцкага, намесніка дырэктара прадпрыемства па ідэалагічнай рабоце. Ніхто з апытаных супрацоўнікаў гэтага прадпрыемства не здолеў прыгадаць, каб адбываўся сход па яго вылучэнні ў склад камісіі.

У склад АВК ад працоўных калектываў паўсюдна вылучаліся кіраўнікі гэтых калектываў, таму такі спосаб вылучэння можа разглядацца як выкарыстанне адміністрацыйнага рэсурсу. Напрыклад, у Баранавіцкую-Усходнюю акругу № 6 ад працоўнага калектыву Упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Баранавіцкага гарвыканкама была вылучана Таццяна Латышава, якая з’яўляецца кіраўніком гэтага калектыва. Акрамя таго, яна стала і старшынёй камісіі. Старшынёй камісіі Белавежскай выбарчай акругі № 8 стаў Віктар Грыцук, начальнік аддзела адукацыі Камянецкага райвыканкама, вылучаны ад яго ж. Намеснік старшыні названай камісіі Аляксандр Пасевіч – дырэктар філіяла «Пружанскі райпалівазбыт» Брэсцкага абласнога ўнітарнага прадпрыемства «Упраўленне ЖКГ», вылучаны ад працоўнага калектыву філіяла. Ад працоўнага калектыву ТАА «КПВС» у камісію Брэсцкай-Заходняй выбарчай акругі № 1 вылучаны Міхаіл Табалевіч, дырэктар названага прадпрыемства, У камісію Івацэвіцкай

выбарчай акругі № 11 – Леанід Плескацэвіч, дырэктар КУШВП «Прамбудэнерга» г. Івацэвічы, ад працоўнага калектыву гэтага прадпрыемства.

### Вылучэнне прэтэндэнтаў ад грамадзян шляхам збору подпісаў

Значнае прадстаўніцтва членаў, вылучаных шляхам збору подпісаў грамадзян, назіралася ў камісіях сельскіх выбарчых акруг. Пры гэтым пераважалі прадстаўнікі ўладных структур і гаспадарчай наменклатуры. Напрыклад, у камісію Баранавіцкай сельскай акругі № 7 шляхам збору подпісаў гарамадзян патрапілі 7 чалавек (54 % ад усяго складу камісіі). Сярод іх: Алена Кунцэвіч, начальнік арганізацыйна-кадравага аддзела Ляхавіцкага райвыканкама, Леанід Каўбаса, начальнік аддзела ідэалагічнай работы Ляхавіцкага райвыканкама, Мікалай Бурак, начальнік фонда сацыяльнага забеспячэння Ляхавіцкага раёна. У камісію Івацэвіцкай акругі № 11 шляхам збору подпісаў патрапілі 4 чалавекі (31 % ад усяго складу камісіі). Сярод іх: Міхаіл Пішч, начальнік Ганцавіцкага раённага вузла сувязі, кіраўнік раённага РГА «Белая Русь», Аляксей Сызранцаў, начальнік Ганцавіцкай райінспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, кіраўнік ГА «Цытадэль», зарэгістраванага Упраўленнем юстыцыі Брэсцкага аблвыканкама яшчэ перад прэзідэнцкімі выбарамі 2001 г. і абвясціўшага мэтай сваёй дзейнасці падтрымку курса Прэзідэнта, Таіса Куіс (дырэктар нарыхтоўчай канторы).

Удзельнікі маніторынгу звяртаюць увагу на тыя абставіны, што прадстаўнікі праўрадавых структур вылучаліся ў склад камісій, выкарыстоўваючы адначасова розныя шляхі, прадугледжаныя выбарчым заканадаўствам. Напрыклад, Любоў Жыбуль была вылучана ў камісію Стаўбцоўскай выбарчай акругі № 77 ад ГА «БРСМ», РГА «Белая Русь» і ад грамадзян шляхам падачы заявы. Уладзімір Карватка (Пухавіцкая выбарчая акруга № 73) – ад ГА «Беларускі саюз афіцэраў» і Беларускага грамадскага аб’яднання ветэранаў.

Тэндэнцыі і заканамернасці фарміравання АВК можна прасачыць на прыкладзе Брэсцкай вобласці.

На сумесным пасяджэнні Прэзідыўма Брэсцкага аблвыканкама і Савета народных дэпутатаў па стварэнні акруговых выбарчых камісій было абвешчана, што ўсяго па Брэсцкай вобласці ў АВК вылучаны 260 чалавек. З іх ад працоўных калектываў – 54, шляхам збору подпісаў ад грамадзян – 55, ад палітычных партый (8 партый) – 56,

ад ГА (9 аб’яднанняў) – 65 чалавек. Такім чынам, прадстаўнікі палітычных партый і ГА ў сукупнасці склалі 121 чалавек (47 %). З іх колькасці прэтэндэнтаў на месцы ў акруговых камісіях ад апазіцыйных партый і аб’яднанняў – 26 чалавек. Гэта складае роўна 10 % ад агульнай колькасці заяўленых, і 21 % ад грамадскіх і палітычных актывістаў.

| *Назва партыі, грамадскага аб’яднання* | *Вылучана* | *Уключана* |
|---|---|---|
| Беларуская аграрная партыя | 9 | 4 |
| БСДП (Г) | 2 | 1 |
| КПБ | 15 | 9 |
| ЛДПБ | 3 | 1 |
| АГП | 8 | 2 |
| ПБНФ | 9 | 2 |
| ПКБ | 4 | 1 |
| РПТС | 6 | 3 |
| РГА «Белая Русь» | 16 | 9 |
| ГА «БРСМ» | 16 | 13 |
| ГА «Беларускі саюз жанчын» | 2 | 2 |
| Беларускае грамадскае аб’яднанне ветэранаў | 7 | 4 |
| ГА БНФ «Адраджэньне» | 3 | 1 |
| ГА «За Саюз і камуністычную партыю Саюза» | 6 | 1 |
| Беларускі прафсаюз работнікаў АПК | 3 | 3 |
| Беларускі Саюз афіцэраў | 11 | 3 |

Усяго ў АВК Брэсцкай вобласці было ўключана 208 чалавек. З іх прадстаўнікоў палітычных партый і ГА – 59 (28 %). З іх членаў камісій ад апазіцйных партый і ГА – 7 чалавек. Гэта складае 3% ад агульнай колькасці членаў камісій і 12% ад грамадскіх і палітычных актывістаў, якія ўвайшлі ў склад камісій. Такім чынам, пры рэгістрацыі колькасць апазіцыйных прэтэндэнтаў у АВК зменшылася больш чым у 3 разы і амаль у 2 разы скарацілася іх вага сярод прадстаўнікоў партый і ГА.

У акруговую камісію Брэсцкай-Заходняй выбарчай акругі № 1 уключана ўсяго 13 чалавек, з іх кіраўнікоў гарвыканкама, райвыканкамаў, дзяржаўных прадпрыемстваў розных узроўняў – 7 чалавек (54 %); усяго ад палітычных партый і ГА ў акруговай камісіі – 5 чалавек (39 %), якія прадстаўляюць ГА «БРСМ», РГА «Белая Русь», ГА «За Саюз і камуністычную партыю Саюза», КПБ, РППС.

У акруговую камісію Брэсцкай-Усходняй выбарчай акругі № 3 уключана ўсяго 13 чалавек, з іх кіраўнікоў гарвыканкама, райвыканкамаў, дзяржаўных прадпрыемстваў розных узроўняў – 10 чалавек (77 %); усяго ад палітычных партый і ГА ў акруговай камісіі – 4 чалавекі (31 %), якія прадстаўляюць БРСМ, КПБ, РППС, Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў.

У акруговую камісію Белавежскай выбарчай акругі № 8 уключана ўсяго 13 чалавек. У прадастаўленні звестак аб месцы працы членаў камісіі назіральнікам было адмоўлена. Ад палітычных партый і ГА ў акруговай камісіі – 3 чалавекі (23 %), якія прадстаўляюць БРСМ, РГА «Белая Русь», БСДП(Г).

Доўгатэрміновымі назіральнікамі БХК былі зафіксаваны выпадкі стварэння структур па правядзенні выбараў, узнікненне якіх не прадугледжана выбарчым заканадаўствам. Напрыклад, у Жодзінскай выбарчай акрузе № 66 на першым пасяджэнні старшынёй камісіі быў абраны Аляксандр Пугач (старшыня Жодзінскага гарадскога Савета дэпутатаў, вылучаны ад Прэзідыўма Мінскага абласнога Савета дэпутатаў). У сваім выступленні ён адзначыў: «Паралельна стварэнню АВК створаны і гарадскі штаб па правядзенні выбараў, з якім мы будзем працаваць сумесна, каб належна правесці выбары».

На этапе фарміравання АВК назіраліся выпадкі ціску з боку ўлад на незалежных прэтэндэнтаў у кандыдаты ў дэпутаты. На працоўнае месца Мікалая Чарнавуса, індывідуальнага прадпрымальніка з Баранавічаў, які меў намер вылучацца кандыдатам ад АГП, 25 чэрвеня з'явілася няпланавая праверка з вобласці. Звяртае на сябе ўвагу тое, што ў складзе праверкі былі падпалкоўнік Упраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі УУС Брэсцкага аблвыканкама і супрацоўнік падатковай інспекцыі. М. Чарнавус быў аштрафаваны на 175 тысяч рублёў і вымушаны заплаціць штраф у кароткі тэрмін. Пазней прадпрымальніку паведамілі, што яго пазбаўляюць выдзеленага раней зямельнага ўчастка для будаўніцтва кавярні. «Я тры гады розныя паперы збіраў, грошы заплаціў, праектную дакументацыю мне робіць «Белжылпраект», – скардзіўся М. Чарнавус. – Аднак, відаць, замінае ўладзе тое, што Чарнавус вырашыў удзельнічаць у выбарах».

Кіраўнік Кобрынскай суполкі Партыі БНФ Аляксандр Мех 30 чэрвеня звольнены з пасады інжынера па эксплуатацыі газавых сетак нізкага ціску Кобрынскага Упраўлення магістральных газаправодаў ААТ «Белтрансгаз». Паводле меркавання А. Меха, прычынай звальнення з'явілася інфармацыя аб яго ўваходжанні ў спіс 110 кандыдатаў ад АДС. Гутарку з А. Мехам, у час якой выказваліся пагрозы не працягнуць

кантракт і перашкодзіць працаўладкаванню наогул, праводзіў начальнік Кобрынскага Упраўлення магістральных газаправодаў Уладзімір Галашка ў прысутнасці кіраўніка Кобрынскага раённага аддзела КДБ Андрэя Басько. У 12.11 8 ліпеня А. Меху паступіў тэлефонны званок з пагрозамі і абразамі. Зафіксаваны нумар абанента +375164225659 зарэгістраваны на прыёмную дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ад Кобрынскай акругі, якім на той момант быў Віктар Кучынскі. А. Мех падаў заяву на імя пракурора Кобрынскага раёна Міхаіла Запарошчанкі.

Фарміраванне АВК адбывалася фармальна – кандыдатуры прэтэндэнтаў, вылучаныя ў члены камісіі органамі, якія гэтыя камісіі ўтвараюць, не абмяркоўваліся, адбывалася зацвярджэнне загадзя падрыхтаваных спісаў.

Як і ў час папярэдніх выбарчых кампаній, засталіся незразумелымі крытэрыі адбору прэтэндэнтаў у склад выбарчых камісій. Адсутнасць такіх ясна сфармуляваных крытэрыяў дазваляе мясцовым органам улады (аблвыканкамам і аблсаветам) ствараць АВК, зыходзячы з прынцыпу падкантрольнасці.

Грамадзяне, якім адмовілі ва ўваходжанні ў склад АВК, былі фактычна пазбаўлены магчымасці абскардзіць рашэнне органаў, якія стварылі камісіі, у тым ліку і ў судовым парадку. У адпаведнасці з часткай 4-й арт. 122 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь рашэнні мясцовых органаў улады могуць быць абскарджаны ў судовым парадку. Аднак на практыцы суды не прымаюць падобныя скаргі да вытворчасці.

У большасці выпадкаў (у чатырох з шасці абласцей) на сумесныя пасяджэнні аблвыканкамаў і аблсаветаў не былі дапушчаныя прадстаўнікі грамадскіх аб’яднанняў, дэмакратычных партый і СМІ. Такім чынам, паўтарылася практыка папярэдніх выбарчых кампаній, калі такія важныя мерапрыемствы выбарчай кампаніі, як фарміраванне АВК, праходзілі непразрыста, без удзелу прадстаўнікоў грамадскасці.

У шэрагу выпадкаў прадстаўнікі аблвыканкамаў адмаўлялі ўдзельнікам маніторынгу ў азнаямленні з пратаколамі працоўных калектываў аб вылучэнні прадстаўнікоў у склад АВК.

Як станоўчы факт можна адзначыць павелічэнне колькасці прадстаўнікоў апазіцыйных партый і грамадскіх аб’яднанняў, якія ўвашлі ў склад АВК. Так, падчас папярэдніх выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў у 2004 г. у склад акруговых выбарчых камісій увайшлі 22 прадстаўнікі апазіцыйных партый і аб’яднанняў, а ў 2008 г. у склад акруговых камісій патрапілі 38 прадстаўнікоў палітычных партый, якія

ўваходзяць у АДС, што склала 32 % ад вылучаных імі (118 чалавек) і 2,2 % ад колькасці асоб, якія ўвайшлі ў склад камісій.

Як вядома, палітычныя партыі, якія ўваходзяць у АДС, прапаноўвалі ўключыць па адным прадстаўніку ў склад кожнай АВК. АДС быў складзены спіс са 110 прэтэндэнаў у камісіі. Гэта патрабаванне разглядалася як мінімальная ўмова апазіцыйных партый у галіне дэмакратызацыі выбарчага працэсу, аднак яно засталося не выкананым уладай.

Акруговыя выбарчыя камісіі былі створаны без шырокага прадстаўніцтва ўсіх суб'ектаў выбарчага працэсу.

Як і падчас папярэдніх выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, большасць членаў АВК з'яўляюцца членамі праўрадавых палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў (КПБ, РГА «Белая Русь», ГА «БРСМ»), працоўных калектываў, прадстаўнікамі органаў, якія стварылі камісіі. Пры гэтым у большасці выпадкаў старшынямі камісій, намеснікамі старшынь і сакратарамі АВК абраныя прадстаўнікі мясцовых органаў улады, кіраўнікі дзяржаўных прадпрыемстваў і ўстаноў.

Удзельнікі маніторынгу адзначаюць факты стварэння «штабоў па правядзенні выбараў» і «рабочых груп» пры мясцовых органах выканаўчай улады. Аднак выбарчым заканадаўствам не прадугледжана стварэнне такіх органаў, невядомыя іх паўнамоцтвы і кампетэнцыя. Стварэнне такіх органаў выклікае заклапочанасць, бо яны могуць выкарыстоўвацца мясцовымі органамі ўлады ў мэтах кантролю за выбарамі.

Такім чынам, нягледзячы на пэўнае павелічэнне ў АВК прадстаўнікоў апазіцыі, працэдура фарміравання выбарчых камісій засталася нязменнай, органы ўлады не прадэманстравалі змен у сваім падыходзе да фарміравання камісій. АВК не прадстаўляюць шырокія колы грамадства, усіх удзельнікаў выбарчага працэсу. Прысутнасць прадстаўнікоў апазіцыйных партый у складзе камісій па-ранейшаму залежыць ад волі мясцовай улады, а сама працэдура фарміравання з'яўляецца закрытай для грамадзянскай супольнасці.

## II. ВЫЛУЧЭННЕ І РЭГІСТРАЦЫЯ КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ

Вылучэнне кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь можа ажыццяўляцца шляхам збору подпісаў выбаршчыкаў у адпаведнасці з існуючым заканадаўствам (арт. 65 ВК) групай грамадзян (ініцыятыўнай групай) у колькасці не менш за 10 чалавек. Спіс членаў ініцыятыўнай групы, у якім указаны яе кіраўнік, разам з заявай аб рэгістрацыі групы падаецца ў акруговую выбарчую камісію не пазней чым за 65 дзён да выбараў. Указаныя дакументы падае асоба, якая мае намер вылучыцца кандыдатам у дэпутаты. Спіс павінен утрымліваць наступныя звесткі: для асобы, якая мае намер вылучыцца кандыдатам у дэпутаты, – прозвішча, імя, імя па бацьку, дата нараджэння, прафесія, пасада (занятак), месца працы, месца жыхарства, партыйнасць; для кіраўніка ініцыятыўнай групы і кожнага яе члена – прозвішча, імя, імя па бацьку, дата нараджэння, месца жыхарства.

Акруговая выбарчая камісія павінна разгледзець дакументы ў пяцідзённы тэрмін і, у выпадку іх адпаведнасці нормам выбарчага заканадаўства, зарэгістраваць ініцыятыўную групу і выдаць яе членам адпаведныя пасведчанні і падпісныя лісты для збору подпісаў.

Акруговая выбарчая камісія можа адмовіць у рэгістрацыі ініцыятыўнай групы ў наступных выпадках:

- калі асоба, якая мае намер вылучацца кандыдатам у дэпутаты, не з'яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, не жыве на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;
- калі колькасны склад ініцыятыўнай групы меншы за 10 чалавек;
- калі пры фарміраванні групы парушаны прынцып свабоднага ўдзелу ў выбарах;
- калі ў склад ініцыятыўнай групы ўключаны грамадзяне, якія не валодаюць выбарчым правам;
- у іншых выпадках парушэння Выбарчага кодэкса.

Рашэнне аб адмове ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групы павінна быць выдадзена заяўніку не пазней чым на наступны дзень пасля яго прыняцця, ці ў той жа тэрмін павінна накіравацца заяўніку заказным паштовым адпраўленнем.

Працэс падачы заяў аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп у адпаведнасці з каляндарным планам завяршыўся 24 чэрвеня, а рашэнні аб - рэгістрацыя акруговымі выбарчымі камісіямі прымаліся да 29 ліпеня 2008 г.

## Вылучэнне шляхам збору подпісаў выбаршчыкаў

Аналіз працэдуры вылучэння кандыдатаў і рэгістрацыі ініцыятыўных груп дае падставы сцвярджаць, што ў параўнанні з мінулай выбарчай кампаніяй істотна зменшылася колькасць фактаў адмоў у рэгістрацыі. Па звестках ЦК, у Гомельскай вобласці з 59 ініцыятыўных груп адмову ў рэгістрацыі атрымалі 6. У Віцебскай вобласці на рэгістрацыю ініцыятыўных груп было пададзена 47 заяў. З іх кандыдатамі ад уладных структур – 16; ад АДС – 13; ад «Еўрапейскай кааліцыі» – 12; ад незалежных кандыдатаў – 5. Былі зарэгістраваныя 45 ініцыятыўных груп.

Некаторыя АВК не перашкаджалі назіральнікам прысутнічаць на сваіх пасяджэннях. Напрыклад, паводле слоў назіральнікаў ад БСДП(Г), АГП і ПКБ, дапушчаных на першыя пасяджэнні выбарчых камісій: Брэсцкай-Заходняй выбарчай акругі № 1, Брэсцкай-Усходняй № 3, Белавежскай № 8, пасяджэнні адбываліся ў паўнамоцным складзе, на іх не прымаліся рашэнні, што пярэчаць закону. Адзначаўся нават спрыяльны, добразычлівы характар вядзення пасяджэнняў.

Некаторыя ініцыятыўныя групы кандыдатаў ад апазіцыі былі зарэгістраваныя да заканчэння тэрміну падачы заяў у АВК. Напрыклад, на другі дзень пасля зацвярджэння складу Брэсцкай-Усходняй выбарчай акругі № 3 была зарэгістравана ініцыятыўная група кандыдата ад АДС Ігара Маслоўскага. Яму адразу былі выдадзены пасведчанні членаў ініцыятыўнай групы і чыстыя падпісныя лісты. У Белавежскай выбарчай акрузе № 8 25.07.2008 была зарэгістраваная ініцыятыўная група Уладзіміра Ваўранюка, члена незарэгістраванай БСДП (НГ).

Кандыдат ад АДС па Баранавіцкай-Усходняй акрузе № 6 Аляксандр Галькевіч здолеў зарэгістраваць сваю ініцыятыўную групу толькі 19.07.2008 у сувязі з тым, што ў дзень яго першага звароту,18.07.2008, камісія не працавала, члены камісіі выклікаліся ў Брэст. АВК Аршанска-Дняпроўскай выбарчай акругі № 27 адмовіла 19.07.2008 у прыёме дакументаў на рэгістрацыю ініцыятыўнай групы Андрэя Анташкевіча, прадстаўніка «Еўрапейскай кааліцыі», матываваўшы гэта тым, што паводле каляндарнага плану прыём дакументаў пачынаецца 20 ліпеня.

У пяцідзённы тэрмін з дня падачы заяў у АВК зарэгістраваны ініцыятыўныя групы адзіных кандыдатаў ад АДС Анатоля Ляўковіча (Брэсцкая-Заходняя акруга № 1) і Валянціна Лазарэнкава (Белавежская акруга № 8). Пасля падачы спіса для рэгістрацыі член ініцыятыўнай групы В. Лазарэнкава Галіна Чаркасава, жыхарка г. Пружаны, напісала заяву з просьбай аб яе выключэнні. У прыватнай размове

яна матывавала сваё рашэнне магчымай небяспекай для яе сына-прадпрымальніка. Узнікла сітуацыя прэцэдэнта: у час, калі ініцыятыўная група яшчэ не зарэгістравана, адзін з яе членаў напісаў заяву аб выхадзе. Аднак акружная камісія не прызнала гэта перашкодай і ініцыятыўная група В. Лазарэнкава была зарэгістраваная з умовай пераафармлення дакументаў.

Аналагічная сітуацыя ўзнікла ў Сенненскай выбарчай акрузе № 30, калі адна з членаў ініцыятыўнай групы ў падтрымку С. Вазняка, жыхарка г. п. Багушэўск, у вуснай форме заявіла аб уключэнні яе ў склад ініцыятыўнай групы без асабістай згоды. У выніку разгляду доказаў, прадастаўленых камісіі, праблема была знята і заява грамадзянкі не стала падставай для адмовы ў рэгістрацыі. Практыка рэгістрацыі ініцыятыўных груп Сенненскай выбарчай акругі № 30 паказвае, што напісанне ўдзельнікамі ініцыятыўнай групы заявы аб адмове ад удзелу можа не служыць падставай адмовы ў рэгістрацыі. Ёю, згодна з ВК, можа з'яўляцца толькі неўказанне неабходных звестак, уключэнне ў склад ініцыятыўнай групы праз пагрозы і прымус, уключэнне асоб, якія не валодаюць выбарчым правам, і колькасць членаў ініцыятыўнай групы меншая за мінімальную – 10 чалавек.

Аднак у Гомельскай вобласці па падобных прычынах, звязаных з заявамі двух членаў ініцыятыўнай группы,25.07.2008 было адмоўлена ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групы кандыдата ад АДС Пятра Кузняцова. Не прадаставіўшы дакументаў для азнаямлення, у Гомельскай-Цэнтральнай акруговай камісіі № 33 паведамілі, што падставай адмовы ў рэгістрацыі яго ініцыятыўнай групы з'явіўся факт уключэння аднаго чалавека ў склад ініцыятыўнай групы без яго згоды.

Акрамя кандыдатаў ад АДС, у выбарчы працэс практычна ва ўсіх рэгіёнах Беларусі ўключыліся прадстаўнікі «Еўрапейскай кааліцыі». Напрыклад, былі зарэгістраваны кіраўнік Савета рынка баранавіцкіх прадпрымальнікаў Алег Пашко (Баранавіцкая-Усходняя акруга № 6); Дзмітрый Шымайтэс (Баранавіцкая сельская акруга № 7), Славамір Чарнуліч (Гродзенская-Занёманская выбарчая акруга № 49), Кацярына Дземянчук (Гродзенская-Цэнтральная выбарчая акруга № 50), Андрэй Панас (Гродзенская-Сельская выбарчая акруга № 52) ды інш.

На працягу этапа рэгістрацыі ініцыятыўных груп многія назіральнікі сутыкнуліся з немагчымасцю трапіць на пасяджэнні акруговых выбарчых камісій. Напрыклад, назіральнік у Бабруйскай-Першамайскай выбарчай акрузе № 79 Віктар Качан неаднаразова звяртаўся ў камісію з просьбай паведаміць яму, калі адбудзецца пасяджэнне. Яму адказвалі, што пасяджэнні склікаюцца па меры неабходнасці,

і таму даць дакладную інфармацыю аб даце немагчыма. Калі назіральнік у адзін з дзён па ўласнай ініцыятыве з’явіўся на пасяджэнне АВК, старшыня камісіі Віктар Гарбанёў паведаміў, што пасяджэнне, якое, па звестках назіральніка, толькі павінна было пачацца, ужо скончылася.

Аналагічная сітуацыя адбылася з Ігарам Ходзькам і Юліяй Гаўрылавай, назіральнікамі па Бабруйскай-Ленінскай акрузе № 78.

У многіх АВК назіральнікам адмаўлялі ў прадстаўленні інфармацыі аб тым, колькі і якія ініцыятыўныя групы зарэгістраваныя. Напрыклад, на запыт назіральніка ад БХК у Гомельскую-Савецкую акруговую выбарчую камісію № 34 супрацоўнікі адказалі адмовай.

У акруговай камісіі Баранавіцкай сельскай акругі № 7 нават непасрэднаму члену камісіі – Яну Савіцкаму (вылучэнцу АГП) не далі поўных звестак. Пытанне аб гэтым ставілася на галасаванне на другім пасяджэнні АВК 24.07.2008. Старшыня камісіі Пётр Дуброўскі выказваўся аб тым, што прадстаўленне звестак з’яўляецца ўмяшальніцтвам у асабістае жыццё членаў камісіі. Сакратар камісіі Баранавіцкай сельскай акругі № 7 Люцыя Санчук адмовілася даць Я. Савіцкаму копію пратакола пасяджэння камісіі для абскарджання.

Па паведамленнях назіральнікаў, вельмі неахвотна, толькі пасля шматлікіх зваротаў, ім даваліся звесткі аб зарэгістраваных ініцыятыўных групах Гродзенскай вобласці: Ваўкавыскай № 48, Гродзенскай-Занёманскай № 49, Гродзенскай-Цэнтральнай № 50, Гродзенскай-Паўночнай № 51, Гродзенскай сельскай № 52, Дзятлаўскай № 55, Мастоўскай № 56.

### Выкарыстанне адміністрацыйнага рэсурсу пры зборы подпісаў

У працэсе назірання за зборам подпісаў неаднаразова выяўляліся факты выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу, у прыватнасці, залежнасці грамадзян ад кіраўніцтва па месцы працы. Напрыклад, па звестках назіральнікаў, у Гомельскай-Савецкай выбарчай акрузе № 34 член ініцыятыўнай групы дзеючага дэпутата ПП НС Ларысы Кавалёвай, з’яўляючыся загадчыцай дзіцячага садка, загадвала сваім падначаленым падпісвацца за вылучэнне Л. Кавалёвай.

Частым парушэннем можна лічыць збор подпісаў асобамі, якія не з’яўляліся членамі ініцыятыўных груп. Паводле інфармацыі назіральніка Я. Парчынскага, намеснік дырэктара САШ № 18 г. Полацка Ірына Зімніцкая паведаміла, што іх школе было даведзена сабраць не менш

двухсот подпісаў за намесніка старшыні Віцебскага аблвыканкама Пятра Южыка. У выпадку невыканання распараджэння настаўнікам пагражалі пазбаўленнем прэміі.

Начальнікам Глыбоцкага раённага архіва была даведзена мінімальная норма для кожнага супрацоўніка ўстановы – 30 подпісаў у падтрымку Уладзіміра Андрэйчанкі, старшыні Віцебскага аблвыканкама.

### Ціск на членаў ініцыятыўных груп і падпісантаў

Член выбарчай камісіі Белавежскай акругі № 8 ад БСДП(Г) Мікалай Папека ў асабістай размове з назіральнікам Г. Казулькам паведаміў, што ў раённае аддзяленне міліцыі з КДБ быў зроблены запыт на самога М. Папеку, яго жонку і двух сыной 13 і 19 гадоў. Акрамя таго, участковы міліцыянер, наведваючы сям'ю Папекаў, цікавіўся станам іх пчалярскай гаспадаркі – асноўнай крыніцы прыбытку. Названыя дзеянні М. Папека расцэньвае як ціск і матывуе іх сваім удзелам у выбарчай кампаніі.

У Віцебскай-Горкаўскай выбарчай акрузе № 17 напярэдадні рэгістрацыі ініцыятыўнай групы Таццяны Севярынец трое членаў яе групы адклікалі свае заявы. Як паведаміла ў вуснай размове Т. Севярынец, на двух з іх аказваўся ціск з боку адміністрацый прадпрыемстваў, а трэцяй – Лідзіі Карповіч – пагражалі судом і высяленнем з інтэрната, у якім яна пражывае са сваімі непаўналетнімі дзецьмі.

У выніку ціску адміністрацыі аднаго з прадпрыемстваў беларускай чыгункі адмовіўся рэгістраваць сваю ініцыятыўную групу ў Віцебскай-Чыгуначнай выбарчай акрузе № 19 Міхаіл Шпакоўскі, сябра БСДП (Г).

Практычна ва ўсіх рэгіёнах Беларусі адбываліся допыты і аказваўся ціск на грамадзянскіх актывістаў і членаў дэмакратычных палітычных партый па справе выбухаў у Мінску 3 ліпеня 2008 г. Падчас допытаў закраналіся пытанні ўдзелу актывістаў у выбарчай кампаніі. Канстанцін Жукоўскі, які быў вылучаны ў якасці кандыдата па Буда-Кашалёўскай акрузе № 38, накіраваў скаргу ў пракуратуру на дзеянні супрацоўнікаў РАУС Цэнтральнага раёна г. Гомеля. Члену ініцыятыўнай групы Сяргею Трыфанаву 24 ліпеня некалькі разоў тэлефанавалі з Цэнтральнага РАУС, запрашаючы на гутарку па справе выбуху ў ноч з 3 на 4 ліпеня ў Мінску. Калі Трыфанаў адмовіўся прыходзіць без позвы, яму пачалі пагражаць па тэлефоне і заявілі, што яго выклікаюць у аддзел як абвінавачанага. Марыі Тульжанковай, члену ініцытыўнай групы К. Жукоўскага, таксама тэлефанавалі з РАУС.

Мелі месца шматлікія выпадкі ціску на выбаршчыкаў, якія падпісаліся за вылучэнне ў кандыдаты прэтэндэнтаў дэмакратычнай скіраванасці.

Галоўны ўрач Добрушскай бальніцы Ала Маскаленка 20 жніўня 2008 г. выклікала да сябе медсясцёр, якія паставілі свае подпісы за актывіста апазіцыі Адама Варанца, і правяла з імі гутарку, у якой выказала меркаванне, што дзяржаўным служачым, у тым ліку медсёстрам дзяржаўнай установы аховы здароўя, нельга ставіць подпісы за вылучэнне апазіцыйных кандыдатаў.

Ціск на членаў ініцыятыўных груп дэмакратычных кандыдатаў ажыццяўляўся паўсюдна з боку кіраўніцтва прадпрыемстваў, праваахоўных органаў і спецслужб. Невядомыя ў штацкім неаднаразова спрабавалі сфатаграфаваць у працэсе збору подпісаў членаў ініцыятыўных груп у падтрымку Ігара Валяева ў Наваполацку. У Віцебскай-Горкаўскай выбарчай акрузе № 17 Лідзіі Карповіч, члену ініцыятыўнай групы ў падтрымку Таццяны Севярынец, як адзначана вышэй, пагражалі судовым пераследам і высяленнем з інтэрната. Паводле слоў Т. Севярынец, Л. Карповіч была вымушана напісаць заяву аб выхадзе з ініцыятыўнай групы.

У г. п. Ушачы 27 ліпеня ў час збору подпісаў супрацоўнікамі мясцовага РАУС былі затрыманы члены ініцыятыўных груп Яраслава Берніковіча – Вольга Дамаскіна і Аляксей Трубкін. Матывавалася гэта тым, што ў раёне пачасціліся выпадкі кватэрных крадзяжоў. У членаў ініцыятыўнай групы былі праверaны дакументы і перапісаны пашпартныя даныя.

Паказальная сітуацыя склалася ў Віцебску, дзе ў Віцебскай-Чыгуначнай акрузе № 19 была зарэгістраваная ініцыятыўная група ўчастковага інспектара Чыгуначнага РАУС г. Віцебска Андрэя Левінава. Пасля рэгістрацыі ініцыятыўнай групы пачаліся масавыя праверкі дзейнасці афіцэра міліцыі, пракуратура правяла службовае расследаванне, мелі месца пагрозы і патрабаванні звольніцца з шэрагаў МУС (начальнік РАУС падпалкоўнік Сяргей Блажэвіч, яго намеснік маёр Шастоў, прадстаўнік УУС Віцебскага аблвыканкама падпалкоўнік Пронька). А. Левінаў сцвярджаў, што ў яго дачыненні была ўчынена правакацыя – «бойка А. Левінава з калегамі». Вынікам кампаніі А. Левінава стала звальненне з органаў унутраных спраў па ініцыятыве начальніка УУС Віцебскага аблвыканкама палкоўніка Леаніда Фармагея.

Разам з тым, назіральнікі адзначалі адносна спакойны збор подпісаў у Гродзенскай вобласці. Упершыню за апошнія выбарчыя кампаніі ў Гродне і іншых гарадах вобласці быў дазволены збор подпісаў на вуліцы, чым актыўна карысталіся зборшчыкі, узгадняючы месцы знаходжання вулічных падпісных пунктаў з акруговымі камісіямі і органамі ўнутраных спраў. Тым не менш праца зборшчыкаў на вуліцах праходзіла пад пільнай увагай з боку прадстаўнікоў МУС і КДБ, райвыканкамаў

і акруговых камісій. У дачыненні да некаторых дэмакратычных кандыдатаў мелі месца выпадкі ціску. Адзін з інцыдэнтаў, якія адбыліся на Гродзеншчыне на этапе збору подпісаў і рэгістрацыі кандыдатаў, датычыўся затрымання супрацоўнікамі міліцыі ініцыятыўнай групы кіраўніка абласной арганізацыі АГП Юрыя Істоміна. Паводле яго слоў, 18 жніўня 2008 г. (апошні дзень падачы дакументаў на рэгістрацыю) ініцыятыўная група збірала подпісы ў Навагрудку. Увесь час за імі сачылі супрацоўнікі міліцыі. Калі збор подпісаў быў скончаны і адбываўся сход групы па іх праверцы перад падачай, супрацоўнікі міліцыі затрымалі членаў ініцыятыўнай групы і даставілі ў мясцовы РАУС, дзе членам ініцыятыўнай групы было паведамлена, што яны нібыта займаліся датэрміновай агітацыяй. На пытанне, калі і хто даў міліцыянерам паўнамоцтва вырашаць, што з'яўляецца агітацый, а што не, у РАУС адказаць не здолелі, але запатрабавалі ад затрыманых пісьмовых тлумачэнняў. Адпусцілі людзей каля сямі гадзін вечара, калі часу на зацвярджэнне подпісаў і іх здачу ўжо не было. Пазней стала вядома, што пракуратура Навагрудскага раёна распачала адміністрацыйную справу ў дачыненні Ю. Істоміна за парушэнне выбарчага заканадаўства. На думку пракуратуры, Ю. Істомін парушыў існуючае заканадаўства, бо праводзіў датэрміновую агітацыю (раздаваў газету «Народная свобода», у якой размешчаны артыкул пра Ю. Істоміна). Апрача таго, Навагрудскі райвыканкам даслаў ліст на адрас кіраўніцтва АГП, у якім паведамлялася, што, нягледзячы на сваё затрыманне, Істомін нібыта яшчэ меў час для падачы дакументаў у акруговую камісію, але сам іх не падаў.

## Вылучэнне ад працоўных калектываў

У параўнанні з мінулымі парламенцкімі выбарамі 2004 г., у 2008 г. істотна скарацілася колькасць кандыдатаў, вылучаных працоўнымі калектывамі. Як і раней, гэтым спосабам вылучэння маглі скарыстацца толькі праўладныя кандыдаты.

## Рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты і абскарджанне адмовы ў рэгістрацыі

Паводле інфармацыі ЦК, кандыдатамі ў дэпутаты ПП НС вылучаліся 365 чалавек. У выніку прайшлі рэгістрацыю 276 чалавек, што складае 75,6 % ад агульнай колькасці.

Большасць прадстаўнікоў АДС, вылучаных рознымі спосабамі, былі зарэгістраваныя. З 98 чалавек, пададзеных АДС, зарэгістравана 76,

што складае 77,5 % ад агульнай колькасці вылучаных. Са спісу «Еўрапейскай кааліцыі», якая прапанавала 51 чалавека – 23 зарэгістравана (45 %). У цэлым са 149 чалавек, вылучаных дэмакратычнымі сіламі, былі зарэгістраваны 99 чалавек (66,5 %). На мінулых выбарах у Палату прадстаўнікоў трэцяга склікання з 227 чалавек, вылучаных кааліцыяй «5+»,126 чалавек былі зарэгістраваны кандыдатамі ў дэпутаты (каля 55%).

З 29 прадстаўнікоў АГП 26 зарэгістравана, ад партыі БНФ адпаведна з 21 – 16, ад ПКБ з 18 – 13, ад КПБ з 17 – 13, ад БСДП (Г) з 14 – 11, ад ЛДПБ з 9 – 8, ад Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці з 5 – 3. Ад Аграрнай партыі зарэгістраваны 1 кандыдат.

З 56 чалавек, вылучаных з'ездамі партый, – кандыдатамі ў дэпутаты зарэгістраваны 50 чалавек (89,3%).

Сярод тых, каму было адмоўлена ў рэгістрацыі, лідэры БНФ – намеснікі старшыні Партыі БНФ Вінцук Вячорка і Віктар Івашкевіч.

Сярод кандыдатаў у дэпутаты 58 жанчын (21 % ад агульнай колькасці зарэгістраваных),18 – грамадзяне ва ўзросце да 30 год (6,5 %), 38 кандыдатаў – дзеючыя дэпутаты Палаты прадстаўнікоў трэцяга склікання (13,8%).

Па выніках рэгістрацыі кандыдатаў 15 акруг безальтэрнатыўныя: Івацэвіцкая № 11 (генеральны дырэктар ДУВП «Івацэвіцкая ЖКГ» Леанід Кавалевіч), Пінская сельская № 15 (генеральны дырэктыр ААТ «Пінсксаўгасбуд» Канстанцін Шэўчык), Віцебская-Горкаўская № 17 (старшыня Віцебскага гарадскога Савета дэпутатаў Генадзь Грыцкевіч), Наваполацкая № 25 (галоўны ўрач дзіцячай паліклінікі УАЗ «Наваполацкая цэнтральная гарадская бальніца» Іна Антонава), Рагачоўская № 45 (начальнік Упраўлення ЖКГ Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Міхасёў), Ваўкавыская № 48 (старшыня Зэльвенскага райвыканкама Леанід Эльяшэвіч), Лідская № 54 (начальнік упраўлення эканомікі Лідскага райвыканкама Тамара Клебан), Мастоўская № 56 (першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Васіль Сцяпура), Навагрудская № 57 (дырэктар РСУП «Племзавод Карэлічы» Піліп Богуш), Маладзечанская сельская № 71 (начальнік галоўнага ўпраўлення кадравай палітыкі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Уладзімір Сінякоў), Смаргонская № 59 (дэпутат Палаты прадстаўнікоў Таццяна Голубева), Шчучынская № 60 (намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Марыя Бірукова), Барысаўская сельская № 63 (генеральны дырэктар РУП «Барысаўхлебпрам» Васіль Гур'янаў), Вілейская № 64 (галоўны ўрач УАЗ «Вілейская цэнтральная раённая бальніца» Ігар

Спільнічэнка), Нясвіжская № 72 (дырэктар Шчэпіцкай сярэдняй школы Клецкага раёна Алена Новік). Усе яны з'яўляліся кандыдатамі ад улады.

З 52 скарг, якія паступілі ў ЦК, 8 (15,4 %) былі задаволены і адпаведна столькі было зарэгістравана кандыдатаў па выніках разгляду скарг. У Вярхоўны суд паступілі 19 скарг тых прэтэндэнтаў, якім адмовілі і акруговыя камісіі, і ЦК (адзін з заяўнікаў адклікаў сваю заяву да разгляду судом). З астатніх 18 заяў паводле рашэння Вярхоўнага суда толькі 2 (11,1%) прэтэндэнты сталі кандыдатамі (Аляксей Туровіч, дырэктар ДВУП «ТоргВестинг», Сухараўская акруга № 102), Дзмітрый Макараў, генеральны дырэктар ТАА «Макбел», Партызанская акруга № 110). Суд прызнаў неістотнымі парушэннямі тыя факты, што яны не знялі з уліку ў ДАІ прададзеныя больш за 10 год таму легкавыя аўтамабілі. Туровіч і Макараў былі зарэгістраваны па выніках разгляду іх скарг у Вярхоўным судзе. Такім чынам, суд парушыў сфарміраваную папярэднімі камапніямі практыку, калі падобныя парушэнні з'яўляліся безумоўнай падставай для адмовы ў рэгістрацыі. Гэта адзначаецца як станоўчы факт.

Такім чынам, па выніках разгляду скарг, кожны пяты заяўнік быў зарэгістраваны.

Неабходна адзначыць, што АВК, як і раней, у большасці выпадкаў не дазвалялі кандыдатам, якім адмовілі ў рэгістрацыі, азнаёміцца з матэрыяламі праверак, якія сталі падставай для адмоўнага рашэння. Але ў бягучай выбарчай кампаніі ЦК працавала больш адкрыта, чым раней: заяўнікам прадастаўлялася магчымасць азнаёміцца з матэрыяламі праверак. Старшыня ЦК Л. Ярмошына падчас разгляду скарг незарэгістраваных кандыдатаў неаднаразова ўказвала старшыням АВК, што яны павінны азнаёміць заяўнікаў з матэрыяламі праверак, на падставе якіх адмаўлялася ў рэгістрацыі.

Аналіз этапа рэгістрацыі кандыдатаў дазваляе зрабіць выснову, што ўстаноўленыя заканадаўствам шматлікія прававыя бар'еры выкарыстоўваюцца акруговымі камісіямі для адмовы ў рэгістрацыі паводле фармальных прыкмет, без роўнага пыдыходу да ўсіх удзельнікаў працэсу. Сам працэс праверкі пададзеных на рэгістрацыю матэрыялаў быў закрыты ад зацікаўленых асоб і назіральнікаў. Ніводнаму з вылучэнцаў ад улады – кіраўнікам дзяржаўных прадпрыемстваў, устаноў ці дзяржаўным служачым – не было адмоўлена ў рэгістрацыі. У той жа час сярод асоб, якім было адмоўлена ў рэгістрацыі, – прадстаўнікі АДС і іншыя незалежныя кандыдаты.

## Датэрміновая агітацыя

Назіральнікамі БХК былі адзначаныя шматлікія факты датэрміновай агітацыі за кандыдатаў яшчэ да іх рэгістрацыі. Спосабамі такой агітацыі былі разнастайныя сустрэчы з працоўнымі калектывамі, жыхарамі населеных пунктаў, правядзенне прыёмаў грамадзян па розных пытаннях, публікацыя артыкулаў у дзяржаўных СМІ.

Старшыня Гродзенскага гарвыканкама Аляксандр Антоненка (Гродзенская-Занёманская акруга № 49) сустракаўся з гродзенцамі ў памяшканні ЖЭСа № 20, які знаходзіцца на тэрыторыі акругі, дзе Антоненка збіраўся рэгістравацца. Сход рэпрэзентаваўся як сустрэча з жыхарамі горада. Аднак самі жыхары сцвярджаюць, што не могуць прыгадаць, каб за ўвесь час кіравання горадам Антоненка звяртаўся да такой формы кантактаў з гараджанамі.

Задоўга да рэгістрацыі ў Шчучынскай акрузе № 60, 1 жніўня 2008 г., адбылася сустрэча з намеснікам старшыні Гродзенскага аблвыканкама Марыяй Біруковай, вылучанай прэтэндэнтам у кандыдаты па названай акрузе. Сустрэча адбывалася ў г. Шчучыне з супрацоўнікамі Цэнтральнай раённай бальніцы і ААТ «Васілішкі». У газеце «Заря» № 61 ад - 5 жніўня 2008 г. у артыкуле «У парламенце павінны быць дастойныя!» была размешчана інфармацыя пра М. Бірукову. У якасці кандыдата М. Бірукова была зарэгістраваная толькі ў трэцяй дэкадзе жніўня.

Паводле інфармацыі назіральнікаў БХК, дзяржаўныя газеты пастаянна друкавалі матэрыялы, якія можна расцэньваць як агітацыю задоўга да рэгістрацыі кандыдатаў. Газета «Заря» (№ 92 ад 19.08.2008) размясціла чарговы разгорнуты матэрыял пра дзеючага дэпутата парламента па Брэсцкай-Заходняй акрузе № 1 Алега Вялічку, які ў Палаце прадстаўнікоў узначальваў камісію па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі. Артыкул «Олег Величко: «Уметь видеть перспективу...» мае тэндэнцыйны хвалебны характар. «Этого человека сегодня, безусловно, знает вся страна... – піша аўтар. – Он держит руку на пульсе тех сфер нашей жизни, которые волнуют практически каждого человека». «Брестская газета» (№ 34 ад 22.08.2008) у рубрыцы «Самое ценное» таксама змясціла матэрыял, прысвечаны А. Вялічку, пад назвай «За жыццё людзей адказны». Інтэрв'ю з А. Вялічкам пад назвай «Моц законаў – у служэнні людзям» («Вечерний Брест» № 58 ад 18.07.2008) займае значную плошчу газетнай паласы, змяшчае партрэт дэпутата памерам 11х13 см і мае характар справаздачы перад выбаршчыкамі. «За чатыры гады маёй працы ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу здолеў зрабіць дастаткова

шмат – сцвярджае дэпутат. – ...Усе прынятыя законы разглядаліся дэпутатамі праз прызму абароны інтарэсаў людзей». У інтэрв'ю А. Вялічка дае ацэнку стратэгіі беларускай апазіцыі на выбарах. Аналагічны матэрыял з партрэтам пад назвай «Алег Вялічка: Быць патрэбным людзям» быў надрукаваны ў газеце «Брестский вестник» (№ 30 ад 24.07.2008) у нумары, прысвечаным святу горада. Дэпутат паведамляе выбаршчыкам аб сваім удзеле ў рэканструкцыі аддзялення гарадской бальніцы і добраўпарадкаванні вуліц горада.

Газета Гродзенскага раёна «Перспектива» (№ 58 ад 31.07.2008) змясціла вялікі артыкул пра першага сакратара Гродзенскага раённага камітэта БРСМ Мікалая Гарбачонка, ініцыятыўная група па збору подпісаў за якога ў складзе 116 чалавек была зарэгістраваная камісіяй Гродзенскай сельскай выбарчай акругі № 52.

Раённая газета «Навіны Камянеччыны» (23.07.2008) у межах адзінага дня інфармавання насельніцтва апублікавала артыкул «Будаўніцтва жытла – найважнейшы прыярытэт дзяржаўнай палітыкі». У ім паведамляецца аб сустрэчы 17 ліпеня прапагандысцкай групы Камянецкага райвыканкама з супрацоўнікамі камянецкага РУПБ «ПМК-14», у якой прымаў удзел Мікалай Андрайчук, кандыдат ад улады, чыя ініцыятыўная група на 23.07.2008 была зарэгістраваная.

Газета Брэсцкага гарвыканкама «Брестский вестник» апублікавала разгорнуты артыкул з падзагалоўкам «Чалавек на сваім месцы», прысвечаны дырэктару гімназіі № 6 г. Брэста Ганне Анішчук (№ 29 ад 17.07.2008). Пазней была зарэгістравана ініцыятыўная група Г. Анішчук.

У г. Баранавічы 26.07.2008 па канале мясцовага тэлебачання «Інтэкс» у праграме «Навіны» было паказана выступленне Святланы Пішч, генеральнага дырэктара ААТ «Грант-Сервіс», будучага кандыдата ў дэпутаты па Баранавіцкай-Усходняй акрузе № 6. Тэлевізійны сюжэт быў прысвечаны раздачы С. Пішч тэлевізараў у падарунак шматдзетным сем'ям.

Разам з тым, яшчэ падчас вылучэння кандыдатаў распаўсюджвалася і апазіцыйная прэса, дзе змяшчаліся артыкулы пра дзеячоў апазіцыі, якія потым вылучаліся кандыдатамі. Напрыклад, у г. Брэсце на працягу этапа вылучэння кандыдатаў актывістамі ПКБ і БСДП(Г) неаднаразова распаўсюджвалася і незалежная прэса – газеты «Товарищ» і «Новы час»; брэсцкім рэгіянальным аддзяленнем Незалежнага прафсаюза работнікаў радыёэлектроннай прамысловасці (РЭП) распаўсюджваліся бюлетэні «Заводская проходная» і «Экспресс-инфо», якія ўтрымлівалі падобныя матэрыялы. Аднак наклады дзяржаўных выданняў былі непараўнальна большыя за наклады апазіцыйных.

## III. ФАРМІРАВАННЕ ЎЧАСТКОВЫХ ВЫБАРЧЫХ КАМІСІЙ (УВК)

У адпаведнасці з арт. 28 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь падрыхтоўку і правядзенне выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу забяспечваюць акруговыя і ўчастковыя выбарчыя камісіі.

Паводле арт. 34 Выбарчага кодэкса ўчастковыя выбарчыя камісіі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў ствараюцца раённымі, гарадскімі выканаўчымі камітэтамі, а ў гарадах з раённым дзяленнем – мясцовымі адміністрацыямі ў складзе 5–19 членаў камісій не пазней чым за 45 дзён да выбараў.

Рашэнні аб стварэнні камісій з указаннем іх складу, месца знаходжання, нумароў тэлефонаў у сямідзённы тэрмін змяшчаюцца ў друку ці іншым спосабам даводзяцца да ведама грамадзян (выбаршчыкаў).

Па-за межамі Рэспублікі Беларусь пры правядзенні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў участковыя камісіі ствараюцца кіраўнікамі дыпламатычных прадстаўніцтваў (консульскіх устаноў) Рэспублікі Беларусь, якія дзейнічаюць на тэрыторыі адпаведных замежных дзяржаў.

Працэдура вылучэння прадстаўнікоў у склад УВК рэгулюецца арт. 35 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Згодна з гэтым артыкулам палітычныя партыі, іншыя грамадскія аб’яднанні, працоўныя калектывы арганізацый ці калектывы іх структурных падраздзяленняў з ліку сваіх членаў, а таксама грамадзяне шляхам збору подпісаў могуць вылучаць у адпаведную ўчастковую камісію толькі па аднаму прадстаўніку.

Вылучаць сваіх прадстаўнікоў у склад участковых камісій маюць права:

- кіруючыя органы абласных, Мінскіх гарадскіх, раённых, гарадскіх (у гарадах абласнога падпарадкавання), раённых у гарадах арганізацыйных структур палітычных партый, іншых грамадскіх аб’яднанняў, якія маюць ніжэйшыя аганізацыйныя структуры;
- кіруючыя органы гарадскіх (у гарадах раённага падпарадкавання) арганізацыйных структур палітычных партый, іншых грамадскіх аб’яднанняў, якія маюць ніжэйшыя арганізацыйныя структуры, сходы іх першасных арганізацый. Першасная арганізацыя палітычнай партыі, іншага грамадскага аб’яднання мае права вылучаць свайго прадстаўніка ва УВК таго ўчастка для галасавання, на тэрыторыі якога знаходзіцца першасная арганізацыя.
- Сходы (канферэнцыі), якія знаходзяцца на тэрыторыі раёна, горада, раёна ў горадзе, пасёлка, сельсавета, працоўных

калектываў арганізацый, якія налічваюць не менш за 30 працуючых – у адпаведныя акруговыя камісіі.

Пры вылучэнні прадстаўнікоў у склад камісій ад калектываў структурных падраздзяленняў вылучэнне прадстаўнікоў у склад гэтых камісій ад усяго працоўнага калектыву арганізацыі не праводзіцца. Сход правамоцны, калі ў яго працы ўдзельнічае больш за палову складу калектыву. Канферэнцыі ў працоўных калектывах праводзяцца, калі скліканне сходаў ускладняецца па прачынах вялікай колькасці працуючых, шматзменнасці ці тэрытарыяльнай разрозненасцю структурных падраздзяленняў, і правамоцныя пры ўдзеле ў іх працы не менш чым 2/3 дэлегатаў, абраных у парадку, устаноўленым працоўным калектывам. Рашэнне сходу (канферэнцыі) працоўнага калектыву прымаецца большасцю галасоў яго ўдзельнікаў. Прадстаўнікоў у склад УВК могуць таксама вылучаць працоўныя калектывы ці калектывы іх структурных падраздзяленняў, якія налічваюць не менш за 10 працуючых.

Вылучаць прадстаўнікоў у склад УВК маюць права таксама грамадзяне, якія валодаюць выбарчым правам, шляхам падачы заявы.

Органы, якія ствараюць камісіі, маюць права ўключыць сваіх прадстаўнікоў у склад гэтых камісій.

Паводле Каляндарнага плана арганізацыйных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання вылучэнне ў склад участковых камісій ажыццяўлялася да 10 жніўня 2008 г. уключна. Сварэнне УВК павінна было завяршыцца не пазней 13 жніўня 2008 г. На працягу сямі дзён мясцовыя СМІ павінны быць надрукаваныя спісы членаў участковых выбарчых камісій.

## Вылучэнне ў склад УВК

Паводле інфармацыі сакратара ЦК Мікалая Лазавіка, у склад 6485 участковых выбарчых камісій былі вылучаны 73576 чалавек. Больш паловы прэтэндэнтаў – 37936 чалавек – вылучаліся грамадзянамі шляхам падачы заяў; працоўныя калектывы вылучылі 24144 прэтэндэнты, палітычныя партыі – 1237, грамадскія аб’яднанні – 10259.

Сярод палітычных партый найбольшую колькасць прэтэндэнтаў у склад УВК вылучыла Партыя камуністаў Беларускай – 425 чалавек. Аб’яднаная грамадзянская партыя вылучыла 344 прэтэндэнты, Партыя БНФ – 201, Камуністычная партыя Беларусі – 195, Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада) – 70. Па адным прадстаўніку

ў склад УВК вылучыла Аграрная партыя і Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці. Такім чынам, прадстаўнікі палітычных партый склалі 1,7 % ад усёй колькасці вылучаных ва ўчастковыя камісіі,84, % з іх – прадстаўнікі апазіцыйных партый.

Сярод грамадскіх аб'яднанняў найбольшую колькасць прэтэндэнтаў вылучыў Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі – 2518 чалавек, «Белая Русь» вылучыла 1817 прэтэндэнтаў, Беларускі саюз жанчын – 1051, Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў – 612, Беларускі саюз афіцэраў – 60, БНФ «Адраджэньне» – 113.

Грамадска-палітычныя суб'екты, якія ўваходзяць у АДС, вылучылі ў склад участковых камісій 1 515 чалавек: прэтэндэнты вылучаліся як непасрэдна пасяджэннямі арганізацыйных структур, так і шляхам збору подпісаў грамадзян. Пры гэтым, паводле рашэння АДС, у заявах аб вылучэнні ў склад участковых камісій шляхам збору подпісаў грамадзян указвалася партыйная прыналежнасць прэтэндэнтаў.

Назіральнікі адзначылі, што падчас вылучэння прэтэндэнтаў ва УВК усе зацікаўленыя мелі магчымасць падаць адпаведныя дакументы. Разам з тым, зафіксаваныя факты ціску на вылучэнцаў у камісіі з боку адміністрацый прадпрыемстваў і навучальных устаноў з мэтай прымусіць іх адазваць пададзеныя заявы.

## Вынікі фарміравання УВК

Фарміраванне УВК адбывалася яшчэ менш празрыста, чым фарміраванне АВК. Пасяджэнні райвыканкамаў і раённых адміністрацый у гарадах з раённым дзяленнем вельмі часта (пераважна) праходзілі ў закрытым для грамадскасці рэжыме. На гэтыя пасяджэнні не дапускаліся прадстаўнікі няўрадавых арганізацый, незалежных СМІ, не запрашаліся прэтэндэнты, вылучаныя ў склад УВК.

Назіральнікам ад БХК Р. Юргелю, М. Ворану, А. Янушкевічу, С. Рудкоўскай у адміністрацыях Ленінскага і Кастрычніцкага р-наў г. Гродна не было дазволена прысутнічаць на пасяджэннях па фарміраванні УВК. Падобная сітуацыя была адзначаная ўдзельнікамі маніторынгу і ў іншых раёнах Гродзенскай вобласці.

Назіральнікам адмаўлялі нават у прадастаўленні інфармацыі пра час і месца правядзення пасяджэнняў выканкамаў. На шматлікія тэлефанаванні Дзмітрыя Слуцкага (Гродзенская Паўночная выбарчая акруга № 51) у адміністрацыю Ленінскага раёна г. Гродна з просьбай паведаміць дату і час правядзення адпаведнага пасяджэння яму адказвалі, што такой інфармацыі пакуль няма. Гэта працягвалася да таго часу,

пакуль у адміністрацыі не паведамілі, што пасяджэнне ўжо адбылося. Кіраўнік справамі адміністрацыі Алег Бялінскі толькі параіў удзельнікам маніторынгу чытаць газету «Гродзенская праўда», дзе павінны быць апублікаваныя спісы ўсіх УВК.

У Мастоўскай выбарчай акрузе ўдзельнікі маніторыгу Лявон Карповіч, Алег Рамашкевіч і Анатоль Валюк таксама не змаглі даведацца пра дату і час пасяджэння адміністрацыі. Удзельнікі маніторынгу ў г. Гродна адзначылі, што пасяджэнні доўжыліся вельмі кароткі час і праходзілі без абмеркавання вылучаных у склад камісій прадстаўнікоў. Інфармацыя аб колькасці вылучаных у склад участковых выбарчых камісій насіла цалкам закрыты характар.

Пасяджэнні Салігорскага, Слуцкага, Клецкага і Нясвіжскага райвыканкамаў па пытанні фарміравання ўчастковых камісій праходзілі 12 жніўня. Назіральнікамі ад БХК загадзя былі пададзены ў выканкамы пісьмовыя заявы з просьбай дапусціць іх на пасяджэнні.

Назіральнік Алег Нікулін, якога дапусцілі на пасяджэнне Клецкага райвыканкама, прыкладна праз 15 хвілін пасля пачатку папрасіў даць яму магчымасць азнаёміцца з пратаколамі і заявамі аб вылучэнні ў склад камісій. Пасля гэтага пасяджэнне Клецкага райвыканкама было абвешчана закрытым і назіральніка выдалілі.

Назіральніка Казіміра Кавецкага на пасяджэнне Салігорскага райвыканкама не дапусцілі. Пры гэтым адмовіліся выдаць кнігу заўваг і прапаноў, у якой ён хацеў напісаць скаргу на незаконныя дзеянні службовых асоб. К. Кавецкі звярнуўся з пісьмовай заявай на імя пракурора Салігорскага раёна, у якой запатрабаваў пракурорскага рэагавання.

Назіральніку Уладзіміру Паклонскаму ў Нясвіжскім райвыканкаме адмовіліся прадаставіць інфармацыю пра дату і час правядзення пасяджэння выканкама па фарміраванні ўчастковых выбарчых камісій. Як ён даведаўся пазней, пасяджэнне Нясвіжскага райвыканкама прайшло 12 жніўня. Таксама не быў праінфармаваны пра дату, месца і час правядзення пасяджэння Слуцкага райвыканкама назіральнік Віталь Амяльковіч. Больш за тое, знаходзячыся 12 жніўня ў будынку Слуцкага райвыканкама і даведаўшыся, што ў адным з яго памяшканняў праводзіцца пасяджэнне райвыканкама па фарміраванні ўчастковых камісій, ён папрасіў паведаміць яму нумар памяшкання, але ў гэтым яму адмовілі. Ужо пасля завяршэння пасяджэння В. Амяльковіч папрасіў азнаёміць яго з інфармацыяй пра персанальныя склады сфарміраваных участковых камісій. На гэта яму сказалі, што яго права як назіральніка ад РПГА «БХК» распаўсюджваецца толькі на дзеянні Слуцкай акруговай выбарчай камісіі, дзе ён зарэгістраваны назіральнікам,

а рашэнні і дзеянні райвыканкама – гэта не яго прэрагатыва. Пры гэтым яму растлумачылі, што пра склады ўчастковых камісій ён зможа даведацца з мясцовых СМІ.

Падобная тэндэнцыя назіралася і пры правядзенні пасяджэнняў райвыканкамаў у Гомельскай вобласці. Не былі дапушчаны назіральнікі на пасяджэнні Светлагорскага, Жлобінскага і Рагачоўскага райвыканкамаў, якія адбыліся 12 жніўня. Прадстаўнікі выканкама рэкамендавалі назіральнікам азнаёміцца з вынікамі фарміравання камісій у мясцовым друку. Было таксама адмоўлена ў праве азнаёміцца з дакументамі (пратаколамі аб вылучэнні), датычнымі вылучэння ў склад участковых выбарчых камісій. Прадстаўнікі райвыканкамаў параілі назіральнікам звярнуцца з гэтай просьбай у пісьмовым выглядзе ў адпаведенасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб звароце грамадзян».

Назіральніку Мікалаю Уласевічу адмовілі ў магчымасці прысутнічаць на пасяджэнні Астравецкага райвыканкама 11 жніўня, на якім зацвярджаўся склад участковых выбарчых камісій, а пасля адмовіліся азнаёміць з пратаколамі і заявамі прэтэндэнтаў на вылучэнне ў склад камісій. Намеснік старшыні райвыканкама В. Свіла 12 жніўня патлумачыў, што Астравецкі райвыканкам не лічыць неабходным запрашаць на свае пасяджэнні прадстаўнікоў палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў.

Практычна ўсе пасяджэнні райвыканкамаў і адміністрацый насілі фармальны характар і праходзілі без рэальнага абмеркавання кандыдатур, вылучаных ва ўчастковыя камісіі. На пасяджэннях фактычна праходзіла фармальнае зацвярджэнне загадзя сфарміраваных складаў УВК.

Назіральнік Віктар Дашкевіч, які быў дапушчаны на пасяджэнне Капыльскага райвыканкама, зафіксаваў, што выканкам сфарміраваў УВК за 15 хвілін: гэта значыць, што старшыня райвыканкама прапанаваў прагаласаваць за ўжо гатовы спіс. Ніякага разгляду заяў аб вылучэнні ў склад участковых камісій не было, самі заявы не зачытваліся. Назіральнік папрасіў азнаёміцца з пратаколамі або заявамі аб вылучэнні ў склад УВК, але яму ў гэтым адмовілі. Пасля гэтага пасяджэнне выканкама завяршылася.

Назіральнік высветліў, што 29 чалавек уключаны ў склад 8 участковых камісій незаконна, паколькі не з'яўляліся членамі тых працоўных калектываў, якія іх вылучылі ў камісіі. Адзначаны факт быў пацверджаны пракурорскай праверкай. Аднак і пасля гэтага выканкам адмовіў назіральнікам у азнаямленні з матэрыяламі вылучэння, незаконна ўключаныя ў склад камісій людзі працягвалі сваю працу ў камісіях.

Пасяджэнне Лідскага райвыканкама па фарміраванні УВК, на якім прысутнічаў назіральнік ад БХК Л. Анацка, праходзіла з 14.30 да 16.10. Пры гэтым у выканкам было пададзена 1035 заяў аб вылучэнні ў склад камісій Лідскай выбарчай акругі № 54. Такім чынам, на разгляд кожнай заявы выканкам затраціў 5,7 секунды. Пры адзінагалосным галасаванні ва ўчастковыя камісіі акругі быў зацверджаны 951 чалавек.

Назіральнікі, якія былі дапушчаныя на пасяджэнні адміністрацый Ленінскага і Маскоўскага раёнаў г. Брэста, а таксама Пружанскага, Камянецкага райвыканкамаў, засведчылі, што пасяджэнні доўжыліся 10–15 хвілін, абмеркавання кандыдатур у склад камісій не адбывалася, спісы былі падрыхтаваныя загадзя і зацвярджаліся адзінагалосна.

Па выбарчым участку № 62 Мухавецкай выбарчай акругі № 4 было пададзена 13 заяў. Сябра Партыі БНФ Пётр Андрыевіч, які быў вылучаны шляхам збору подпісаў і чыя заява была зарэгістраваная за № 1, не быў уключаны ў склад камісіі з фармулёўкай «не хапіла месца». Па выбарчым участку № 65 той жа акругі было пададзена 15 заяў. Уладзімір Малей, праваабаронца, чыя заява была зарэгістраваная за № 1, таксама не быў уключаны ў склад камісіі. У выканкаме патлумачылі, што рашэнне абмежаваць колькасць членаў УВК абумоўлена «мэтай эканоміі грашовых сродкаў».

Большасць удзельнікаў маніторынга адзначаюць, што склад сфарміраваных УВК шмат у чым паўтарае склад участковых камісій, якія дзейнічалі пры правядзенні выбараў дэпутатаў ПП НС трэцяга склікання ў 2004 г.

Пры параўнанні складаў створаных участковых камісій па Барысаўскай сельскай выбарчай акрузе № 63 высветлілася, што з 565 зацверджаных сябраў камісій 157 чалавек уваходзілі ў склад участковых камісій у 2004 г. У Барысаўскай гарадской акрузе № 62 з 46 цяперашніх старшынь 24, ці 52 %, займалі гэтыя пасады падчас выбараў 2004 г. Практычна захаваўся склад Юр’еўскай УВК Смалявіцкай акругі, нягледзячы на тое, што пракуратурай на той момант праводзілася праверка па заяве аб узбуджэнні крымінальнай справы па фальсіфікацыі выбараў у мясцовыя Саветы 2007 г.

Захавалася тэндэнцыя, характэрная для папярэдніх выбарчых кампаній, фарміраваць УВК па вытворчым прынцыпе, з прадстаўнікоў аднаго працоўнага калектыва пры фармальна розных шляхах вылучэння ў склад камісій. Як правіла, старшынёй камісіі абіраўся чалавек, ад якога астатнія члены камісіі знаходзіліся ў працоўнай залежнасці. Напрыклад, з 15 членаў УВК № 1 Полацкай гарадской выбарчай акругі

14 з’яўляюцца супрацоўнікамі ТАА «Полацк-Шкловалакно» (пятнаццаты сябра камісіі, вылучаны ад КПБ, – пенсіянерка, якая калісьці была адной з заслужаных ткачых таго ж «Шкловалакна»). Усе члены камісіі вылучаныя ад структурных падраздзяленняў ТАА «Полацк-Шкловалакно». Пры гэтым старшыня камісіі – намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце прадпрыемства; намеснік старшыні камісіі – дырэктар Палаца культуры, дзе арганізаваны ўчастак для галасавання; сакратар камісіі – журналіст малатыражнай газеты «Трудовая смена», залежнай ад адміністрацыі.

Распаўсюджаная практыка, калі старшынямі камісій з’яўляліся дырэктары школ, а настаўнікі складалі ва ўсіх «прышкольных» камісіях пераважную большасць.

Агульная колькасць асоб, якія ўвашлі ў склад УВК, склала 69845 чалавек. З іх 36071 былі вылучаны грамадзянамі шляхам падачы заяў, 21869 – ад працоўных калектываў, 9032 – ад грамадскіх аб’яднанняў, 2712 – прадстаўляюць органы, якія ўтвараюць камісіі і толькі 161 – ад палітычных партый. Ва ўчастковыя камісіі ўключана 116 прадстаўнікоў Камуністычнай партыі Беларусі (КПБ), 3 – Патрыятычнай партыі, 1 – Аграрнай партыі, 1 – Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці. З апазіцыйных палітычных партый ва ўчастковыя камісіі патрапілі 29 прадстаўнікоў Партыі камуністаў Беларускай (ПКБ), 7 – Аб’яднанай грамадзянскай партыі (АГП), 4 – Партыі БНФ.

Што датычыцца агульнай колькасці ўсіх прадстаўнікоў грамадска-палітычных суб’ектаў, якія ўваходзяць у АДС, толькі мізэрная частка з іх была ўключаная ў склад УВК: 48 з 1 515 прэтэндэнтаў, ці 3,1%. Такім чынам, ад агульнай колькасці асоб, што ўвайшлі ў склад УВК, прадстаўнікі дэмакратычных сіл складаюць 0,07 %. Гэта лічба яшчэ меншая, чым на мінулых парламенцкіх выбарах у 2004 г. (0,2%).

Варта адзначыць, што многія прадстаўнікі дэмакратычных сіл зацверджаныя ў склад УВК на закрытых выбарчых участках (бальніцы, вайсковыя часткі, санаторыі, дыспансеры і г. д.).

УВК – найважнейшыя структуры ў выбарчым працэсе, менавіта яны вядуць падлік галасоў па бюлетэнях, астатнія камісіі падсумоўваюць лічбы пратаколаў УВК. Трэба адзначыць, што ўладамі не было зроблена неабходных захадаў для стварэння незалежных УВК, якія б карысталіся даверам удзельнікаў выбараў і назіральнікаў.

У шматлікіх выпадках працэс фарміравання УВК заставаўся непразрыстым, прадстаўнікі грамадскасці не атрымалі дазволу прысутнічаць на пасяджэннях органаў, што фарміравалі гэтыя камісіі.

Падчас разгляду прапаноў аб уключэнні ў камісіі прэтэндэнтаў выканаўчыя камітэты фактычна зацвярджалі падрыхтаваныя спісы без аналізу і абмеркавання вылучаных кандыдатур.

Адсутнасць заканадаўча дакладна вызначаных крытэрыяў пры ўключэнні ў склад камісій у сукупнасці з працэдурамі іх фарміравання дазваляе органам, якія іх ствараюць, маніпуляваць складам камісій.

УВК сфарміраваныя практычна без уліку інтарэсаў апазіцыі, што не дае дастатковых гарантый іх самастойнасці і незалежнасці ад органаў, якія іх сфарміравалі.

# IV. АГІТАЦЫЯ

Назіральнікі адзначаюць, што выбары слаба асвятляліся дзяржаўнымі СМІ. Матэрыялы аб выбарчай кампаніі ўяўлялі сабой пераважна афіцыйную інфармацыю ці схаваную/яўную агітацыю за праўладных кандыдатаў. Жывога абмеркавання, публіцыстычнай палемікі ці дыялогу напярэдадні выбараў у галоўны орган заканадаўчай улады ў беларускім грамадстве не назіралася.

У перыяд агітацыі ў краіне быў праведзены адзіны дзень палітінфармавання на тэму: «Грамадска-палітычная і сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў Беларусі напярэдадні парламенцкіх выбараў». У матэрыялах да адзінага дня палітінфармавання, размешчаных на сайтах дзяржаўных органаў, указвалася на важнасць правядзення парламенцкіх выбараў у краіне. Ацэнка прадстаўнікоў апазіцыі і іх дзейнасці была стрымана негатыўнай (указвалася на невысокі рэйтынг прадстаўнікоў апазіцыі ў насельніцтва). Асноўнае значэнне надавалася фактару пераемнасці стабільнасці ў дзяржаве.

Афіцыйныя СМІ апублікавалі рашэнні мясцовых органаў улады «Аб устанаўленні месц размяшчэння перадвыбарчых матэрыялаў да выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь» і «Аб вызначэнні памяшканняў для сустрэч кандыдатаў у дэпутаты ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь з выбаршчыкамі».

Паводле ацэнкі назіральнікаў, у большасці рэгёнаў месцы, вылучаныя для размяшчэння агітацыйных матэрыялаў, не давалі дастатковых магчымасцей для агітацыі кандыдатаў. Аднаго «афіцыйнага» месца на ўчастак было недастаткова, а для выкарыстання плошчаў магазінаў, прадпрыемстваў і ўстаноў патрабавалася ўзгадненне з іх кіраўнікамі, што таксама ўскладняла правядзенне перадвыбарчай агітацыі.

Паводле звестак назіральнікаў па Брэсцкай-Заходняй выбарчай акрузе № 1 і Брэсцкай-Усходняй выбарчай акрузе № 3, месцы для размяшчэння агітацыйных матэрыялаў, пералік якіх быў зацверджаны 21.08.2008 Адміністрацыямі Ленінскага і Маскоўскага раёнаў г. Брэста, фактычна з'явіліся выбарчымі ўчасткамі (адно дадатковае, як правіла, было адведзена ў магазіне). Гэта сітуацыя істотна абмежавала правы кандыдатаў у дэпутаты нават у параўнанні з выбарамі 2004 г., паколькі ў 2004 г. у рашэнні Адміністрацыі меўся пункт, у якім указвалася, што са згоды кіраўніцтва прадпрыемстваў і ўстаноў дазваляецца размяшчэнне агітацыйных матэрыялаў

на тэрыторыях гэтых прадпрыемстваў і ўстаноў. У рашэнні 2008 г. такога пункта ўжо не было.

У Слуцкай выбарчай акрузе № 74 спіс месц для размяшчэння агітацыйнай прадукцыі, надрукаваны ў газеце «Слуцкі край» (22.08.2008), уключаў 3 інфармацыйныя шчыты,10 інфармацыйных тумб, інфармацыйныя стэнды на ўчастках для галасавання і інш. Аднак некаторыя названыя ў газеце інфармацыйныя шчыты і тумбы напярэдадні пачатку агітацыі не існавалі ўжо па некалькі год: напрыклад, інфармацыйны шчыт па вул. Сацыялістычнай, д. 129, і інфармацыйная тумба па вул. Сацыялістычнай, д. 116, і інш.

У шэрагу населеных пунктаў Белавежскай выбарчай акругі № 8 (в. Камянец, в. Высокае, в. Дзмітравічы, в. Відомля ды інш.) на ўчастках для галасавання назіральнікамі не было знойдзена ніводнага спецыяльна абсталяванага інфармацыйнага стэнда. У пастанове Камянецкага райвыканкама ад 19.08.2008 няма пераліку ўстаноў і арганізацый, дзе ёсць такія стэнды. На запыт кандыдата ў дэпутаты па Белавежскай выбарчай акрузе № 8 Валянціна Лазарэнкава ні старшыня і члены акруговай выбарчай камісіі, ні адказная асоба райвыканкама І. Нігерыш не здолелі канкрэтна ўказаць месцы ў акрузе, дзе ёсць абсталяваныя стэнды.

## Вызначэнне памяшканняў для сустрэч кандыдатаў з выбаршчыкамі

Праблема вызначэння памяшканняў для сустрэч кандыдатаў з выбаршчыкамі ў многіх выпадках не дазваляла кандыдатам разгарнуць шырокую кампанію сустрэч з выбаршчыкамі.

У Пінскай гарадской выбарчай акрузе № 14 для сустрэч кандыдатаў з выбаршчыкамі былі вызначаны тры памяшканні, якія знаходзяцца практычна ў цэнтры горада (ГДК, кінатэатр «Перамога» і ДК «Трыкатажнік»). Ніводнага месца для сустрэч не вызначана ў такіх густанаселеных раёнах горада, як Заходні мікрараён, Альбрэхтова, раён вуліц Ракасоўскага і Кляшчова, а таксама раён гарадской бальніцы і парка. Па ацэнках назіральнікаў, падобнае размеркаванне магло служыць рэальнай перашкодай для сустрэч кандыдата са сваімі выбаршчыкамі. Акрамя таго, два памяшканні, вылучаныя для сустрэч у Пінскай сельскай выбарчай акрузе № 15, знаходзіліся недалёка ад межаў Пінскай гарадской выбарчай акругі № 14, што таксама магло служыць фактарам ускладнення перадвыбарчай агітацыі.

У Брэсцкай-Заходняй выбарчай акрузе № 1 Брэсцкі гарвыканкам зацвердзіў 15 месц для сустрэч кандыдатаў з выбаршчыкамі, пераважна, школы. Гэта не стварыла дастатковых умоў для правядзення паўнавартаснай агітацыі сярод больш за 60 000 выбаршчыкаў. Пры гэтым у рашэнні выканкама ўказваецца, што сустрэчы з выбаршчыкамі, якія арганізуюцца па-за вызначанымі памяшканнямі, неабходна праводзіць у адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «О массовых мероприятиях» і рашэннем Брэсцкага гарвыканкама ад 25.10. 2006 г. № 1715 «Об определения постоянного места проведения массовых мероприятий в городе Бресте». У выніку адзіным месцам для сустрэч кандыдатаў з выбаршчыкамі Брэсцкай-Заходняй выбарчай акругі № 1, акрамя пералічаных 15, стаў стадыён «Лакаматыў». Аднак ён знаходзіцца на тэрыторыі іншай выбарчай акругі.

## Схаваная агітацыя праз дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі

Дзяржаўныя СМІ відавочна працавалі на праўладных кандыдатаў. Кандыдаты ад апазіцыі маглі размясціць у СМІ толькі сваю праграму, што непасрэдна прадугледжана ВК. Грамадска-палітычная газета «Слуцкі край» сістэматычна змяшчала хвалебныя артыкулы пра дзейнасць першага сакратара Слуцкага гаркама БРСМ Інэсы Кляшчук (29.07.2008, 12 і 25.08.2008, 2 і 19.09.2008). Матэрыялы пачалі з'яўляцца да моманту афіцыйнай рэгістрацыі І. Кляшчук у якасці кандыдата па Слуцкай выбарчай акрузе № 74. Назіральнікамі былі пададзены скаргі на рэдакцыю газеты ў Слуцкі райвыканкам па фактах агітацыі да афіцыйнай рэгістрацыі. У адказах слуцкага гарвыканкама значыцца, што парушэнняў выбарчага заканадаўства ў дадзеных выпадках не выяўлена.

Грамадска-палітычная газета Брэсцкай вобласці «Заря» (№ 84 ад 31.07.2008) у рубрыцы «Руководить – не руками водить» змяшчае вялікую публікацыю пад назвай «Любить людей – и воздастся» пра прэтэндэнта на кандыдацкі мандат па Пінскай гарадской выбарчай акрузе № 14, дырэктара ПУП «ЭлКис» ГА «БелТІЗ» Зінаіду Мандроўскую. Як дэпутат гарадскога Савета народных дэпутатаў З. Мандроўская часта фігуравала на рэдакцыйных старонках мясцовай прэсы, як напрыклад, у матэрыяле пра прыезд дэлегацыі Краснагвардзейскага раёна Санкт-Пецярбурга ў г. Пінск («Пінскі веснік», № 66 ад 26.08.2008), пра віншаванне работнікаў гандлю («Пінскі веснік», № 58 ад 29.07.2008). У пачатку навучальнага года газеты «Пінскі веснік» (№ 67,68), «Полесская

правда» (№ 71) рэгулярна асвятлялі актыўнасць З. Мандроўскай у сферы адукацыі: яе выступленне на гарадской нарадзе настаўнікаў, удзел у адкрыцці гарадскога музея маці, прычым асвятлялася яе дзейнасць як дзейнасць кандыдата ў дэпутаты. Па звестках назіральнікаў, на гарадской нарадзе настаўнікаў кіраўніцтва гарадскога аддзела адукацыі звярталася да іх з просьбай падтрымаць З. Мандроўскую на выбарах. Апаненты З. Мандроўскай – Яўген Перац, кандыдат ад ПКБ, і незалежны кандыдат Валянцін Уласюк – знаходзіліся ў няроўных канкурэнтных умовах.

Грамадска-палітычная газета Пінскага раёна «Полесская правда» (№ 61 ад 06.08.2008) у рубрыцы «Люди земли полесской» змясціла артыкул пра Канстанціна Шэўчыка, патэнцыйнага кандыдата па Пінскай сельскай акрузе № 15. Цэлы блок матэрыялаў аб дзейнасці супрацоўнікаў трэста ААТ «Пинсксовхозстрой», якім кіруе К. Шэўчык, пад назвай «Жить, чтобы строить, и строить, чтобы жить» надрукаваны ў гэты ж дзень у газеце «Заря» (№ 88 ад 09.09.2008). На этапе передвыбарчай агітацыі газеты «Пінскі веснік» і «Полесская правда» апублікавалі вялікія матэрыялы, прысвечаныя 40-годдзю трэста «Пинсксовхозстрой», больш за палову з якіх асвятляюць дзейнасць генеральнага дырэктара трэста, адзінага кандыдата ў дэпутаты па Пінскай сельскай выбарчай акрузе № 15 Канстанціна Шэўчыка.

Газета «Слонимский вестник» (12.08.2008) змясціла на першай старонцы матэрыял пра старшыню Слонімскага райвыканкама, кандыдата ў дэпутаты па Слонімскай выбарчай акрузе № 58 Мечыслава Касцюка, які ўручае камбайнёрам грашовыя прэміі. М. Касцюк таксама фігуруе на старонках газеты «Слонимский вестник» (13.08.2008) і «Газеты слонімскай» (20.08.2008) з нагоды адкрыцця ў Слоніме цэнтра прадаж і абслугоўвання Velcom. Пра рэгістрацыю М. Касцюка і І. Шэгі ў якасці кандыдатаў па Слонімскай выбарчай акрузе № 58 «Слонимский вестник» напісаў 30.08.2008. У гэтым жа нумары справаздача аб раённай педагагічнай нарадзе з фотаздымкам М. Касцюка, які віншуе настаўнікаў. Незадоўга да гэтага «Газета Слонимская» (27.08. 2008) надрукавала артыкул «Не рабі дабра – не атрымаеш зла» пра тое, як таварыства інвалідаў паскардзілася ў акруговую камісію № 58 на апанента старшыні Слонімскага райвыканкама – Івана Шэгу. Артыкул носіць тэндэнцыйна негатыўны характар.

Ганцавіцкая раённая газета «Советское Полесье» (№ 69 ад 30.08.2008) апублікавала на першай старонцы паведамленне аб рэгістрацыі кандыдата па Івацэвіцкай выбарчай акрузе № 11, генеральнага дырэктара ДУВП «Ивацевичское ЖКХ» Леаніда Кавалевіча.

Л. Кавалевіч застаўся адным прэтэндэнтам у дэпутаты пасля таго, як другі спаборнік – Мікалай Навумік з Ганцавіцкага раёна – адмовіўся ад удзелу ў выбарах. М. Навумік не стаў забіраць падпісныя лісты з акруговай камісіі, патлумачыўшы ў прыватнай размове, што на яго аказваецца ўціск з боку дырэктара рыбгаса «Лактышы» – прадпрыемства, дзе ён працуе.

Пасля рэгістрацыі кандыдата Л. Кавалевіча па Івацэвіцкай выбарчай акрузе № 11 у раёне не назіралася ніякай актыўнасці.

З канца ліпеня раённая газета «Мёрскія навіны» пачала актыўна пісаць пра Уладзіміра Скавародку, патэнцыйнага кандыдата ў дэпутаты па Мёрскай выбарчай акрузе № 24, дэпутата Палаты прадстаўнікоў. Газета «Дзвінская праўда» (№ 64 ад 01.08.2008) палову нумара прысвяціла У. Скавародку і яго аўтарытэту сярод жыхароў Верхнядзвінскага раёна. Апанент названага кандыдата па Мёрскай выбарчай акрузе № 24 Віктар Шульга, кандыдат ад АГП, знаходзіўся ў няроўных канкурэнтных умовах.

На працягу жніўня «Оршанская газета» апублікавала два артыкулы дэпутата Палаты прадстаўнікоў Уладзіміра Жвікава, у якіх ён падкрэслівае значную ролю начальніка беларускай чыгункі Уладзіміра Жарэлы ў развіцці Аршанскага чыгуначнага вузла. Падчас прамой лініі на мясцовай радыёстанцыі «СКІФ» 12.08.2008 У. Жарэла паабяцаў за кошт сродкаў свайго ведамства да 2010 г. пабудаваць у Оршы лядовы палац. Апанент У. Жарэлы па Аршанскай гарадской выбарчай акрузе № 26, кандыдат ад АГП Уладзімір Юржыц таксама, на думку назіральнікаў, не мог прадстаўляць рэальнай альтэрнатывы праўладнаму кандыдату.

Полацкая аб'яднаная газета «Полацкі веснік» 19.08.2008 змясціла аб'яву аб выступленні на FM-радыё «Европа-Плюс-Полоцк» намесніка старшыні Віцебскага аблвыканкама Пятра Южыка, які толькі 18.08.2008 падаў дакументы ў АВК на рэгістрацыю яго ў якасці кандыдата па Полацкай гарадской выбарчай акрузе № 28. «Полацкі веснік» змясціў інфармацыю аб тым, што ў газеце будзе апублікавана расшыфроўка эфіра з П. Южыкам. Абласная газета «Народнае слова» надрукавала інтэрв'ю з П. Южыкам аб'ёмам амаль на старонку. У матэрыяле сцвярджаецца, што менавіта намаганнямі намесніка старшыні Віцебскага аблвыканкама полацкія помнікі архітэктуры – Сафійскі сабор і Свята-Прэабражэнская царква – былі ўнесены ў спіс ЮНЭСКА.

Задоўга да пачатку этапа агітацыі дзяржаўныя СМІ Наваполацка пачалі змяшчаць матэрыялы пра кандыдата па Наваполацкай выбарчай акрузе № 25, галоўнага ўрача дзіцячай паліклінікі Іну Антонаву. Яе выступленні гучалі ў праграме мясцовага дзяржаўнага тэлебачання

«Вектар-ТВ» у рубрыцы «Грамадская прыёмная». Выбары ў названай акрузе былі безальтэрнатыўнымі.

Шэраг нумароў чашніцкай раённай газеты «Чырвоны прамень» выходзілі з матэрыяламі аб працоўнай і арганізацыйнай дзейнасці старшыні Чашніцкага райвыканкама, кандыдата ў дэпутаты па Лепельскай выбарчай акрузе № 23 Анфіма Міхалевіча. Пры гэтым апанент А. Міхалевіча – Таццяна Садоўская – не ўзгадвалася ні ў адной з публікацый.

У перыяд перадвыбарчай агітацыі СМІ рэгулярна змяшчалі артыкулы, у якіх наогул негатыўна асвятлялася дзейнасць апанентаў улады. Напрыклад, газета «Слонимский вестник» (№ 107 ад 17.09.2008) змясціла матэрыял пад назвай «Оппозиционные партии политически несостоятельны». У артыкуле «Выбор Париса» («Заря» № 97 ад 30.08.2008) прозвішчы канкрэтных кандыдатаў не называліся, аднак указваліся прозвішчы лідэраў, з якімі асацыюецца тая ці іншая партыя: З. Пазняк, с. Шушкевіч, А. Лябедзька. Рэзкім нападкам падвяргаліся рэкамендацыі БДІПЧ/АБСЕ ў артыкуле «Шаг назад в демократизации выборов», апублікаваным без указання аўтарства ў «Аршанскай газеце» (25.09.2008) ды інш.

## Агітацыя праз дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі

Назіральнікі заўважылі тэндэнцыю невыкарыстання некаторымі праўладнымі кандыдатамі магчымасцей перадвыбарчай агітацыі па радыё і тэлебачанні. У Маладзечанскай сельскай выбарчай акрузе № 71 Уладзімір Сінякоў, начальнік галоўнага ўпраўлення кадравай палітыкі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, адмовіўся ад выступленняў па радыё і на тэлебачанні. У газеце «Молодечненская газета» (06.09.2008) была размешчана яго перадвыбарчая праграма.

У дзяржаўных СМІ агітацыя ажыццяўлялася, як сведчыць назіранне, не заўсёды ў межах выбарчага заканадаўства. Зафіксаваны выпадкі перашкод радыётрансляцыі зваротаў кандыдатаў у дэпутаты да сваіх выбаршчыкаў.

Падчас радыётрансляцыі выступлення кандыдата па Сенненскай выбарчай акрузе № 30, члена ПКБ Сяргея Вазняка 09.09.2008 ад радыёэфіра былі адключаны радыёкропкі Варанцэвіцкага сельсавета і пасёлка Усвіж-Бук Талачынскага раёна. У выніку гэтага каля тысячы выбаршчыкаў былі пазбаўлены магчымасці пазнаёміцца з праграмай прадстаўніка ПКБ. АВК Сенненскай выбарчай акругі № 30, якую ўзначальваў Уладзімір Сыраваткін, адмовіла заяўніку ў паўторным радыёвыступленні.

05.09.2008 падчас тэлевізійнага звароту кандыдата ў дэпутаты па Віцебскай-Чыгуначнай выбарчай акрузе А. Левінава часткова знік гук (трансляцыя ішла ў запісе). «Нямое» выступленне перадавалася тады, калі кандыдат крытыкаваў структуры ўлады.

У шэрагу рэгіёнаў пры трансляцыі па тэлебачанні выступленняў кандыдатаў назіральнікі заўважалі, што кандыдаты ад АДС і незалежныя кандыдаты чыталі свае тэксты з паперы, а кандыдаты, якіх падтрымлівае ўлада, мелі магчымасць карыстацца суфлёрам (электронным экранам, усталяваным перад прамоўцам і незаўважным для гледача). У выніку, іх выступленні мелі больш станоўчае ўздзеянне на гледачоў.

Мелі месца шматлікія выпадкі цэнзуравання выступленняў і праграм кандыдатаў у дэпутаты.

З фактамі цэнзурных перашкод і рэдагавання ўласных агітацыйных плакатаў сутыкнулася кандыдат у дэпутаты па Магілёўскай-Кастрычніцкай выбарчай акрузе № 86 Наталля Зайцава. Без яе згоды ў тэкст былі ўнесены змены: выключана інфармацыя аб тым, што прычынай беспрацоўнасці Н. Зайцавай стаў Указ № 760, паводле якога ў індывідуальных прадпрымальнікаў забараняецца працаваць не яго сваякам; вылучаны словы «часова не працуе»; выключана інфармацыя пра бацьку-ветэрана працы і дзеда-падпольшчыка ў гады вайны. Падчас вырабу матэрыялаў у прыватнай друкарні ІП Гардзіенка ёй настойліва прапаноўвалі замяніць колеры фону плаката з бела-чырвонага на зялёны. Большасць улётак была зроблена са значным спазненнем.

Кандыдат у дэпутаты па Бабруйскай-Ленінскай выбарчай акрузе № 78 Алена Мядзведзева сутыкнулася з неабходнасцю шматразова пацвярджаць надрукаваныя ў перадвыбарчым плакаце факты біяграфіі. Нягледзячы на дакументальныя пацвярджэнні, старшыня АВК Мікалай Плаксіцкі не пагаджаўся ўнесці карэктывы, якія датычацца месца працы кандыдата ў дэпутаты. Толькі пасля санкцыі начальніка ідэалагічнага аддзела Бабруйскага гарвыканкама Аляксандра Маркачова стала магчымым паправіць тэкст біяграфіі А. Мядзведзевай.

У інфармацыйных матэрыялах аб кандыдаце ў дэпутаты па Бабруйскай-Першамайскай выбарчай акрузе № 79 Міхаіле Кавалькове былі памылкі ў біяграфічных звестках і ў назве месца працы і пасады, якую ён займае. На думку М. Кавалькова, не выключана, што скажэнні былі зробленыя наўмысна, бо старшыня АВК Віктар Гарбанёў на папярэдніх выбарах перадузята ставіўся да незалежных і апазіцыйных кандыдатаў. Толькі пасля скаргі М. Кавалькова ў ЦК у яго аўтабіяграфічныя звесткі былі ўнесены змены.

Кандыдату па Віцебскай-Чкалаўскай выбарчай акрузе № 18 Аляксею Гаўруцікаву рэдакцыя газеты «Витьбичи» настойліва прапаноўвала зняць з перадвыбарчай праграмы ацэнку заклікаў галасаваць датэрмінова, а таксама некаторыя іншыя публіцыстычныя радкі. А. Гаўруцікаў здолеў адстаяць сваю пазіцыю толькі па праблеме датэрміновага галасавання.

Супрацоўнікі Горацкага райвыканкама патрабавалі ад кандыдата па Горацкай выбарчай акрузе № 81 Андрэя Юркова змяніць тэкст праграмы, выкрэсліўшы абяцанні вырашыць сацыяльныя праблемы рэгіена, а таксама дапісаць у біяграфіі, што ен з'яўляецца беспрацоўным.

Праграма Леаніда Арлова, члена АГП, кандыдата па Мазырскай выбарчай акрузе № 42, пасля публікацыі ў раённай газеце «Жыццё Палесся» істотна змянілася ў параўнанні з праграмай, надрукаванай ва ўлётцы, і той, што прагучала ў тэлевыступленні: з яе амаль цалкам зніклі пастаўленыя Л. Арловым вострыя праблемы, якія хвалююць жыхароў горада Мазыра. 19.09.2008 АВК Мазырскай выбарчай акругі № 42 прыняла рашэнне вынесці пісьмовае папярэджанне кандыдату Л. Арлову за некарэктнасць вядзення перадвыбарчай агітацыі. Абмеркаванне зместу друкаванай агітацыйнай прадукцыі кандыдата звялося да прызнання членамі АВК фактаў, выкладзеных у агітацыйных матэрыялах кандыдата. Аднак пры гэтым была прызнана немагчымасць вырашэння сацыяльна-эканамічных праблем рэгіёну. Таму крытыка мясцовых улад з боку Л. Арлова, на думку членаў Мазырскай АВК, з'явілася неабгрунтаванай.

У Слуцкай выбарчай акрузе № 74 падчас друку агітацыйных матэрыялаў кандыдата Анатоля Юрэвіча былі спробы з боку службовых асоб зняць з яго агітацыйных улётак заклік «Голосуй только 28 сентября!». Лозунг усё ж патрапіў на перадвыбарную агітацыйную ўлётку А. Юрэвіча, але толькі пасля ўмяшальніцтва ў справу старшыні АВК Аляксандра Андрушкевіча. Падчас падрыхтоўкі да запісу тэлевыступлення А. Юрэвіча ў студыі знаходзіўся невядомы чалавек, які адрэкамендаваўся супрацоўнікам Белтэлерадыёкампаніі і папрасіў даць для прагляду тэкст выступлення. Пасля папрасіў змяніць яго. Кандыдат у дэпутаты змяніць тэкст свайго выступлення адмовіўся.

Кандыдату ў дэпутаты па Салігорскай выбарчай акрузе № 76 Ларысе Насановіч адмовілі ў публікацыі яе агітацыйных матэрыялаў у салігорскай раённай газеце «Шахцёр». Сітуацыя была справакаваная тым, што Л. Насановіч у сваім выступленні па радыё «Сталіца» 17.09.2008 паведаміла грамадскасці пра тое, што галоўны рэдактар газеты Салігорскага райвыканкама «Шахцёр» Вольга Капцэвіцкая

доўгі час здзяйсняла дзеянні, якія кваліфікуюцца як крадзеж шляхам злоўжывання службовым становішчам. Рэдактар была прыцягнута да крымінальнай адказнасці, пры гэтым ад сваёй пасады не была звольнена, а працягвала працаваць, помсцячы тым, хто на яе скардзіўся. (Рэзананс прамовы Л. Насановіч прывёў да чаканага зняцця з пасады В. Капцэвіцкай на другі дзень пасля выступлення кандыдата па радыё). Пытанне было вырашана пасля ўмяшання старшыні АВК Міхаіла Якімовіча.

### Перашкоды пры вырабе агітацыйнай прадукцыі

Даволі часта апазіцыйныя і незалежныя кандыдаты сутыкаліся з перашкодамі пры вырабе і распаўсюджванні ўласнай агітацыйнай прадукцыі.

Кандыдату па Асіповіцкай выбарчай акрузе № 89 Вячаславу Шэлегу РУП «Бобруйская ўкрупненная типография им. А. Т. Непогодина» адмовіла ў вырабе друкаванай прадукцыі, скасаваўшы ў аднабаковым парадку дамову. У прыватнай гутарцы адзін з супрацоўнікаў друкарні паведаміў В. Шэлегу, што кіраўніцтву было забаронена друкаваць прадукцыю незалежным і апазіцыйным кандыдатам. Агітацыйныя матэрыялы В. Шэлега са спазненнем былі зроблены ў г. Гомелі.

Кандыдат па Бабруйскай-Ленінскай выбарчай акрузе № 78 Алена Мядзведзева замовіла агітацыйныя матэрыялы ў ТАА «Имидж» г. Бабруйска, дзе ўжо друкавалі ў той час свае праграмы праўладныя кандыдаты. Замова было аформлена і аплачана. Аднак кіраўнік ТАА «Имидж» паведаміў А. Мядзведзевай, што ў сувязі з гэтым у яго ўзнікла пагроза закрыцця фірмы. Толькі пасля звароту кандыдата да старшыні АВК Мікалая Плаксіцкага і яго ўмяшальніцтва замова была выкананая.

Кандыдат па Віцебскай-Чыгуначнай выбарчай акрузе № 19 Ігар Каныгін замовіў агітацыйныя матэрыялы ў прыватнай друкарні г. Віцебска. Не паспеў унесці аплату, як яму паведамілі па тэлефоне, што вышэйшае кіраўніцтва дало друкарні ўказанне не выконваць замову І. Каныгіна. Прадукцыю надрукавалі ў іншым месцы. Аднак кандыдат страціў час перадвыбарчай агітацыі.

Андрэй Левінаў, кандыдат па гэтай жа Віцебскай-Чыгуначнай выбарчай акрузе № 19, таксама атрымаў адмову друкаваць тэкст яго звароту да выбаршчыкаў. У прыватнай друкарні ад яго запатрабавалі пісьмовае ўзгадненне з АВК і выдаленне са звароту некаторых вострых тэзісаў. Кандыдат А. Левінаў вымушаны быў пагадзіцца.

Анатоль Лябедзька, кандыдат па Старавіленскай выбарчай акрузе № 105, Аляксандр Дабравольскі, кандыдат па Свіслацкай выбарчай акрузе № 94, Валянціна Палевікова кандыдат па Купалаўскай выбарчай акрузе № 95, Аляксандр Багданкевіч, кандыдат па Чкалаўскай выбарчай акрузе № 96, Людміла Гразнова, кандыдат па Партызанскай выбарчай акрузе № 110 заключылі пагадненне надрукаваць сваю агітацыйную прадукцыю ў спецыяльным выпуску газеты «Народная воля». Спецыяльны нумар быў надрукаваны і распаўсюджаны сярод выбаршчыкаў.

У той жа час некаторыя кандыдаты ад апазіцыі паведамлялі, што іх выступленні падвяргаліся цэнзуры ў меншай ступені, чым на папярэдніх парламенцкіх выбарах. Рэдакцыя газеты «Вечерний Брест» 19.09.2008 упершыню арганізавала «круглы стол» з удзелам усіх кандыдатаў у дэпутаты па г. Брэсту. Кандыдат ад АДС І. Маслоўскі адзначаў, што, перш чым публікаваць матэрыялы дыскусіі, рэдакцыя газеты дала магчымасць самому І. Маслоўскаму і кандыдату ў дэпутаты А. Ляўковічу пазнаёміцца з рэдакцыйнай праўкай. Абодва кандыдаты ад АДС лічаць, што іх выступленні не падвяргаліся цэнзуры. Матэрыялы дыскусіі былі апублікаваныя 26.09.2008 накладам 30 000 экзэмпляраў.

Завочныя дэбаты кандыдатаў у дэпутаты правяла недзяржаўная баранавіцкая газета «Intex-press» (№ 38 ад 18.09.2008). Але дэпутат Палаты прадстаўнікоў, кандыдат ад улады па Баранавіцкай-Заходняй выбарчай акрузе № 5 Анатоль Ванькові‌ч адмовіўся ад удзелу ў завочных дэбатах, якія праводзіла газета.

### Ціск на кандыдатаў і іх каманды

Пасля рэгістрацыі па Бабруйскай сельскай выбарчай акрузе № 80 Алеся Чыгіра, намесніка галоўнага рэдактара незалежнай газеты «Рэкламны кур'ер», рэдакцыю газеты наведалі дзве пазачарговыя праверкі – з Фонда сацыяльнай абароны насельніцтва і Белдзяржстраха. Парушэнняў не было выяўлена. Аднак Міністэрства інфармацыі вынесла газеце два папярэджанні па трох артыкулах Закона «Аб сродках масавай інфармацыі». Калектыў газеты і назіральнікі выразілі думку, што папярэджанні былі вынесеныя на фармальных падставах і такім чынам ажыццяўляўся ціск на Алеся Чыгіра, чыім канкурэнтам па Бабруйскай сельскай выбарчай акрузе № 80 быў намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Глаз.

Падчас агітацыі 10.09.2008 за Андрэя Бандарэнку, кандыдата па Асіповіцкай выбарчай акрузе № 89, якую праводзіў жыхар Клічаўскага раёна Сяргей Сманцар, супрацоўнікі Клічаўскага РАУС спрабавалі

канфіскаваць агітацыйныя матэрыялы. Кандыдат у дэпутаты А. Бандарэнка пасля прыбыцця на месца здарэння здолеў высветліць, што каманда канфіскаваць агітацыйныя матэрыялы сыходзіла ад службовых асоб Клічаўскага РАУС. Па факту былі пададзены скаргі ў ЦК, МУС, пракуратуру. Назіральнікі звязваюць забарону на правядзенне агітацыі ў Клічаўскім раёне з тым, што другім кандыдатам па Асіповіцкай выбарчай акрузе № 89 быў старшыня Клічаўскага райвыканкама Сяргей Крыжэвіч.

Назіральнікі неаднаразова фіксавалі факты выкарыстання няроўных магчымасцей пры размячшэнні візуальных агітацыйных матэрыялаў.

Як паведаміла прадпрымальнік Т. Фурсава, у яе магазін, які знаходзіцца ў г. Крычаве, на тэрыторыі Крычаўскай выбарчай акругі № 83, заходзіла Людміла Галаўнёва, дырэктар філіяла ААТ «Беларусбанк», прыносіла агітацыйныя матэрыялы за кандыдата Тамару Белкіну, патрабуючы змясціць іх на відных месцах. Т. Белкіна з’яўляецца начальнікам аддзела па ідэалагічнай рабоце дзяржаўнай установы матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння Упраўлення справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Сустрэўшы непаразуменне з боку прадаўцоў, Л. Галаўнёва на наступны дзень прыслала загадчыцу сектарам гандлю і паслуг аддзела эканомікі Ірыну Пруднікаву, якая зноў запатрабавала змясціць плакаты Т. Белкінай на вітрынах магазіна. Наогул, у перыяд перадвыбарчай агітацыі матэрыялы Т. Белкінай у вялікай колькасці знаходзіліся ў найбольш людных месцах.

Колькасць матэрыялаў апанента Т. Белкінай, члена АГП Сяргея Няроўнага, была значна меншая. Рэсурсы кандыдатаў, паводле сцвярджэння назіральнікаў, былі папросту несупастаўляльныя.

Кандыдат па Белавежскай выбарчай акрузе № 8 Валянцін Лазарэнкаў 1.09.2008 звярнуўся да загадчыкаў магазінаў патрэбкааперацыі, якія складаюць не менш за 80 % ад колькасці магазінаў у раёне, з просьбай размясціць на плошчы магазінаў свае перадвыбарчыя плакаты. У выніку было размешчана больш за 50 плакатаў. Пры аб’ездзе акругі 8 верасня В. Лазарэнкаў выявіў, што захавалася толькі 3 плакаты. На яго просьбу патлумачыць гэты факт старшыня АВК Белавежскай выбарчай акругі № 8 В. Грыцук паведаміў, што распараджэнне аб зняцці плакатаў у магазінах было дадзена службовай асобай Камянецкага райвыканкама ў адпаведнасці з рашэннем выканкама ад 19.08.2008. З аналагічнай праблемай сутыкнуўся яшчэ адзін кандыдат па Белавежскай выбарчай акрузе № 8 Васіль Вавранюк. Па яго словах, з 18.09.2008 у некаторых вёсках і сельскіх магазінах адмаўляліся размяшчаць яго агітацыйную прадукцыю.

Агітацыя праз друкаваныя агітацыйныя матэрыялы ў шэрагу выбарчых акругаў праводзілася з шырокім выкарыстаннем адміністрацыйнага рэсурсу. Мелі месца неаднаразовыя маніпуляцыі прадстаўнікоў улады, якія стваралі няроўныя ўмовы перадвыбарчай барацьбы. Праўладныя кандыдаты мелі ўсе магчымасці развешваць свае перадвыбарчыя плакаты ў шматлюдных публічных месцах – магазінах, дзяржаўных установах, на прадпрыемствах.

У перыяд агітацыі неаднаразова назіраліся факты, якія можна ацэньваць як няроўныя ўмовы правядзення агітацыйнай кампаніі.

Так, 27.08.2008 на тэрыторыі завода масавых шын ААТ «Белшына» з’явіліся перадвыбарчыя плакаты Уладзіміра Карпяка, галоўнага інжынера гэта ж прадпрыемства. На 27.08.2008 У. Карпяк яшчэ не быў зарэгістраваны ў якасці кандыдата па Бабруйскай-Першамайскай выбарчай акрузе № 79.

У Гродзенскай-Паўночнай выбарчай акрузе № 51 загадчыкі магазінаў, аптэк, паштовых аддзяленняў, дзе ў цэнтралізаваным парадку былі вывешаны агітацыйныя плакаты кандыдата ад улады Марыны Рэмшы, толькі пасля працяглых кансультацый са сваім начальствам пагаджаліся размясціць адпаведныя плакаты Яраслава Раманчука. А адміністрацыя рынку «Карона» так і не прадаставіла Я. Раманчуку такой магчымасці, спаслаўшыся на тое, што штаб Я. Раманчука павінен прадаставіць ім з Адміністрацыі Ленінскага раёна г. Гродна спецыяльны дазвол.

Кандыдату па Магілёўскай-Ленінскай выбарчай акрузе № 84 Ігару Каваленку не дазволілі размясціць свае агітацыйныя плакаты ў магазіне «Евросеть», у кавярні «Саломінка» г. Магілёва. Хаця плакаты іншага кандыдата – Уладзіміра Васіленкі, начальніка аднаго з аддзелаў ААТ «Магілёўхімвалакно», там знаходзіліся.

У магазіне в. Сялец Магілёўскага раёна, якая належыць Магілёўскай сельскай выбарчай акрузе № 88, адмовіліся размясціць плакат кандыдата Уладзіміра Новікава, матывуючы гэта тым, што патрэбна згода кіраўніцтва. Пры гэтым плакат яго апанента – старшыні Магілёўскага райвыканкама Аляксандра Разганава – вісеў на стэндзе.

Назіральнікамі зафіксаваны шматлікія выпадкі, калі ў час правядзення датэрміновых выбараў на ўчастках наогул адсутнічалі плакаты з інфармацыяй пра некаторых кандыдатаў. Напрыклад, на выбарчых участках Мінскай-Усходняй выбарчай акругі № 107 былі толькі плакаты з агульнай інфармацыяй пра ўсіх кандыдатаў. На ўчастках № 28, 39 адсутнічалі агітацыйныя матэрыялы кандыдата Віталія Бусько, на ўчастку № 17 не было агітацыі кандыдата Віктара Кавальчука. Плакаты

кандыдата Эдуарда Кузняцова, намесніка ўпраўляючага ААТ «Белагропромбанк», знаходзіліся ўсюды.

Давераным асобам кандыдата па Брэсцкай-Заходняй выбарчай акрузе № 1, старшыні БСДП(Г) Анатоля Ляўковіча ў многіх месцах акругі (магазіны, аптэкі) адмаўлялі ў размяшчэнні агітацыйных матэрыялаў. Пры гэтым матэрыялы яго канкурэнта Алега Вялічкі прысутнічалі амаль усюды. Не прадаставіла месца кандыдату А. Ляўковічу і адміністрацыя «Цэнтральнага рынка» г. Брэста. На сустрэчы 13.09.2008 кандыдата ў дэпутаты з дырэктарам «Цэнтральнага рынка» Д. Глушынскім, падчас якой А. Ляўковіч указаў на наяўнасць агітацыйных матэрыялаў іншага кандыдата, дырэктар рынка пагадзіўся размясціць плакаты А. Ляўковіча. Аднак ні адзін з плакатаў, пакінутых кандыдатам ад АДС у дастатковай колькасці, так і не з'явіўся на гарадскім рынку г. Брэста. А. Ляўковіч 14.09.2008 вусна звярнуўся да старшыні акруговай камісіі Брэсцкай-Заходняй выбарчай акругі № 1 Г. Жук і папрасіў яе ўмяшацца ў сітуацыю. Аднак старшыня акруговай камісіі не здолела забяспечыць роўныя ўмовы для правядзення агітацыі ў сваёй акрузе. А. Ляўковіч 15.09.2008 даслаў пісьмовую скаргу ў АВК, ЦК, назіральнікам ад АБСЕ і СНД.

Перадвыбарчую праграму Анатоля Ляўковіча адмовілася друкаваць рэдакцыя грамадска-палітычнай газеты «Вечерний Брест», спаслаўшыся на парушэнне ў ёй арт. 47 ВК, згодна з якім агітацыйныя перадвыбарчыя матэрыялы і выступленні кандыдатаў не павінны ўтрымліваць зняваг і паклёпу ў адносінах службовых асоб і кандыдатаў у дэпутаты. На думку намесніка галоўнага рэдактара газеты «Вечерний Брест» Б. Паўлоўскага, прыведзеныя радкі з праграмы А. Ляўковіча падпадаюць пад дзеянне арт. 47 ВК, бо зневажаюць іншага кандыдата: «Я пытаюся майго канкурэнта А. Вялічка: чыю волю ён выконваў, галасуючы за адмену сацыяльных ільгот мільёнам беларускіх грамадзян? Ці раіўся ён са сваімі выбаршчыкамі?». Падобны падыход у ацэнцы перадвыбарчай палемікі сур'ёзным чынам абмяжоўвае магчымасці крытыкі дзейсных парламентарыяў з боку як выбаршчыкаў, так і прэтэндэнтаў на дэпутацкія мандаты.

Як адзначаюць назіральнікі, у г. Брэсце перадвыбарчыя плакаты кандыдата ў дэпутаты ад АДС па Брэсцкай-Заходняй выбарчай акрузе № 1 А. Ляўковіча практычна штодзённа заклейваліся налепкамі з надпісам «Байкот». Часта фіксаваліся факты пашкоджання яго плакатаў.

Практычна ўсе перадвыбарчыя плакаты кандыдата па Брэсцкай-Усходняй выбарчай акрузе № 3 Ігара Маслоўскага былі пашкоджаны. І. Маслоўскі падаў заяву ў Маскоўскі ГАУС г. Брэста (копіі – у акруговую

выбарчую камісію і назіральнікам ад АБСЕ) з патрабаваннем прыцягнуць да адказнасці асоб, якія здзейснілі супрацьпраўныя ўчынкі, і прыняць неабходныя меры па папярэджанні падобных дзеянняў, аднак ніякіх вынікаў гэта не прынесла.

У перыяд правядзення агітацыі ў многіх рэгіёнах Беларусі назіральнікі фіксавалі друкаваныя матэрыялы, якія заклікалі да байкоту выбараў. Напрыклад, у паштовых скрынях жыхароў г. Баранавічы з'явіліся ўлёткі Грамадзянскай ініцыятывы «Беларуская салідарнасць у падтрымку пазіцыі Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі БНФ», асноўнымі матывамі якіх былі: «Ніхто на фальшывыя выбары!»; «Ударым па планах рэжыму і маскоўцам будзе няўдзел у выбарах». На тэрыторыі Брэста актыўна распаўсюджваліся газеты «Товарищ». У Баранавічах і ў Баранавіцкім рэгіёне – бюлетэні «Праваабаронца» і »Права выбару» з інфармацыяй аб выбарчай кампаніі.

## Агітацыя шляхам правядзення сустрэч з выбаршчыкамі

Падчас выбарчай кампаніі не многія кандыдаты ад улады выкарыстоўвалі такую форму агітацыі, як правядзенне сустрэч з выбаршчыкамі.

У некаторых рэгіёнах назіральнікі адзначалі крытычна нізкую актыўнасць на сустрэчах з выбаршчыкамі кандыдатаў ад улады.

Пры гэтым, паводле назіральнікаў, у кандыдатаў ад улады не ўзнікала праблем у арганізацыі сустрэч. У Слуцкай выбарчай акрузе № 74, у кандыдата ў дэпутаты Інэсы Кляшчук, першага сакратара Слуцкага гаркама БРСМ, сустрэчы адбываліся, а ў яе канкурэнта – Анатоля Юрэвіча, сябра партыі БСДП (Грамада), узнікалі праблемы. Напрыклад, галоўны ўрач Цэнтральнай раённай бальніцы Уладзімір Наўрась, які з'яўляецца даверанай асобай І. Кляшчук,11.09.2008 арганізаваў у будынку бальніцы дзве сустрэчы з ёй. Ні на адной з сустрэч ён не дазволіў выступіць перад выбаршчыкамі А. Юрэвічу. Аналагічная сітуацыя ўзнікла 18.09.2008 на бацькоўскім сходзе ў САШ № 13 г. Слуцка. Толькі пасля настойлівых патрабаванняў прысутных бацькоў дырэктар школы Міхаіл Сакавец прадаставіў слова А. Юрэвічу. Сустрэча А. Юрэвіча з супрацоўнікамі аддзялення ААТ «Белаграпрамбанк» г. Слуцка не адбылася з-за таго, што Слуцкі раённы выканаўчы камітэт папярэдзіў кіраўніцтва банка пра «адказнасць» за арганізацыю сустрэчы з апазіцыйным кандыдатам.

Ніводная заяўка з шасці пададзеных на прадпрыемствы і ва ўстановы штабам кандыдата ад АГП па Гродзенскай-Паўночнай выбарчай

акрузе № 51 Яраслава Раманчука не была задаволена. Адміністрацыя Камбіната будаўнічых матэрыялаў спаслалася на рамонт актавай залы; дырэкцыя мясакамбіната – на рэжымны характар аб’екту, кіраўніцтва Палаца культуры «Юнацтва» вярнула заяўку з адзнакай на канверце, што адрасата не існуе; дырэкцыя рынка «Карона» матывавала адмову адсутнасцю месца, прыдатнага для сустрэчы; дырэкцыя СШ № 23 матывавала адмову заняткамі па бальных танцах; прадпрыемства «Радыёхваля» адмовіла на падставе таго, што актавая зала знаходзіцца ў аварыйным стане. У той жа час мясцовая ўлада арганізоўвала сустрэчы для праўладнага кандыдата па гэтай акрузе Марыны Рэмшы, напрыклад, у тым жа Камбінаце будаўнічых матэрыялаў, а таксама ў Гродзенскім дзяржаўным аграрным універсітэце.

Сустрэча з кандыдатам у дэпутаты па Бабруйскай-Ленінскай выбарчай акрузе № 78 Аленай Шамаль з працоўным калектывам Першамайскага аддзялення «Белпромстройбанка» адбывалася ў рабочы час,1.09.2008 у 16 гадзін. У гэты ж час другі кандыдат па названай акрузе Уладзімір Сямашка, які даведаўся аб сустрэчы з аб’явы на ўваходных дзвярах банка, не быў дапушчаны на яе ўпраўляючым Антонам Міронавым. У. Сямашка звярнуўся са скаргай па факту парушэння роўных умоў для кандыдатаў у АВК і пракуратуру.

Сустрэча з кандыдатам па Віцебскай-Чыгуначнай выбарчай акрузе № 19, дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Сяргеем Сямашкам адбылася 3.09.2008 на бацькоўскім сходзе гімназіі № 4 г. Віцебска, падчас якога С. Сямашка сядзеў у прэзідыўме. Нягледзячы на прысутнасць у зале кандыдата А. Левінава, слова яму не далі. У прыватнай размове дырэктар гімназіі патлумачыў А. Левінаву, што «яму патэлефанавалі і папрасілі» не даваць слова апаненту С. Сямашкі. Таксама адмоўлена было А. Левінаву ў СШ № 2, ААТ «Витебский приборостроительный завод», у РАУС Чыгуначнага раёна г. Віцебска.

Кандыдат па Рэчыцкай выбарчай акрузе № 44 Леанід Невар, даведаўшыся, што адміністрацыя РУП «Речицкий метизный завод» 17.09.2008 арганізавала сустрэчу супрацоўнікаў прадпрыемства з кандыдатам Алай Ісачанка, начальнікам фінансавага аддзела Рэчыцкага райвыканкама, выказаў намер прыняць удзел у сустрэчы і з’явіўся на тэрыторыю прадпрыемства. Невядомыя асобы ў цывільным адмовіліся яго прапускаць. Дырэктар прадпрыемства Адам Вашкоў прапанаваў Л. Невару падаць заяўку, паабяцаўшы ў трохдзённы тэрмін даць адказ пра час і дату правядзення сустрэчы. Аднак адказ не быў дадзены. Кандыдату Л. Невару было адмоўлена ў сустрэчах у большасці месц, дзе мясцовыя ўлады арганізоўвалі перадвыбарчыя сустрэчы.

Назіральнікі па Мінскай-Каліноўскай выбарчай акрузе № 108 зафіксавалі факт зрыву сустрэчы з выбаршчыкамі кандыдата Віктара Янчурэвіча, якая планавалася ў актавай зале ЖЭУ № 35 і была ўзгоднена папярэдне. Адміністрацыя ЖЭУ № 35 паведаміла, што ў актавай зале пачаўся рамонт.

Кандыдат ад АДС па Брэсцкай-Заходняй выбарчай акрузе № 1 А. Ляўковіч паведаміў, што на працягу ўсяго этапа передвыбарчай агітацыі дзяржаўныя органы, кіраўнікі прадпрыемстваў, устаноў адукацыі ні разу не пасадзейнічалі яму ў арганізацыі сустрэч. Брэсцкі выканкам не задаволіў заяўку А. Ляўковіча на правядзенне перадвыбарчых пікетаў. Падставай гэтаму брэсцкія ўлады назвалі недакладнасць у тэрмінах, якой з’явілася нязначная памылка (замест 2008 было напісана 2007–2009).

Адзінкавыя выпадкі, калі кандыдаты-апаненты разам па сваёй волі сустракаліся з выбаршчыкамі, зафіксаваныя ў Слонімскай выбарчай акрузе № 58. Мечыслаў Касцюк і Іван Шэга разам праводзілі сустрэчу на тэрыторыі ААТ «Слонимская камвольная прядильная фабрика». Як адзначаюць мясцовыя назіральнікі, у адносінах да кандыдата ад - АДС І. Шэгі не рабілася перашкод у правядзенні сустрэч з выбаршчыкамі ні ў гарадскім кінатэатры г. Слоніма, ні на слонімскіх прадпрыемствах харчовай прамысловасці. Газета «Слонимский вестник» (21.09.2008) апублікавала аб’яву аб сустрэчы І. Шэгі з выбаршчыкамі.

Аднак у адрозненне ад мінулых выбарчых кампаній назіральнікі адзначалі станоўчыя факты. Напрыклад, паводле ацэнак ходу агітацыйнай кампаніі, дадзеных кандыдатам ад АДС па Брэсцкай-Усходняй выбарчай акрузе № 3 Ігарам Маслоўскім, падчас сустрэч з выбаршчыкамі ў працоўных калектывах, на бацькоўскіх сходах ён практычна не адчуваў перашкод з боку ўлад. І. Маслоўскі праводзіў перадвыбарчыя пікеты 20–22 верасня з 12.00 да 19.00. Інцыдэнтаў пры гэтым не адбылося. Прадстаўнікі апанента І. Маслоўскага – Г. Анішчук – прысутнічалі ва ўсіх месцах правядзення перадвыбарчых пікетаў і распаўсюджвалі там свае агітацыйныя матэрыялы.

Па інфармацыі назіральнікаў, у Лунінецкай выбарчай акрузе № 13 у пачатку агітацыйнай кампаніі актыўную працу з выбаршчыкамі вяла Ларыса Вершыловіч, дэпутат Палаты прадстаўнікоў. Гарадскія ўлады садзейнічалі яе сустрэчам на многіх прадпрыемствах і ва ўстановах горада. У сярэдзіне агітацыйнага перыяду ўсе тры кандыдаты па Лунінецкай выбарчай акрузе № 13, са слоў назіральнікаў, мелі роўныя магчымасці для сустрэч з выбаршчыкамі ва ўстановах і на прадпрыемствах горада.

Таксама ў Пінскай гарадской выбарчай акрузе № 14 у пачатку агітацыйнага перыяду гарадскія ўлады садзейнічалі арганізацыі сустрэч з выбаршчыкамі кандыдата ад улады Зінаіды Мандроўскай. Яўгенію Перцу, кандыдату ад АДС, члену ПКБ, 3.08.2008 улады г. Пінска двойчы забаранілі сустрэчу з выбаршчыкамі: у актавай зале спорткомплекса ДТСААФ, у магазіне «Світанак». Аднак у сярэдзіне агітацыйнага перыяду ўсе тры кандыдаты па Пінскай гарадской выбарчай акрузе № 14, як паведамляюць назіральнікі, мелі роўныя магчымасці весці перадвыбарчую агітацыю ва ўстановах і на прадпрыемствах горада, а таксама на бацькоўскіх сходах у школах.

## Выкарыстанне адміністрацыйнага рэсурсу

Агітацыя шляхам правядзення сустрэч з выбаршчыкамі ў шэрагу выбарчых акругоў праводзілася з выкарыстаннем адміністрацыйнага рэсурсу.

Паводле мясцовых назіральнікаў, давераныя асобы кандыдата ў дэпутаты па Івацэвіцкай выбарчай акрузе № 11 Леаніда Кавалевіча агітавалі за яго ў свой працоўны час, ездзілі разам на сустрэчы па населеных пунктах Івацэвіцкага раёна. За 16–17 верасня Л. Кавалевіч здолеў правесці сустрэчы з выбаршчыкамі ў пяці населеных пунктах: Агарэвічы, Кукава, Вялікія Круговічы, Будча і Чудзін. Агітацыйная прадукцыя Л. Кавалевіча распаўсюджвалася праз аддзяленні сувязі: паштальёны прыносілі ўлёткі жыхарам разам з газетамі. Аплаты за гэты паслугі на рахунак Ганцавіцкага аддзялення «Белпошты» не паступала.

Кандыдат па Аршанскай-Дняпроўскай выбарчай акрузе № 27, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Адашкевіч ездзіў на перадвыбарчыя сустрэчы па рэгіёну з намеснікам старшыні Аршанскага райвыканкама па сацыяльных пытаннях Уладзімірам Хуцкім, з чыноўнікамі Дубровенскага райвыканкама і Аршанскага гарвыканкама.

У Салігорскай сельскай акрузе № 76 кандыдат Ганна Лаўрукевіч, генеральны дырэктар ДА «Белбыт», выкарыстоўвала для паездак па Капыльскім раёне службовыя аўтамабілі сваіх давераных асоб, у прыватнасці, намесніка старшыні Капыльскага райвыканкама Алы Раманоўскай. Паездкі з мэтай агітацыі ажыццяўляліся кандыдатам разам з даверанымі асобамі ў іх працоўны час.

Падобнае парушэнне зафіксавана і ў Слуцкай выбарчай акрузе № 74. Асобныя супрацоўнікі Слуцкага райвыканкаму вазілі кандыдата ў дэпутаты Інэсу Кляшчук на перадвыбарчыя сустрэчы па раёне на сваіх службовых аўтамабілях. Гэта намеснік старшыні райвыканкама

па пытаннях сацыяльнай сферы і ідэалагічнай працы Пётр Даўгучыц, начальнік аддзела ідэалагічнай работы Ларыса Дабравольская, а таксама старшыня Гацукоўскага сельсавета Надзея Цвірко.

Арганізацыяй сустрэч праўладных кандыдатаў па Бабруйскай-Ленінскай № 78, Бабруйскай-Першамайскай № 79, Бабруйскай сельскай № 80 акругах з працоўным калектывам ААТ «ФанДАК» займалася загадчык аддзела адукацыі Бабруйскага гарвыканкама Людміла Савоціна. Сустрэчы з Аленай Шамаль, Уладзімірам Карпяком, Анатолем Глазам адбываліся ў працоўны час.

У Маладзечненскай гарадской выбарчай акрузе № 70, як фіксуюць назіральнікі, намеснік старшыні райвыканкама Яфім Ідэльчык на штотыднёвых нарадах кіраўнікоў прадпрыемстваў і прадпрымальнікаў праводзіў агітацыю за Мікалая Жгуна.

Кандыдату ад АДС па Гродзенскай сельскай выбарчай акрузе № 52 Віктару Падчыненкаву выбаршчыкі паведамілі, што 16.09.2008 у інтэрнаце ЦЭЦ-2 адбудзецца незаяўленая сустрэча з яго апанентам, першым сакратаром Гродзенскага райкама БРСМ Мікалаем Гарбачонкам. Убачыўшы ў памяшканні інтэрната ЦЭЦ-2 В. Падчыненкава, М. Гарбачонак адмовіўся ад дыялогу і пакінуў месца збору выбаршчыкаў.

У Жодзінскай выбарчай акрузе № 66, на ВА «БелАЗ» 17.09.2008 адбылася вучоба ідэалагічнага актыву. Падчас яе намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай і інфармацыйнай рабоце Станіслаў Якубовіч раздаў удзельнікам па два агітплакаты з праграмай і біяграфіяй Васіля Люцікава, кандыдата ад улады.

У Белавежскай выбарчай акрузе № 8 кандыдатам у дэпутаты Васілём Вавранюком зафіксаваны факты прамога ціску на выбаршчыкаў з мэтай прымусіць іх аддаць галасы за канкурэнта В. Вавранюка па Белавежскай выбарчай акрузе № 8 Мікалая Андрайчука, старшыню суда Камянецкага раёна. Кіраўніцтва бальніцы ў п. Высокае Камянецкага раёна аддавала распараджэнні персаналу галасаваць за М. Андрайчука.

У Слуцкай выбарчай акрузе № 74 намеснік старшыні Слуцкага райвыканкама па пытаннях сацыяльнай сферы і ідэалагічнай рабоце Пётр Даўгучыц і намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы Слуцкага райвыканкама Наталля Шарстнёва, кіраўнікі і ідэалагічныя работнікі Цэнтральнай раённай бальніцы, ААТ «Слуцкий сахарорафинадный комбинат» на працоўных сходах адкрыта заклікалі галасаваць за кандыдата Інэсу Кляшчук, першага сакратара Слуцкага гаркама БРСМ, прыніжаючы пры гэтым яе канкурэнта Анатоля Юрэвіча, члена БСДП(Г).

## Абскарджанне

Святлана Алясюк, кіраўнік ініцыятыўнай групы кандыдата ад АДС Ігара Маслоўскага, падала скаргу ў АВК Брэсцкай-Усходняй выбарчай акругі № 3 па фактах датэрміновай агітацыі за кандыдата Ганну Анішчук у абласной газеце «Народная трибуна» і ў штотыднёвіку «Брестский вестник». На пасяджэнне, падчас якога адбыўся разгляд скаргі, быў дапушчаны назіральнік Н. Коўш, запрошана С. Алясюк. АВК не ўгледзела фактаў датэрміновай агітацыі ў газетных матэрыялах, прысвечаных Г. Анішчук. У задавальненні скаргі было адмоўлена. Старшыня камісіі паведаміла, што любы прэтэндэнт на дэпутацкі мандат можа скарыстацца правам звярнуцца ў любыя газеты і распавесці аб сваёй грамадска-палітычнай дзейнасці. Паводле яе ацэнкі, гэта не будзе лічыцца агітацыяй.

У сувязі з гэтым кандыдат Ігар Маслоўскі накіраваў зварот у газету «Народная трибуна» з прапановай апублікаваць матэрыял аб яго прафесійнай і грамадскай дзейнасці. Копія звароту была даслана заснавальнікам газеты: у Брэсцкі аблвыканкам і Брэсцкі абласны Савет народных дэпутатаў, а таксама ў АВК. Аднак матэрыял не быў надрукаваны.

Незарэгістраваны кандыдат па Баранавіцкай акрузе Аляксандр Галькевіч 05.09.2008 накіраваў скаргу ў Вярхоўны суд РБ. На пасяджэнні Вярхоўнага суда А. Галькевіч паведаміў суддзі, што пры разглядзе скаргі ў ніжэйшых інстанцыях яму не паказалі падпісныя лісты і заявы, якія паслужылі падставай для адмовы яму. Суддзя дазволіў яму азнаёміцца з заявамі падпісантаў, у якіх яны сцвярджаюць, што подпісы ў падпісных лістах за вылучэнне А. Галькевіча ставілі яны, а дату – не яны. А. Галькевіч запомніў прозвішча адной з заяўніц, якой аказалася суседка А. Галькевіча. Пры сустрэчы ў Баранавічах на пытанне, чаму яна адмовілася ад подпісу чысла, жанчына паведаміла, што да яе прыходзілі людзі з выканкама і запалохвалі. За тое, сцвярджалі прыйшоўшыя да суседкі А. Галькевіча, што ў падпісным лісце не яе рукой пастаўлена чысло, жанчыне пагражае суд і турэмнае зняволенне. Пад падобнымі пагрозамі пажылая жанчына падпісала тое, што ёй прапаноўвалі.

# V. ГАЛАСАВАННЕ

## Датэрміновае галасаванне

Парадак рэалізацыі датэрміновага галасавання ў краіне неаднаразова выклікаў крытыку як з боку нацыянальных назіральнікаў, так і міжнародных інстытутаў, якія ажыццяўляюць назіранне за выбарамі. Таксама неаднаразова адзначалася, што органы ўлады, кіраўнікі працоўных калектываў, навучальных установаў масава выкарыстоўвалі залежнасць выбаршчыкаў па месцы вучобы ці працы для прымусу іх прагаласаваць датэрмінова. Можна сцвярджаць, што прымус да ўдзелу ў датэрміновым галасаванні скіраваны на маніпуляцыю вынікамі галасавання. Па-першае, датэрміновае галасаванне дае магчымасць «забяспечыць» неабходную яўку выбаршчыкаў для прызнання таго, што выбары адбыліся. Па-другое, канструкцыя скрыняў, практыка іх заклейвання (запячатвання), якія не з'яўляюцца празрыстымі для назіральнікаў, даюць магчымасць замены бюлетэняў, што можа забяспечваць перамогу таму кандыдату, які падтрымліваецца ўладай.

Улічваючы тое, што ва УВК практычна няма прадстаўнікоў дэмакратычных палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў, маніпуляцыя вынікамі галасавання робіцца яшчэ больш верагоднай.

Мясцовай прэсай своечасова былі апублікаваныя паведамленні АВК аб пачатку датэрміновага галасавання. Шырока распаўсюджваліся заклікі галасаваць, пры гэтым падкрэслівалася, што ніякіх пацвярджэнняў немагчымасці галасаваць у дзень выбараў прадастаўляць не трэба. Як паказала назіранне за ходам датэрміновага галасавання, у выбарчых камісіях ніхто не пытаўся ў грамадзян, па якой прычыне яны галасуюць датэрмінова.

Назіральнікамі былі зафіксаваныя шматлікія факты прымусу да ўдзелу ў датэрміновым галасаванні. Асноўнымі катэгорыямі выбаршчыкаў, якія прымушаліся да датэрміновага галасавання, з'яўляліся: студэнты і навучэнцы (асабліва тыя, якія пражываюць у інтэрнатах), жыхары працоўных інтэрнатаў, працаўнікі бюджэтнай сферы (настаўнікі, выкладчыкі прафесійных, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых установаў адукацыі), а таксама вайскоўцы, служачыя МУС, МНС.

У Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Францыска Скарыны 24.09.2008 падчас нарады з намеснікамі дэканаў па выхаваўчай рабоце прарэктар па выхаваўчай і ідэалагічнай рабоце Сяргей Ханеня даў указанне, каб усе студэнты, якія пражываюць у інтэрнатах, прагаласавалі

датэрмінова. Са студэнтамі, якія адмовяцца галасаваць з палітычных перакананняў, ён загадаў праводзіць тлумачальную працу. Таксама было ўказанне да 17-00 28.09.2008 падаць звесткі аб колькасці студэнтаў, якія прагаласавалі датэрмінова, для прадстаўленння рэктару.

Падобная сітуацыя назіралася ва ўсіх ВНУ краіны. Практычна ўсюды заняткі ў суботу, 27.09.2008, здымаліся, каб студэнты галасавлі датэрмінова.

Студэнты інтэрната № 2 Гомельскага ўніверсітэта па вул. Кірава,122 сцвярджаюць, што загадчыца інтэрната ў выпадку адмовы галасаваць датэрмінова пагражала пазбавіць права пражывання ў інтэрнаце. Намеснік дэкана матэматычнага факультэта па выхаваўчай працы Галіна Карасёва запісвала прозвішчы тых студэнтаў, якія адмаўляліся галасаваць датэрмінова, і патрабавала патлумачыць прычыны. Аналагічныя пагрозы гучалі на адрас студэнтаў Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова, што жывуць у інтэрнаце № 3. Зафіксаваныя факты, калі на старастаў акадэмічных груп ускладаліся абавязкі складаць спісы ўсіх студэнтаў, якія ўзялі ўдзел у датэрміновым галасаванні.

На выбарчым участку № 30, што знаходзіўся ў Гродзенскім абласным інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі, 25.09.2008 студэнты стаялі чэргамі. Іх вывелі галасаваць датэрмінова па вусным распараджэнні адміністрацыі.

Акрамя адміністрацыйнага ціску ў шэрагу навучальных установаў арганізоўваліся пікеты. Несанкцыянаваны пікет членаў БРСМ Гродзенскага педагагічнага каледжа адбыўся 26 верасня, падчас яго актывісты БРСМ агітавалі студэнтаў прыйсці на выбарчы ўчастак для ўдзелу ў датэрміновым галасаванні.

Вікторыя Гаўрыленка, камендант працоўнага інтэрната па вул. Шміта ў г. Магілёве,26.09.2008 патрабавала ад жыхароў інтэрната галасаваць тэрмінова, адразу ж пасля змены, не заходзячы ў пакоі.

Значная частка кантынгенту вайскоўцаў-ракетчыкаў 26.09.2008 была дастаўлена для датэрміновага галасавання з в. Паўлінава Баранавіцкага раёна, дзе знаходзіцца гарнізон, у г. Баранавічы.

Да калектываў школ г. Баранавічы даводзілалася патрабаванне загадчыка гарадскога аддзела народнай адукацыі Мікалая Хітрыка прагаласаваць датэрмінова. Аб эфектыўнасці намаганняў чыноўнікаў сведчыць тое, што за 3 дні датэрміновага галасавання ў СШ № 16 г. Баранавічы прагаласавала 65 % калектыва. Паводле назіральнікаў, за гэты ж час на выбарчым участку № 16 (будынак завочнага аддзялення

Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта) Баранавіцкай-Заходняй выбарчай акругі № 5 прагаласавала 80 % выбаршчыкаў.

Дырэктар ААТ «Беларускабель» у г. Мазыр Генадзь Іваноў, які з'яўляўся адначасова і старшынёй УВК Мазырскай выбарчай акругі № 42, неаднаразова папярэджваў начальнікаў цахоў і аддзелаў аб асабістай адказнасці за няўдзел іх падначаленых у датэрміновым галасаванні. У мэтах кантролю быў складзены спіс тэлефонаў работнікаў прадпрыемства, па якім начальнікі аддзелаў абавязваліся нагадваць падначаленым пра іх абавязак прагаласаваць датэрмінова.

Намеснік начальніка завадскога ўпраўлення па аўтаматызацыі РУП «Беларускі металургічны завод» у г. Жлобіне Аляксей Красюк 22.09.2008 па завадской электроннай сетцы даслаў кіраўнікам участкаў спецыяльны ліст. Яго атрымалі начальнікі ўчасткаў: Міхаіл Буянаў, Аляксандр Гузаў, Сяргей Ільін і іншыя, усяго – 16 чалавек. Акрамя загаду прымусіць падначаленых галасаваць датэрмінова, у лісце «даводзілася да ведама» работнікаў, за каго трэба галасаваць. Меўся на ўвазе Уладзімір Батан, начальнік цэха рамонту металургічнага абсталявання завода. Захадамі па арганізацыі датэрміновага галасавання былі ахоплены нават супрацоўніцы, якія знаходзяцца ў адпачынках па ўходу за дзіцем. Ім таксама настойліва прапаноўвалася прагаласаваць датэрмінова.

Начальнік ДРБУ-208 г. Шчучына Уладзімір Карповіч прымушаў працаўнікоў калектыва прагаласаваць датэрмінова за кандыдата па Шчучынскай выбарчай акрузе № 60 Марыю Бірукову, намесніка старшыні Гродзенскага аблвыканкама.

Дырэктар ААТ «Агракамбінат «Усход» у Магілёўскім раёне Віктар Пінчук пагражаў работнікам звальненнем, калі яны не прагаласуюць датэрмінова за дэпутата па Магілёўскай сельскай выбарчай акрузе № 88, старшыню Магілёўскага райвыканкама Аляксандра Разганава.

Падчас датэрміновага галасавання былі выяўлены шматлікія факты парушэння ВК.

У Гомельскай-Савецкай выбарчай акрузе № 34 УВК выбарчага ўчастка № 13 адмовіла Леаніду Удавічэнку ў рэгістрацыі ў якасці назіральніка. Таксама было адмоўлена ў рэгістрацыі ў якасці назіральніка Васілю Пакаташкіну на ўчастку № 4 ў Гомельскай-Цэнтральнай выбарчай акрузе № 33. У абодвух выпадках назіральнікі вылучаліся

па патрыйных пратаколах ад Партыі БНФ. Падставай для адмовы ім указвалася адсутнасць пячаткі на дакументах аб вылучэнні, якая і не магла быць пастаўлена таму, што структура партыі, што вылучала назіральнікаў, не з'яўляецца юрыдычнай асобай. Трэба адзначыць,

што па такіх жа пратаколах на ўчастках № 4 і № 8 Гомельскай-Прамысловай выбарчай акругі № 35 былі зарэгістраваныя назіральнікі Яўген Сувораў і Анатоль Паплаўны.

У Брэсцкай-Заходняй выбарчай акрузе № 1 на ўчастках № 6, 9, 11, 13, 14, 27, 30, 42 не былі аформлены стэнды з інфармацыйнымі матэрыяламі пра кандыдатаў, што з'яўляецца парушэннем арт. 45 ВК. Кандыдат у дэпутаты па названай акрузе А. Ляўковіч накіраваў заявы назіральнікам АБСЕ, СНД, у ЦК.

На выбарчым участку № 32 Брэсцкай-Заходняй выбарчай акругі № 1 (СШ № 16) былі выяўлены грубыя парушэнні працэдуры правядзення галасавання: урна не была апячатана належным чынам, што дазваляла несанкцыянаваны доступ да яе змесціва. Памяшканне, дзе яна захоўвалася, мела свабодны доступ. Аналагічная сітуацыя была зафіксавана на выбарчым участку № 15 Баранавіцкай-Заходняй выбарчай акругі № 5. На просьбу назіральніка да члена камісіі Іванюшкінай апячатаць бакі скрыні і дно, тая катэгарычна адмовілася.

Не прадастаўлялі інфармацыю назіральніку па Слонімскай выбарчай акрузе № 58 Міхаілу Варанцу ў АВК Слонімскай выбарчай акругі № 58. Неаднаразова звяртаючыся за інфармацыяй аб выбарах, назіральнік выявіў, што камісія практычна не функцыянуе: дзяжурства не ажыццяўляецца, графіка і журналу ўліку няма. Калі прыходзіць назіральнік, кандыдат у дэпутаты ці яго давераныя асобы, то супрацоўнікі Слонімскага выканкама А. Мачаліна і С. Гурская пакідаюць на час працоўныя месцы і ідуць у памяшканне акруговай камісіі. Назіральнік М. Варанец звярнуўся ў ЦК са скаргай на акруговую камісію ў сувязі з нездавальняючай працай яе членаў. У адказе Л. Ярмошынай ад 15.09.2008 указвалася на тое, што графік дзяжурстваў камісіі з'яўляецца рабочым дакументам камісіі і не павінен прадастаўляцца па патрабаванні назіральнікаў. «Звяртаем Вашу ўвагу, – гаворыцца ў лісце, – што правы назіральніка пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў устаноўлены часткай чацвёртай арт. 13 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь. У адпаведнасці з ёю ў Вас няма права патрабаваць рабочыя дакументы акруговай выбарчай камісіі». Заява М. Варанца накіравана назад, у камісію Слонімскай выбарчай акругі № 58.

У некаторых акругах назіральнікі адзначалі станоўчыя моманты ў параўнанні з мінулымі выбарамі. На працягу ўсяго перыяду агітацыі і датэрміновага галасавання акруговыя камісіі Лунінецкай № 13, Пінскай гарадской № 14, Пінскай сельскай № 15 выбарчых акруг прадастаўлялі назіральнікам інфармацыю, якая іх цікавіла. 11.09.2008 АВК

Баранавіцкай сельскай выбарчай акругі № 7 разгледзела на сваім пасяджэнні пытанне недакладнасці ў дэкларацыі аб маёмасці Алега Пашко, кандыдата ад «Еўрапейскай кааліцыі». Ставілася пытанне аб зняцці кандыдатуры А. Пашко з выбараў. У выніку галасавання кандыдатура А. Пашко знята не была.

У Белавежскай выбарчай акрузе № 8, як адзначаюць назіральнікі, на выбарчых участках уся дакументацыя да выбараў была падрыхтавана належным чынам. На просьбу назіральніцы ад БСДП М. Бялеста да старшыні ўчастковай камісіі № 52 падпісаць усе бюлетэні старшыня камісіі адрэагавала станоўча. Бюлетэні былі падпісаныя.

На ўчастках № 13, 19 Брэсцкай-Заходняй выбарчай акругі № 1 назіральнікам БХК былі прадастаўлены звесткі аб колькасці атрыманых бюлетэняў і аб колькасці выбаршчыкаў, якія прагаласавалі датэрмінова. На ўчастках № 5, 32 адмовіліся даць інфармацыю аб колькасці атрыманых бюлетэняў і аб колькасці выбаршчыкаў, якія прагаласавалі датэрмінова.

У Брэсцкай-Усходняй выбарчай акрузе № 3 назіральнікі БХК правялі маніторынг 13 выбарчых участкаў: № 1, 2, 7, 9, 10, 11, 12, 13, 26, 28, 29, 30, 31. На 4 (31%) выбарчых участках (№ 11, 29, 9, 10) камісіі не далі неабходнай інфармацыі, у астатніх участковых камісіях (69 %) прадаставілі прыблізную інфармацыю ці далі вычарпальныя звесткі. На ўчастках № 19, 51, 52 Белавежскай выбарчай акругі № 8 назіральнікі БХК таксама змаглі атрымаць інфармацыю аб датэрміновым галасаванні.

Назіральнікі адзначаюць, што выніковыя суадносіны галасоў выбаршчыкаў пры датэрміновым і асноўным галасаваннях адрозніваюцца. Відавочна, значную ролю адыгрываў фактар адсутнасці кантролю за падлікам галасоў падчас датэрміновага галасавання.

У Старавіленскай выбарчай акрузе № 105, на выбарчым участку № 449 па выніках датэрміновага галасавання за кандыдата Мікалая Самасейку, старшыню суда Цэнтральнага раёна г. Мінска, прагаласавалі 675 выбаршчыкаў, што складае 68,4% ад усіх, хто ўдзельнічаў у датэрміновым галасаванні. За Анатоля Лябедзьку, старшыню АГП, – 84 выбаршчыкі, што складае 8,5 % адпаведна. У дзень галасавання, калі вялося ўзмоцненае назіранне, і падлік галасоў адбываўся адразу па заканчэнні галасавання, за гэтых жа кандыдатаў аддалі свае галасы адпаведна 180 (44 %) і 124 (30,3 %) выбаршчыкі. Такім чынам, у параўнанні з датэрміновым галасаваннем колькасць галасоў за кандыдата А. Лябедзьку ў дзень галасавання павялічылася ў 3,6 разы.

## Галасаванне і падлік

Факты адмовы ў прадстаўленні інфармацыі аб ходзе галасавання, шматлікія маніпуляцыі з бюлетэнямі былі адзначаны многімі назіральнікамі, якія ажыццяўлялі маніторынг выбараў у дзень галасавання.

У Мастоўскай выбарчай акрузе № 56, на выбарчым участку ў вёсцы Занкі Свіслацкага раёну, бюлетэні выбаршчыкам выдавалі без подпісаў. Толькі пасля таго, як выбаршчык галасаваў, яго забіралі назад, завяралі і аддавалі выбаршчыку для ўкідання ў урну. Пры гэтым цалкам парушалася таемнасць галасавання.

У Магілёўскай-Цэнтральнай выбарчай акрузе № 85 на выбарчым участку № 68, які знаходзіцца ў будынку Магілёўскага дзяржаўнага машынабудаўнічага прафесійна-тэхнічнага каледжа, пасля 10-хвіліннага падліку бюлетэні былі вынесены ў суседні пакой, дзе старшыня камісіі занёс выніковыя лічбы ў пратакол. У 20.10 вывесілі копію выніковага пратакола галасавання, падпісаную старшынёй камісіі Валерыем Клепчуковым і сакратаром Людмілай Самусёвай. Паводле пратаколу, прагаласавала 679 з 991 выбаршчыка на ўчастку. За Аляксандра Юшкевіча, дэпутата Палаты прадстаўнікоў, – 521 голас, за Аляксандра Сілкова – 25, Аляксея Паўлоўскага – 47, Юрыя Лекніна – 31, супраць усіх – 55. Паводле назіральнікаў БХК, на дадзеным участку вынікі галасавання не адпавядалі рэчаіснасці. Па-першае, назіралася вельмі нізкая актыўнасць: па іх падліках, у перыяд з 14 да 20 гадзін прагаласавалі ўсяго 33 выбаршчыкі. Па выхадзе з участка тыя, хто прагаласаваў, сведчылі, што ў лістах было вельмі мала подпісаў. Па-другое, за 10-хвілінны прамежак часу нерэальна пералічыць 679 бюлетэняў.

Назіральнікі адзначаюць, што выніковыя прапорцыі галасоў выбаршчыкаў па асобных кандыдатах значна адрозніваюцца на розных выбарчых участках: істотную ролю адыграў фактар кантролю за падлікам галасоў.

У Дзятлаўскай выбарчай акрузе № 55 на Таркачоўскім выбарчым участку (дзе назіральнікі кантралявалі ход падліку) за кандыдата ад - АДС Яніну Гузоўскую прагаласавалі, па афіцыйнай інфармацыі, 307 чалавек, за праўладнага кандыдата, дэпутата Палаты прадстаўнікоў Міхаіла Орду – 402. На Вайневіцкім выбарчым участку (дзе назіральнікі не кантралявалі ход падліку) афіцыйныя звесткі такія: за Я. Гузоўскую – 17 чалавек, за М. Орду – 390.

У Гродзенскай-Цэнтральнай выбарчай акрузе № 50 на выбарчым участку № 42 (дзе назіральнікі кантралявалі ход падліку) вынікі галасавання наступныя: за Сяргея Маскевіча, дэпутата Палаты прадстаўнікоў,

прагаласаваў 521 чалавек; за Сяргея Антусевіча, старшыню пярвічнай арганізацыі Беларускага Незалежнага прафсаюза гарнякоў, хімікаў, энергетыкаў, нафтаперапрацоўшчыкаў, транспартнікаў, будаўнікоў і іншых работнікаў, сябра БНФ, – 336 чалавек; за Аляксандра Мікалуту, члена ЛДПБ, – 310, супраць усіх – 440. Адпаведныя лічбы на ўчастках, дзе не было назірання, наступныя: участак № 5 – 822, 144, 104, 148; участак № 6 – 756, 214, 146, 156; участак № 39 – 797, 148, 144, 99; участак № 40 – 492, 243, 101, 85; участак № 41 – 672, 190, 172, 115. На закрытым выбарчым участку № 23 УЗ «Гродзенскі абласны клінічны перынатальны цэнтр» за Сяргея Маскевіча прагаласавалі 154 чалавекі са 154 – роўна 100 % выбаршчыкаў.

У сельскіх акругах члены камісій масава выязджалі з выбарчых участкаў на месцы для галасавання на даму. Ажыццявіць назіранне ў такім выпадку было практычна немагчыма. Падобная сітуацыя назіралася ў Баранавіцкай сельскай выбарчай акрузе № 7, Івацэвіцкай выбарчай акрузе № 11 ды інш.

Паводле слоў назіральнікаў, пры пачатку падліку галасоў многія назіральнікі выдаляліся з участка, практычна нідзе не ажыццяўляўся асобны падлік галасоў.

У Пінскай гарадской выбарчай акрузе № 14, на выбарчым участку № 34, які размяшчаўся ў памяшканні каледжа УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна», у пачатку падліку галасоў назіральнікі былі выдаленыя з участка. Гэта адбылося ў прысутнасці намесніка старшыні Пінскага гарвыканкама Міхаіла Самалазова. На выбарчым участку № 27 гэтай жа акругі ў пачатку падліку галасоў бюлетэні з усіх урнаў былі высыпаны разам. Пасля таго, як назіральнік Аляксандр Васільеў указаў на гэта як на факт парушэння ВК і пачаў фатаграфаваць, яго і астатніх назіральнікаў выдалілі. Абышоўшы будынак з другога боку, назіральнік А. Васільеў змог убачыць праз вакно, як члены камісіі раскрывалі запячатаныя пачкі з бюлетэнямі. Аднак у хуткім часе назіральнік вымушаны быў пакінуць сваё месца за вакном, асцерагаючыся затрымання міліцыяй. У будынак выканкама, дзе знаходзілася АВК, для напісання скаргі назіральніка А. Васільева не пусцілі. У АВК Пінскай гарадской выбарчай акругі № 14 назіральнікам ад АБСЕ, назіральніку ад БХК Аляксандру Бучыку не далі магчымасці назіраць за падлікам галасоў выбаршчыкаў на падставе штатаколаў участковых камісій.

Таксама масава не дазвалялі назіральнікам прысутнічаць пры перадачы ў АВК пратаколаў з вынікамі галасавання на ўчастках. АВК Магілёўскай-Кастрычніцкай выбарчай акругі № 86 адмовіла назіральнікам

Барысу Бухелю і Уладзіміру Парфёнаву ў гэтым праве, бо, са слоў сакратара АВК № 86 Надзеі Мыджынай, перадача пратаколаў з'яўляецца «тэхнічнай работай камісіі», а не яе пасяджэннем. Аналагічныя адмовы атрымалі назіральнікі Аляксандар Каралёў і Дзмітрый Салаўёў у АВК Магілёўскай-Цэнтральнай выбарчай акругі № 85, назіральнік Эдуард Брокараў у АВК Горацкай выбарчай акругі № 81 ды інш.

Датэрміновае галасаванне характарызуецца масавым прымусам да ўдзелу ў такім галасаванні з выкарыстаннем залежнасці па месцы працы ці вучобы.

Адзначана непразрыстаць працы акруговых і ўчастковых выбарчых камісій пры правядзенні датэрміновага галасавання. Кіраўніцтва камісій адмаўлялася даваць назіральнікам інфармацыю аб колькасці выбаршчыкаў, зарэгістраваных на ўчастках для галасавання, колькасці атрыманых выбарчых бюлетэняў, колькасці выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у датэрміновым галасаванні. Кіраўніцтва АВК адмаўлялася паведамляць колькасць выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у датэрміновым галасаванні на тэрыторыі акругі.

Назіральнікам не далі магчымасці назіраць за правільнасцю падліку галасоў выбаршчыкаў. Акрамя спін членаў выбарчых камісій, якія знаходзіліся ля стала з бюлетэнямі для галасавання, назіральнікі нічога не бачылі. Там, дзе назіральнікі мелі магчымасць сачыць за падлікам галасоў, розніца паміж праўладнымі і незалежнымі і апазіцыйнымі кандыдатамі невялікая. Гэта сведчыць аб закрытасці працэдуры падліку галасоў, што магло быць выкарыстана ўчастковымі камісіямі ў мэтах фальсіфікацыі вынікаў галасавання.

# ВЫСНОВЫ

Выбары дэпутатаў Палаты Прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 4-га склікання, як і мінулыя выбарчыя кампаніі, адбыліся з сур'ёзнымі парушэннямі стандартаў свабодных і справядлівых выбараў, прынятых АБСЕ і беларускім заканадаўствам.

Выбарчае заканадаўства Рэспублікі Беларусь не ставарае неабходных прававых умоў для правядзення свабодных і справядлівых выбараў, практыка яго прымянення прыводзіць да сур'ёзных парушэнняў стандартаў АБСЕ.

Фарміраванне выбарчых камісій, як і ў мінулай кампаніі, адбылося без неабходнай празрыстасці і без зразумелай рэгламентацыі крытэрыяў і парадку адбору кандыдатур у іх склад. Гэта дазволіла органам мясцовай улады чарговы раз зманіпуліраваць працэдурай іх стварэння. У выніку ў значнай ступені камісіі былі сфарміраваныя з прадстаўнікоў выканаўчай улады і арганізацый, ім падпарадкаваных. Захавалася тэндэнцыя фарміравання ўчастковых камісій па вытворчым прынцыпе – з прадстаўнікоў аднаго працоўнага калектыву пры фармальна розных шляхах вылучэння ў склад участковых камісій. Пры гэтым, як правіла, старшынёй камісіі абіраўся чалавек, ад якога астатнія члены камісіі знаходзіліся ў працоўнай залежнасці.

Практычна ўсе пасяджэнні райвыканкамаў і раённых адміністрацый насілі фармальны характар, падчас гэтых пасяджэнняў не было рэальнага абмеркавання кандыдатур, вылучаных ва ўчастковыя камісіі. На пасяджэннях праходзіла фармальнае зацвярджэнне загадзя сфарміраваных складаў участковых выбарчых камісій.

Пэўнае павелічэнне колькасці прадстаўнікоў апазіцыйных партый у выбарчых камісіях з'яўляецца станоўчым момантам. Аднак павелічэнне колькасці прадстаўнікоў апазіцыйных партый у выбарчых камісіях не прывяло да стварэння рэальна незалежных камісій.

Рэгістрацыя ініцыятыўных груп і кандыдатаў у дэпутаты ў параўнанні з мінулымі кампаніямі выявіла істотныя паляпшэнні – знізілася колькасць кандыдатаў, якім было адмоўлена ў рэгістрацыі, у тым ліку сярод прадстаўнікоў апазіцыі. Істотна палепшылася на практыцы працэдура збору подпісаў. Удзельнікамі маніторынгу практычна не фіксаваліся перашкоды, затрыманні пры зборы подпісаў, адзначана змяншэнне ціску на сяброў ініцыятыўных груп апазіцыйных прэтэндэнтаў. Аднак, як і раней, назіраліся многія факты выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу пры зборы подпісаў за кандыдатаў, падтрыманых уладай, прымус

да падпісвання, збор подпісаў не сябрамі ініцыятыўных груп прэтэндэнтаў, абмежаванне доступу апазіцыйных ініцыятўных груп у працоўныя і студэнцкія інтэрнаты, на тэрыторыю вайсковых частак.

Таксама па-ранейшаму непразрыстай заставалася працэдура праверкі матэрыялаў аб вылучэнні кандыдатаў, што дазваляла камісіям мець неаднолькавы падыход да асобных кандыдатаў.

Умовы правядзення перадвыбарчай агітацыі па-ранейшаму не былі спрыяльнымі для правядзення сур'ёзнай агітацыйнай кампаніі, што неабходна для ўсвядомленага выбару кожнага гармадзяніна. Вызначаныя ўмовы публікацый праграм кандыдатаў і выступленняў на радыё і тэлебачанні, памер дзяржаўнага фінансавання на агітацыю, рэгуляванне сустрэч з выбаршчыкамі нормамі заканадаўства аб масавых акцыях не дазвалялі партыям і кандыдатам праводзіць паўнавартасную агітацыю.

Адпаведна закону кандыдаты атрымалі магчымасць выступіць са сваімі праграмамі на асобных тэле- і радыёканалах, надрукаваць свае выступленні ў вызначаным памеры ў дзяржаўных газетах. Па ацэнках медыяэкспертаў БАЖ, трансляцыі тэлевыступленняў кандыдатаў адбываліся ў нязручны для шырокай глядацкай аўдыторыі час. Станоўчым момантам з'яўляецца тое, што пазней у сувязі з крытычнымі ацэнкамі назіральнікаў па рашэнні ЦК тэлевыступленні кандыдатаў трансліраваліся паўторна. Аднак гэта істотна не палепшыла сітуацыю.

Некаторыя апазіцыйныя кандыдаты былі пастаўлены ў няроўныя ўмовы пры размяшчэнні агітацыйных матэрыялаў. Агітацыя праз друкаваныя агітацыйныя матэрыялы ў шэрагу выбарчых акругаў праводзілася з выкарыстаннем адміністрацыйнага рэсурса. Праўладныя кандыдаты на практыцы мелі перавагу развешваць свае перадвыбарчыя плакаты ў шматлюдных публічных месцах – крамах, дзяржаўных установах, на прадпрыемствах.

Паводле ацэнкі назіральнікаў, у большасці рэгіёнаў рашэнні пра выдзяленне месцаў для размяшчэння агітацыйных матэрыялаў, як правіла, не забяспечвалі кандыдатам дастатковых магчымасцей для агітацыі. Вылучалася толькі адно месца на ўчастак, гэтага было яўна недастаткова. Для выкарыстання плошчаў крамаў, прадпрыемстваў і ўстаноў патрабавалася ўзгадненне з іх кіраўнікамі, што таксама ўскладняла перадвыбарчую агітацыю. Вызначэнне памяшканняў для сустрэч кандыдатаў з выбаршчыкамі ў многіх выпадках не стварыла кандыдатам неабходных умоў для разгортвання шырокай кампаніі такіх сустрэч.

Дзяржаўныя СМІ фактычна праводзілі схаваную агітацыю, актыўна інфармуючы выбаршчыкаў аб дзейнасці асобных праўладных кандыдатаў.

Менш, чым у папярэдніх кампаніях, падчас выбарчай кампаніі 2008 г. выкарыстоўвалася цэнзураванне агітацыйных матэрыялаў кандыдатаў. Аднак падобныя факты таксама зафіксаваныя.

Даная кампанія адметна тым, што яе ўдзельнікі часта распаўсюджвалі агітацыйныя матэрыялы без выхадных звестак, што можа сведчыць аб выкарыстанні дадатковых фінансавых сродкаў, акрамя афіцыйна выдзеленых. Выбарчыя камісіі практычна не стваралі перашкод для распаўсюджвання агітацыйных матэрыялаў без выхадных звестак. Гэта прывяло да пэўнага пашырэння агітацыйных магчымасцей, што можна ацаніць станоўча. Але гэта робіць відавочным неабходнасць змены заканадаўчых умоў рэгулявання агітацыі і выкарыстання фінансаў у выбарчым працэсе.

Галасаванне і падлік галасоў па-ранейшаму далі падставы для сур'ёзнай крытыкі.

Масавы характар атрымаў прымус да ўдзелу ў датэрміновым галасаванні. Як і ў папярэдніх выбарчых кампаніях, асноўнымі катэгорыямі выбаршчыкаў, якія прымушаліся да галасавання, сталі студэнты (асабліва тыя, якія пражываюць у студэнцкіх інтэрнатах), жыхары працоўных інтэрнатаў, працаўнікі бюджэтнай сферы (настаўнікі, выкладчыкі прафесійных, сярэдне-спецыяльных і вышэйшых устаноў адукацыі), а таксама вайскоўцы, міліцыя, МНС ды інш. Назіральнікамі зафіксаваныя факты арганізаванага галасавання і ў некаторых пасёлках, дзе людзей на аўтобусах прывозілі на выбарчыя ўчасткі для ўдзелу ў датэрміновым галасаванні.

Улічваючы тое, што захаванасць скрыняў, практыка іх заклейвання (запячатвання) не з'яўляецца празрыстай для назіральнікаў, удзельнікі выбарчага працэсу мяркуюць, што напрыканцы датэрміновага галасавання адбывалася замена бюлетэняў, што цалкам магло забяспечыць перамогу таму кандыдату, які падтрымліваўся органамі ўлады. Гэтае меркаванне таксама падмацоўваецца тым, што ва УВК практычна не было прадстаўнікоў дэмакратычных палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў.

Прынятае ЦК рашэнне аб неабходнасці заклейваць пасля кожнага дня галасавання ў скрынях для галасавання шчыліну для апускання бюлетэняў было станоўчым, але не магло вырашыць праблем, звязаных з працэдурамі правядзення датэрміновага галасавання.

Падчас галасавання назіралася абмежаванне правоў назіральнікаў на атрыманне інфармацыі. Інфармацыя аб колькасці выбаршчыкаў,

атрыманых бюлетэняў УВК, колькасці тых, хто прагаласаваў датэрмінова, без тлумачэнняў не паведамлялася назіральнікам. Названыя факты сведчаць, што на дадзеным этапе цалкам парушаны прынцып празрыстасці выбарчага працэсу.

Таксама цалкам закрыта для нацыянальных назіральнікаў прайшла працэдура падліку галасоў. Практычна ўсе назіральнікі-праваабаронцы змаглі толькі прысутнічаць на выбарчых участках. Рэальны падлік галасоў назіраць не дазволілі камісіі, якія карысталіся дапамогай міліцыянераў. Па сведчаннях назіральнікаў, на многіх камісіях рэальнага падліку галасоў і не адбывалася – члены камісіі раскладвалі бюлетэні па стосах за асобных кандыдыдатаў, іх падлік вёўся старшынёй і сакратаром камісіі ў асобным пакоі і доўжыўся літаральна некалькі хвілін. Нярэдка пасля такога падліку аказвалася, што візульна аднолькавыя стосы бюлетэняў давалі лічбы, якія адрозніваліся ў разы. У назіральнікаў складвалася ўражанне, што большасць членаў камісій падпісвалі выніковыя пратаколы не ведаючы рэальных вынікаў галасавання.

Непразрыстасць выбарчых працэдур прывяла да таго, што назіральнікі, кандыдаты, чые правы парушаліся, былі пазбаўленыя рэальнай магчымасці абскарджвання парушэнняў. Па-ранейшаму парушэнні многіх выбарчых працэдур немагчыма было абскардзіць у судовым парадку. Фармальны разгляд скаргаў выбарчымі камісіямі, у тым ліку ЦК, зрабіў падачу скаргаў настолькі неэфектыўнай, што многія кандыдаты ўвогуле адмаўляліся іх падаваць, нягледзячы на шматлікія парушэнні іх правоў.

Па выніках выбараў кандыдатамі было пададзена ў ЦК 35 скаргаў, у тым ліку аб прызнанні вынікаў выбараў несапраўднымі. Усім заяўнікам было адмоўлена, пры гэтым ЦК увогуле не ўстанавіла сур’ёзных парушэнняў выбарчага заканадаўства.

Праваабаронцы прыйшлі да высновы, што, хаця падчас палітычнай кампаніі 2008 г. адбыліся пэўныя станоўчыя змены, выбары дэпутатаў Палаты Прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 4-га склікання не адпавядалі стандартам свабодных і справядлівых выбараў, што не стварае неабходных умоў для даверу да іх вынікаў, агучаных ЦК.

# РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА ДЭМАКРАТЫЗАЦЫІ ВЫБАРЧАГА ПРАЦЭСУ Ў БЕЛАРУСІ

Неабходны змены ВК такога характару, каб кожны з удзельнікаў выбарчага працэсу меў права рэалізаваць канстытуцыйны прынцып судовай абароны ў выпадках, калі ўдзельнік лічыць, што яго правы парушаны.

## Выбарчыя камісіі (ВК)

1. ВК і Закон аб ЦК павінны быць зменены такім чынам, каб забяспечыць шматпартыйнае плюралістычнае прадстаўніцтва ў выбарчых камісіях усіх узроўняў.
2. Органы выканаўчай улады павінны быць адлучаны ад арганізацыі правядзення выбараў.
3. Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне выбараў павінна ажыццяўляцца за кошт бюджэтных сродкаў, прызначаных для іх правядзення і размеркаваных адпаведнымі ВК.

## Назіральнікі

1. ВК павінны быць зменены такім чынам, каб яны гарантавалі празрыстасць усіх выбарчых працэдур і забеспячэнне правоў назіральнікаў, у тым ліку права назіраць за працэсам галасавання і падліку галасоў з адлегласці, якая дазваляе рэальна бачыць ход гэтай працэдуры.
2. ВК павінны быць зменены такім чынам, каб яны былі абавязаныя выдаваць копіі выніковых пратаколаў падліку галасоў на ўсіх узроўнях.

## Рэгістрацыя кандыдатаў

1. Прадастаўляемыя кандыдатамі дэкларацыі аб прыбытках і маёмасці не павінны выкарыстоўвацца ў якасці падставы для адмовы ў рэгістрацыі. Неабходна змяніць ВК такім чынам, каб для рэгістрацыі кандыдатамі прадастаўляліся даведкі, выдадзеныя кампетэнтнымі огранамі.
2. Працэдуры праверкі матэрыялаў, пададзеных кандыдатамі для рэгістрацыі, павінны быць адкрытымі для кандыдатаў і назіральнікаў.

## Агітацыя

1. Неабходна адмяніць неабгрунтаваныя абмежаванні свабоды сходаў, аб'яднанняў, выказвання думак, для чаго трэба ўнесці адпаведныя змены ў ВК і іншыя заканадаўчыя акты. Неабходна выключыць ці істотна абмежаваць заканадаўчыя нормы пра паклёп і дыфамацыю, у прыватнасці тыя, што датычацца афіцыйных асоб.
2. Неабходна ўвесці ў ВК палажэнне аб выбарчых фондах кандыдатаў, а таксама празрыстую і падсправаздачную сістэму іх напаўнення за кошт бюджэтных сродкаў і іншых дазволеных крыніц.
3. Неабходна ўвесці ў ВК нормы аб роўным доступе кандыдатаў і палітычных партый да ўсіх трансляцый, якія адлюстроўваюць выбарчую кампанію, уключаючы навіны і іншыя інфармацыйныя праграмы.
4. Абмежаванні і санкцыі, прадугледжаныя ВК, павінны прымяняцца для рэгулявання выкарыстання дзяржаўных СМІ афіцыйнымі асобамі ў агітацыйных мэтах.

## Спіс выбаршчыкаў

1. Неабходна ўвесці змены ў ВК, каб забяспечыць састаўленне абнаўляемага цэнтралізаванага спіса выбаршчыкаў.
2. Спісы выбаршчыкаў павінны быць даступныя назіральнікам.

## Галасаванне і падлік галасоў

1. Неабходна змяніць працэдуры датэрміновага галасавання ў ВК:
   - абмежаваць магчымасць датэрміновага галасавання толькі выпадкамі галасавання па папярэдняй заяўцы ў сувязі з немагчымасцю прыбыць на выбарчы ўчастак у дзень выбараў;
   - колькасць выбаршчыкаў, якія прагаласавалі датэрмінова, павінна ўносіцца ў пратакол штодзённа, вынікі датэрміновага галасавання, таксама як і галасаванне па месцы знаходжання выбаршчыка, павінны фіксавацца асобна ў выніковых пратаколах кожнага выбарчага ўчастка.


Уважаемые коллеги!!!
Сегодня (25 сентября) необходимо срочно всем проголосовать.
По избирательным участкам затребовали списки не проголосовавших учителей.
25 сентября (четверг) в 10.40 состоится производственное совещание с классными руководителями 5-х – 11-х классов

Рэспубліка Беларусь
ГРОДЗЕНСКІ АБЛАСНЫ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ
**Упраўленне справамі**
230023, г.Гродна, вул. Ажэшкі, 3,
тэл. 77-29-69, факс 72-02-32
groblisp@mail.grodno.by
groblisp@mailgov.by

Республика Беларусь
ГРОДНЕНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
**Управление делами**
230023, г.Гродно, ул. Ожешко, 3,
тел. 77-29-69, факс 72-02-32
groblisp@mail.grodno.by
groblisp@mailgov.by

02.09.08 № М-1706
на № ________ ад ________

Мелешко А.В.
ул. Горновых, д.6, кв.29,
г.Гродно

На ваше обращение, поступившее в Гродненский облисполком, по вопросам ознакомления с протоколами совместного заседания президиума Гродненского областного Совета депутатов и Гродненского облисполкома от 14 июля 2008г., а также с протоколами собраний (конференций) трудовых коллективов, политических партий, других общественных объединений граждан по выдвижению своих представителей в составы окружных избирательных комиссий сообщаем следующее.

Статьей 34 Конституции Республики Беларусь установлено, что пользование информацией может быть ограничено законодательством в целях защиты чести, достоинства, личной и семейной жизни граждан и полного осуществления ими своих прав. Также согласно Регламенту Гродненского облисполкома, утвержденному решением Гродненского облисполкома от 10 апреля 2007г. №243, предоставление для ознакомления управленческих документов, в том числе протоколов заседания Гродненского облисполкома, организациям и физическим лицам не предусмотрено. В связи с этим, оснований для предоставления Вам для ознакомления протокола совместного заседания президиума Гродненского областного Совета депутатов и Гродненского облисполкома не имеется.

Для ознакомления с протоколами по выдвижению представителей в составы комиссий Вы можете обратиться непосредственно в трудовые коллективы, политические партии и другие общественные объединения, осуществившие выдвижение своих представителей в окружные избирательные комиссии.

Управляющий делами — Н.Е.Присада

Новик 723112

Гродзенскі гарадскі выканаўчы камітэт

**АДМІНІСТРАЦЫЯ ЛЕНІНСКАГА РАЁНА г. ГРОДНА**

вул. Савецкая, 10, 230023, г. Гродна
тэл./факс (80152) 72 26 20
Рэквізіты: р/р 3604000000385 ф-л 426
АСБ “Беларусбанк” код 199 ОКПО 05570570, УНН 500213959

Гродненский городской исполнительный комитет

**АДМИНИСТРАЦИЯ ЛЕНИНСКОГО РАЙОНА г. ГРОДНО**

ул. Советская, 10, 230023, г. Гродно
тел./факс (80152) 72 26 20
Реквизиты: р/с 3604000000385 ф-л 426
АСБ “Беларусбанк” код 199 ОКПО 05570570, УНН 500213959

02.09.2008 № М-452

На №_________ ад_________

Мелешко А.В.
ул. Горновых, 6-29
г. Гродно

Уважаемый Андрей Александрович!

По поводу Вашего обращения сообщаем следующее. При исполнении своих функций по выборам администрация Ленинского района г. Гродно (далее – администрация района) строго соблюдает Конституцию Республики Беларусь, выполняет требования Избирательного кодекса Республики Беларусь и иных актов законодательства о выборах. Подготовка и проведение выборов осуществляется открыто и гласно. Население в установленные сроки информируется о принятых решениях через средства массовой информации.

Так, решение администрации района от 12 августа 2008г. №229 «Об образовании на территории Ленинского района г. Гродно участковых избирательных комиссий по выборам депутатов Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь четвертого созыва, утверждении их количественного и списочного состава» опубликовано в газете «Гродненская правда» за 14 августа 2008г.

В протоколах по выдвижению в составы участковых избирательных комиссий содержаться личные данные о выдвигаемых представителях участковых комиссий, поэтому согласно ст.34 Конституции Республики Беларусь администрация района, как государственный орган, не имеет права предоставить Вам для ознакомления материалы, затрагивающие права и законные интересы других граждан.

На основании вышеизложенного сообщаем, что представление Вам для ознакомления документов и материалов по выдвижению представителей в состав участковых избирательных комиссий не является правомерным.

Данный ответ Вы вправе обжаловать в Гродненский городской исполнительный комитет и (или) в суд.

Управляющий делами
администрации — О.Г. Белинский

77 17 04

Анацко Л.Е.

15.08.2008 №4

г.Лида42, а/я -62

На Ваше обращение от 12 августа 2008 года по вопросу предоставления журнала регистрации наблюдателей окружная избирательная комиссия Лидского избирательного округа №54 по выборам депутатов Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь сообщает следующее.

Статьей 13 Избирательного кодекса Республики Беларусь установлен исчерпывающий перечень прав наблюдателя, среди которых отсутствует такое право наблюдателя, как ознакомление с документами избирательной комиссии.

Поскольку заявленное Вами требование не входит в перечень прав, которые может совершать наблюдатель, то такое требование, следует рассматривать как вмешательство в работу комиссии.

Совокупность вышеизложенных обстоятельств позволяет говорить о правомерности действий секретаря окружной избирательной комиссии Юч И.И.

В связи с чем, Ваши доводы приведенные в жалобе не нашли правового подтверждения, поэтому жалоба не подлежит удовлетворению.

Председатель комиссии А.П. Быковский

34007
и.и. 15.08.2008 Анацко

Цэнтральная камісія
Рэспублікі Беларусь па выбарах
і правядзенню рэспубліканскіх
рэферэндумаў

Центральная комиссия
Республики Беларусь по выборам
и проведению республиканских
референдумов

ПАСТАНОВА
14.11.2008 № 136
г.Мінск

ПОСТАНОВЛЕНИЕ
г.Минск

О жалобе Масловского И.В. о признании выборов по Брестскому-Восточному избирательному округу № 3 недействительными

Рассмотрев жалобу Масловского Игоря Владимировича и материалы, поступившие из окружной избирательной комиссии Брестского-Восточного избирательного округа № 3, Центральная комиссия Республики Беларусь по выборам и проведению республиканских референдумов (далее – Центральная комиссия) отмечает следующее.

В жалобе заявитель просит признать выборы по Брестскому-Восточному избирательному округу № 3 недействительными.

Аналогичная жалоба Масловского И.В. 6.10.2008 г. рассматривалась на заседании окружной избирательной комиссии Брестского-Восточного избирательного округа № 3. В удовлетворении жалобы было отказано.

В соответствии с частью второй статьи 84 Избирательного кодекса Республики Беларусь Центральная комиссия может признать выборы недействительными, если в ходе выборов, или при подсчете голосов, или при определении результатов выборов имели место нарушения требований Избирательного кодекса, повлиявшие на итоги выборов или не позволяющие с достоверностью определить результаты волеизъявления избирателей.

В жалобе, поданной в Центральную комиссию, Масловский И.В. указывает на недостатки при проведении голосования и подсчета голосов на отдельных участках для голосования в день выборов, которые, по его мнению, дают основание для признания выборов по Брестскому-Восточному избирательному округу № 3 недействительными. В подтверждение своих доводов заявитель представил в Центральную комиссию 25 актов наблюдателей, осуществлявших наблюдение на 20 участках для голосования. В жалобе, направленной в окружную избирательную комиссию, Масловский И.В. также указывал на

2

ненадлежащее, на его взгляд, формирование участковых избирательных комиссий, поскольку в их составы были включены представители одной организации.

Изучение информации, содержащейся в жалобах Масловского И.В., и проверка сведений, указанных в актах наблюдателей, позволяют сделать вывод об отсутствии в них фактов о нарушениях избирательного законодательства, которые могли бы повлиять на итоги выборов по Брестскому-Восточному избирательному округу № 3.

В большинстве актов наблюдателей отмечается, что им не предоставлялась информация о количестве избирателей на участках для голосования и количестве граждан, принявших участие в досрочном голосовании, а также о количестве полученных бюллетеней. Вместе с тем информирование наблюдателей по названным вопросам является правом, но не обязанностью участковых избирательных комиссий, так как в статье 13 Избирательного кодекса, определяющей правовой статус наблюдателей, предоставление такой информации не предусмотрено.

В некоторых актах сообщается, что наблюдатели при подсчете голосов не имели возможности обозревать содержание заполненных бюллетеней и не получали информацию о результатах раздельного подсчета голосов по каждому ящику для голосования. Приведенная информация не свидетельствует о нарушении избирательного законодательства, поскольку в Избирательном кодексе не содержится предписаний по перечисленным вопросам.

При проверке жалобы не подтвердилась указанная в актах наблюдателей информация о том, что на участках для голосования № 3 и № 38 не вывешивались для всеобщего обозрения копии протоколов о результатах голосования, а также информация о том, что на участке для голосования № 20 неиспользованные бюллетени были погашены после подсчета голосов.

В акте наблюдателя Костенкова В.И. отмечается, что на участке для голосования № 25 в список избирателей не были включены граждане Левчук А.В., Левчук Н.А., Жирнов В.Е., Жирнова Н.В., Караткевич Ю.В. При проверке этих сведений выяснилось, что Левчук А.В. в список избирателей внесен, но участия в голосовании не принимал. Фамилии остальных граждан в списке отсутствуют и в участковую комиссию по вопросу голосования они не обращались. При таких обстоятельствах говорить о нарушении избирательных прав граждан не приходится.

Не установлено нарушений избирательного законодательства при образовании участковых избирательных комиссий на территории Брестского-Восточного избирательного округа № 3. Включение в состав комиссии работников одной организации не противоречит требованиям

3

избирательного законодательства, поскольку выдвижение представителей в состав комиссии проведено различными субъектами.

Таким образом, Центральной комиссией при рассмотрении жалобы Масловского И.В. не установлено нарушений требований Избирательного кодекса, которые могли бы послужить основанием для признания выборов по Брестскому-Восточному избирательному округу № 3 недействительными.

На основании изложенного и руководствуясь статьями 33 и 84 Избирательного кодекса Республики Беларусь, Центральная комиссия ПОСТАНОВЛЯЕТ:

Отказать Масловскому И.В. в удовлетворении жалобы о признании выборов по Брестскому-Восточному избирательному округу № 3 недействительными.

Председатель комиссии Л.М.Ермошина

Секретарь комиссии Н.И.Лозовик

Центральную комиссию Республики Беларусь
по выборам и проведению республиканских референдумов
Масловского Игоря Владимировича
Брест, ул. 17 Сентября, 22-24, офис БСДП

Жалоба
на ответ окружной избирательной комиссии
Брестского-Восточного избирательного округа №3

29 сентября 2008 г в соответствии с требованиями ИК РБ мной как кандидатом в депутаты по Брестскому-Восточному избирательному округу № 3 была подано заявление в окружную избирательную комиссию с требованием признать выборы недействительными в связи с тотальными и грубыми нарушениями Избирательного кодекса. К заявлению были приложены 25 составленных актов о нарушениях Избирательного кодекса. Копия заявления и актов были направлены в Центральную комиссию по электронной почте.

Ответ от окружной избирательной комиссии на свое заявление я получил 22 октября 2008г. Это стало возможным только благодаря тому, что мое экс-доверенное лицо Олесюк С.В. лично забрала копию ответа у экс-секретаря окружной избирательной комиссии Акимовой И.А. В телефонном разговоре со мной председатель окружной избирательной комиссии Янголенко Г.А. сообщила, что направила мне ответ письменно 06.10.2008 простым письмом, а на заказное письмо с уведомлением у нее нет денег. В связи с этим прошу сообщить выделялись ли деньги окружным избирательным комиссиям на эти цели и в частности окружной избирательной комиссии Брестского-Восточного избирательного округа № 3. Оригинала ответа я не получил до настоящего времени.

В ответе председателя окружной избирательной комиссии Брестского-Восточного избирательного округа № 3 Янголенко Г.А. **не указывается когда и на каком заседании было рассмотрено мое заявление о признании выборов недействительными**. Указывается лишь, что решением окружной избирательной комиссией от 29.09.2008 выборы депутатов ПП НС РБ по Брестскому-Восточному избирательному окургу № 3 признаны состоявшимися и действительными. Данное заседание действительно было в первой половине дня. Мое заявление было мной лично доставлено в комиссию во второй половине дня 29.10.2008 и зарегистрировано в журнале входящей документации. Соответственно никаких заседаний комиссии больше не проводилось. В ответе комиссии также не указывается конкретные факты проверки (когда и кем) актов о нарушениях избирательного законодательства и материалов изложенных в жалобе, что является нарушением не только ИК РБ, но и Закона РБ «Об обращениях граждан», Директивы №2 Президента РБ.

Обращаю Ваше внимание, что окружная избирательная комиссия фактически проигнорировала все пункты указанные в заявлении и по существу вопроса дала формальный ответ. Для примера, в моем заявлении указывалось, что «**итоговые протоколы не вывешены для всеобщего обозрения на участках...**», в ответе «**...были составлены протоколы о результатах выборов...наблюдатели имели возможность ознакомиться с данными результатами**». Далее «**на участках для голосования присутствовали посторонние лица**», «**на ряде участков для голосования наблюдатели визуально видели примерно одинаковые стопки бюллетеней (за Онишук и за Масловского) после подсчета голосов. Однако в итоговом протоколе разница голосов поданных за Онищук и Масловского составляла 2-6 раз в пользу Онищук**», однако в ответе окружной комиссии «**работа комиссий проводилась согласно Избирательному кодексу**».

Но главный пункт жалобы так и остался без ответа, комиссия даже не обмолвилась не одной фразой был ли проверен хотя бы один из 25 составленных актов о нарушениях

избирательного законодательства. Приводим для убедительности этот пункт полностью *3.1. «На абсолютном большинстве участков наблюдатели не имели возможности наблюдать непосредственно процесс подсчёта голосов, таким образом, им было отказано в праве получать информацию о результатах подсчёта голосов в нарушение Статей 13 и 55 ИК РБ.* ***Результаты подсчета голосов по каждому ящику комиссией не были оглашены, открыто и гласно. Наблюдатели по решению председателя комиссии находились на расстоянии 2-8 метров, что исключает процедуру наблюдения. Данные о результатах подсчета голосов не оглашались, открыто и гласно. Члены комиссии на бумажках писали результаты подсчета и передали их председателю комиссии, затем в тайне от наблюдателей и членов комиссий был составлен итоговый протокол. Описанные нарушения зафиксированы наблюдателями на избирательных участках №№ 3, 38, 30, 34, 12, 16, 13, 23, 20, 21, 14, 36 и др. (копии актов прилагаются – 25 шт.).***».

В связи с вышеизложенным прошу рассмотреть заявление в окружную избирательную комиссию и данную жалобу по существу, провести проверку приведенных в заявлении и жалобе фактах и признать выборы по Брестскому-Восточному избирательному округу № 3 недействительными. Принять необходимые меры по недопустимости подобных нарушений в будущем. Это позволит признать мировым сообществом выборы, как легитимные, а белорусский парламент и в целом Республика Беларусь получат возможность стать членом ряда европейских и международных организаций. Считаю, что такие действия принесут благо белорусскому народу.

В заключении прошу сообщить имя 111 депутата Палаты Представителей Национального собрания Республики Беларусь и проинформировать окружную избирательную комиссию о правильном названии вышестоящей комиссии, т.е. Центральной комиссии.

Приложение:
1. Копия заявления – 1 шт.
2. Копия ответа – 1 шт.
3. Копия Актов о нарушениях – 25 шт.

24.10.2008

/И.В. Масловский/